№ 1 (407) 7 студзеня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

### Што новага ў заканадаўстве

з 1 студзеня.

старонка 5

### Цунамі

Якія высновы?

старонка 4

### Спроба жыць па праўдзе

Артыкул Вацлава Гаўла.

старонка 13

### Габрыэль Гарсія Маркес

Успамін пра маіх сумных бл.дзей.

старонка 18

### ЗАТ «РБ»

Дзяржава дзейнічае не як супрацоўнік плянавага аддзелу, а як буйны бізнэсовец. Мы і нашы грошы. **Старонка 2.**

### Хто аўтар Акту 25 Сакавіка?

Навіны зь мінуўшчыны ў артыкуле Анатоля Сідарэвіча. **Старонка 16.**

### Андрэй Хадановіч

«Сто лі100ў на tut.by». Падборка новых вершаў — **старонка 19.**

### Анёл і чорт

Калядная батлейка для ўстановаў і грамадзянаў ад Сьцяпана Дзінь-Дзілевіча. **Старонка 13.**

### Палітычны перац

Нават калі ён выпадкова прадэманструе фігу — аналітыкі будуць сьцьвярджаць, што гэта было геапалітычнае пасланьне. Лёлік Ушкін у рубрыцы «Левым вокам». **Старонка 24.**

### Шахіды перад тэлевізарам

Спорт. **Старонка 21.**

### Дык падпісвайся!

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Чытай сваё!

# Год Караткевіча



**Каляндар «Нашай Нівы» — старонка12.**

# Суд на Каляды

Міхаілу Марынічу далі пяць год калёніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасьці. Рэпартаж Алеся Кудрыцкага.

У гэтай гісторыі фігуруюць ператрусы, спэцслужбы, кампутары, вядомы палітык ды нават чорны пісталет рэдкай мадэлі з сэрыйным нумарам, вытраўленым хімікатамі. Але крымінальнага дэтэктыву тут не напішаш — хутчэй, раман абсурду. Бо няма галоўнага элементу для крымінальнага сюжэту — злачынцы. Прынамсі, таго чалавека, якога ў кайданках завялі ў залю суду, крымінальнікам назваць язык не павернецца.

Заля суду Менскага раёну і гораду Заслаўя, што месьціцца ў двухпавярховым будынку на Лагойскім тракце, — вельмі маленькая. Яна ледзь здолела зьмясьціць больш за 30 прысутных, якія прыйшлі на пасяджэньне суду 29 сьнежня. Уздоўж правай сьцяны — шэрагі нязручных лаваў, падобных да школьных партаў, запоўненыя роднымі ды журналістамі, наперадзе — сталы, за якімі твар у твар сядзяць адвакаты ды пракурор, яшчэ далей на ўзвышэньні — стол з трыма пакуль што пустымі крэсламі для судзьдзі ды народных засядальнікаў. Леваруч — доўгая вузкая клетка.

Міхаіл Марыніч уваходзіць у залю. Ён усьміхаецца. Бліскаюць фотаўспышкі.

«Хто дазволіў здымку?» — кідае судзьдзя Людміла Даўжэнка. Фотакарэспандэнты пакідаюць залю і пачынаюцца судовыя спрэчкі.

### «Паважаны ў мінулым...»

Першым бярэ слова пракурор Аляксандар Нікулін. «На лаве падсудных — адзін з паважаных у мінулым дзеячаў...»

Працяг на старонцы 3.

КАМЭНТАРЫ

### Як справа Марыніча паўплывае на беларускую палітыку?

**Віктар Карняенка**, старшыня Фонду лякальнага разьвіцьця, Гомель:

Палітыкі, якія ўжо засьведчылі пра свой патэнцыял для ўдзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах, — людзі сьмелыя, і справа Марыніча іх наўрад ці запалохае, хоць выбары будуць адрозьніваца ад папярэдніх большай жорсткасьцю з боку А.Лукашэнкі.

**Аляксандар Мілінкевіч**, старшыня незарэгістраванай арганізацыі «Беларуская асацыяцыя рэсурсавых цэнтраў», Горадня:

Сярод намэнклятуры больш апазыцыйна настроеных людзей, чым сярод настаўнікаў ды дактароў. Задача працэсу над Марынічам — запалохаць намэнклятуру. Што да незалежных палітыкаў, дык наадварот, такія справы могуць мець мабілізацыйны эфэкт у пэўных колах людзей, якія ўмеюць думаць.

### Каго шукалі ў Белнэце

Самыя папулярныя ў пошукавай сыстэме «Tut.by», паведаміў для «НН» дырэктар парталу Кірыла Валошын, — палітыкі і дзеячы шоў-бізнэсу. Сярод палітыкаў найбольш запытаў беларусы рабілі на імёны Юшчанка, Лукашэнка, Латыпаў і Клімаў. Сярод музыкаў найбольш папулярныя Руслан Алехна, Натальля Падольская, Ларыса Грыбалёва і Ала Пугачова. Сярод спартоўцаў па-за канкурэнцыяй Юлія Несьцярэнка і Макс Мірны. У тузін самых папулярных асоб пошуку ў Белнэце трапіў і Васіль Быкаў.

Запыты ў катэгорыі «астатняе» досыць традыцыйныя: рэфэраты, працоўныя вакансіі, мабільнікі, надвор'е, гараскопы, сэкс і порна.

### Вінаградная замест Курапацкай

Вуліцы Курапацкай у Менску ня будзе, будзе Вінаградная. Такое рашэньне было прынята 23 сьнежня гарвыканкамам падчас перайменаваньня 30 вуліц і завулкаў былых вёсак, якія ўключаны ў межы горада.

Назва Курапацкая зьявілася ў ліпені, калі да сталіцы былі далучаны тэрыторыі навакольных вёсак і паўстала праблема з дубляванымі Ляснымі, Палявымі, Рабочымі. А Курапацкая акурат упіраецца ва ўрочышча.

Аднак жыхары Курапацкай з новай назвай не пагадзіліся. «На той вуліцы дамоў дваццаць. Палова жыхароў падпісаліся пад лістом, дзе прасілі зьмяніць назву. Яны разумеюць, што Курапаты — гэта ўсіхны боль, але не хацелі б жыць на вуліцы, назва якой пастаянна будзе нагадваць пра гэта», — кажа тапаніміст Іван Сацукевіч.

Ня будзе ў Менску і Дубаўлянскай (раней — Зарэчная) ды Вясковай (раней — Лясная) вуліц. Жыхарам Вясковай крыўдна называцца «вяскоўцамі». Жыхары ж Дубаўлянскай не матывавалі сваёй адмовы: ня хочам, і ўсё. Іхная вуліца цяпер будзе звацца «Сасновы Бор».

**Аркадзь Шанскі**

Камэнтар на тэму — **старонка 5**.

## Навагоднія віншаваньні ад Івонкі Сурвіллы



Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла зьвярнулася да беларусаў з традыцыйнымі каляднымі і навагоднімі віншаваньнямі. У палітычнай іх частцы яна спыняецца на падзеях Аранжавай рэвалюцыі ва Ўкраіне ды кажа: «Добразычлівы сьвет гатовы дапамагчы Беларусі стацца вольнай дэмакратычнай беларускай дзяржавай, за існаваньне якой Рада Беларускай Народнай Рэспублікі змагаецца і будзе змагацца, пакуль не дасягне гэтае мэты. Хачу сёньня прасіць Вас далучыцца да гэтага змаганьня. Героям, якія ўжо далучыліся, зычу трываласьці і сілаў. Усім іншым зычу перамагчы страх, які яшчэ трымае наш народ у няволі».

**МБ**

### Дзе купіць «Arche»

**Найтаньней у Менску — усяго за тры тысячы рублёў — часопіс «Arche» можна набыць у краме УП «Марат» па адрасе вул. Інтэрнацыянальная, 11а.**

### Дзеяслоў. 2004. №12 (5)




У «Дзеяслове» №12 прыцягваюць увагу запісы Янкі Брыля; вершы паэтаў трох пакаленьняў: Генадзя Бураўкіна, Андрэя Хадановіча і Цемрыка Велета; працяг дасьледаваньня амэрыканскага гісторыка Цімаці Снайдэра «Спрэчкі за беларуска-літоўскую спадчыну», сканчэньне раману Алеся Пашкевіча пра Ўладзімера Дубоўку «Круг».

# ЗАТ «РБ»

Дзяржава дзейнічае не як супрацоўнік плянавага аддзелу, а як буйны бізнэсовец. Беларусь ператвараецца ў закрытае акцыянэрнае таварыства, дзе галоўная доля належыць аднаму акцыянэру, а грамадзяне застаюцца шараговымі супрацоўнікамі.

Гаспадарчы год-2004 прайшоў пад знакам дзяржавы. Сёлета не было аніводнай значнай падзеі ў эканоміцы, у якой дзяржава не адыгрывала б вядучай ролі.

Год пачаўся са скандалу. 1 студзеня «Газпром» спыніў пастаўкі газу для беларускіх спажыўцоў (хоць і працягваў транзыт на Захад). У ноч на 24 студзеня вэнтылі перакрылі незалежныя пастаўшчыкі «Ітэра» ды «Транснафта». У лютым «Газпром» спыніў нават транзыт, цалкам пазбавіўшы Беларусь блакітнага паліва. «Гэта акт тэрарызму!» — абурыўся Аляксандар Лукашэнка.

Урэшце, «Ітэра» ўзялася пакрыць патрэбы Беларусі ў газе. Але «газпромаўскі» кантракт падпісалі толькі ў чэрвені: пагадзіліся на цане на газ у 46,68 даляра за 1000 м³ ды транзытнай стаўцы, роўнай 0,75 даляра за 1000 «кубоў» на 100 км. «Белтрансгаз», галоўны аб'ект спрэчкі, так і застаўся ў беларускай уласнасьці.

Год скончыўся так сама, як і пачынаўся — газавымі перамовамі. Урэшце, «Газпром» змусіў Беларусь падпісаць кантракт на пастаўку газу ў Беларусь па старой цане 46,68 даляра за 1 тыс. кубамэтраў. Слова «змусіў» выкарыстаў віцэпрэм'ер ураду Андрэй Кабякоў. Рэч у тым, што цана намінальна не зьмянілася, але, па сутнасьці, падвысілася праз пераход Беларусі ды Расеі на спагнаньне ўскосных падаткаў паводле прынцыпу краіны прызначэньня. Цяпер «газавы» ПДВ (18%) будзе спаганяць не Расея, а Беларусь са свайго ж «Белтрансгазу», з-за чаго цана на газ для нашых спажыўцоў можа пайсьці ўгару.

Навучаная «газаватам», Беларусь увесь год закупляла ў Расеі мазуту. Назапасілі столькі, што нават часова адмовіліся ад імпарту электраэнергіі, а выраб уласнай падвысілі на 21%. Узнавілі імпарт электрычнасьці толькі 1 кастрычніка. Калі ў 2003 г. мы імпартавалі 7 млрд кВт/гадз, дык у 2004 г. — толькі 4.

Пытаньні энэргетычнае бясьпекі і паслабленьня залежнасьці да паставак энэрганосьбітаў з Расеі перайшлі з парадку году 2004-га на 2005-ты.

### Прадпрымальнікі — сіла

У лютым абвесьцілі галадоўку 30 прадпрымальнікаў віцебскіх рынкаў. Іх гандлёвыя кропкі загадалі перавесьці ў разрад крамаў, з патрэбай весьці адпаведную дакумэнтацыю, мець сэртыфікаты, набываць касавыя апараты. Неўзабаве цэлымі рынкамі падняліся на страйк прадпрымальнікі з Воршы, Гомелю, Горадні, Магілёву, Мар'інай Горкі, Менску, Пінску, Салігорску. Лукашэнка занепакоіўся ды загадаў «разабрацца». У Віцебск тэрмінова выехала дэлегацыя сталічных чыноўнікаў. Пасьля пэўных саступак і паслабленьняў галадоўка была спыненая. Але канфлікт канчаткова ня вычарпаны й дагэтуль.

Прыватныя прадпрымальнікі давялі, што яны — палітычная сіла. Нездарма напрыканцы году Лукашэнка загаварыў пра тое, што ім трэба аблегчыць жыцьцё — напрыклад, увесьці працэдуру рэгістрацыі «ў адно акенца».

### Будоўлі году

Студзень 2004 г. — пачатак лыжнага сэзону. У сталічным мікрараёне Курасоўшчына адчыняецца пабудаваны на грошы расейскае «Юколы» комплекс «Альпійскі сьнег», а пад Лагойскам — сапраўдны гарнальыжны курорт, выпешчаны пад крылцам прэзыдэнцкага фаварыту — фірмы «Трайпл».

Расчыняе дзьверы гандлёвы комплекс «Люстэрка» на сталічнай Камароўцы, па ўсім горадзе распачынаецца будоўля гіпэрмаркетаў. Будоўля стагодзьдзя — Нацыянальная бібліятэка — вядзецца стаханаўскімі тэмпамі. А вось з узьвядзеньнем у Менску 400-мэтровай тэлевежы вырашылі пачакаць да 2007 г. Затое зьявілася новая ідэя: у красавіку Лукашэнка агучыў плян адбудовы славутага гатэлю «Эўропа» на плошчы Свабоды ў Менску. Пляцоўка ўжо расчышчаная.

Цікава, што сьпярша пабудаваць першы ў краіне 5-зоркавы гатэль мелася Галіна Жураўкова, былая кіраўніца справаў прэзыдэнта. Спачатку яна меркавала паставіць яго на праспэкце Машэрава, а потым пачала прыглядацца да гатэлю «Кастрычніцкі», што ля самай рэзыдэнцыі прэзыдэнта.

### Справа Жураўковай

Але гатэляў Жураўковай ужо не будаваць — загад пра адстаўку прэзыдэнцкага «заўгасу» быў падпісаны 10 лютага. У гэты ж дзень Жураўкову зьмяшчаюць разам з сынам і мужам у сьледчы ізалятар КДБ. Абвінавачаньне: крадзеж маёмасьці шляхам злоўжываньня службовым становішчам у асабліва буйным памеры.

Гадавы абарот Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта складаў каля 1 млрд даляраў. Фірма «Белая Русь», галоўная структура КСП, працавала ў трох галоўных сфэрах: гандаль цукрам, цыгарэтамі ды нафтай. Паводле сьледзтва, карыстаючыся выгаднымі квотамі ды ільготамі, людзі Жураўковай рабілі ўласныя гешэфты, ня рупячыся пра папаўненьне дзяржбюджэту.

Але працэс Жураўковай стаўся сёлета не апошняй гучнай справай: перад вылетам Аляксандра Лукашэнкі ў сярэдзіне сьнежня ў Казахстан прайшла «зачыстка» ў кіраўніцтве ААТ «Нафтан» — шэраг кіраўнікоў арыштаваныя за крадзеж. Існуе вэрсія, што «Нафтан» ачышчаюць ад прарасейскіх лабістаў, каб даць дарогу для казаскіх акцыянэраў.

### Зброя

Сёлета завяршылася фармаваньне вайскова-прамысловага комплексу Беларусі. Пад гэтай назвай хаваецца структура, якая аб'ядноўвае вядучых вытворцаў і распрацоўшчыкаў зброі. Адным з найбольш вядомых яе складнікаў зьяўляецца напаўсакрэтнае прадпрыемства «Агат».

Гэты год быў адзначаны й скандалам з абвінавачаньнямі Беларусі ў нелегальных пастаўках зброі. Акурат на Хелоўін у ЗША зьявілася справаздача, у якой сьцьвярджаецца, што рэжым Хусэйна ды афіцыйны Менск некалькі год вялі патаемнае супрацоўніцтва ў абарончай сфэры — беларускія прадпрыемствы сакрэтна прадавалі

**Працяг на старонцы 6.**



IN MEMORIAM

## Валянцін Ермаловіч

Перад Калядамі, 22 сьнежня, ня стала Валянціна Ермаловіча. Пайшоў па-старэчаму, без асаблівага клопату для радзіны. «Сэрца», — толькі і сказаў перад сьмерцю.

Ён прыйшоў на сьвет 17 сакавіка 1925 году, у сям'і, што зьведала сталінскія рэпрэсіі, — бацька быў асуджаны на 10 гадоў «бяз права перапіскі». Прайшоў вайну, неаднойчы быў паранены і... «загінуў» на Беласточчыне паблізу хутару Чары. Па сканчэньні Беларускага тэатральна-мастацкага інстытуту чатыры гады адпрацаваў у Пінскім драматычным тэатры. Потым пераbrowsers ўся ў Магілёў, дзе 29 гадоў настаўнічаў у культпрасьветвучэльні.

Тэатральная спадчына Валянціна Ермаловіча — дзясяткі роляў і пастаўленых спэктакляў, пяць створаных самадзейных тэатраў, чатыры зь якіх сталі народнымі. У 1988 годзе Валянцін Ермаловіч стаў першым старшынём магілёўскай суполкі «Мартыралёгу Беларусі».

За сухімі біяграфічнымі зьвесткамі — жыцьцё творчае, самаадданае, прагнае. Валянцін Ермаловіч не стаяў перад выбарам, чаго рабіць, а чаго не. Ён рабіў, рабіў па-беларуску — рупліва ды старанна. Сярод паказушнасьці сёньняшняе магілёўскае рэчаіснасьці ягоны тэатар «Валянцін» быў ці не адзіным асяродкам, дзе жыла насамрэч беларушчына. Энэргетычная моц Ермаловічавых тэатральных пастановак прыцягвала сваёй жыцьцёвай сапраўднасьцю. Валянцін Ермаловіч на зайздрасьць знаходзіў крыніцы беларушчыны. Нядзіва, што адным з улюбёных месцаў для Яго былі Бялынічы зь іх ліпавым паркам, закладзеным уладальнікам мястэчка Ігнатам Агінскім, і вуліцамі Лява Сапегі ды Канстанціна Астроскага, названыя гэтак на пачатку дзевяностых праз руплівасьць мясцовай інтэлігенцыі.

Як і брат, знакаміты гісторык Мікола, Валянцін жыў без фанабэрыі. Абодва браты сьцьвердзілі беларускую філязофію жыцьця: усё сканчаецца, каб наноў пачацца.

Валянцін Ермаловіч сышоў на Каляды з нацыянальным сьцягам у труне — сымбалем жыцьця і сьмерці, любымі для беларуса колерамі — белым і чырвоным.

**Алесь Асіпцоў**

# Суд на Каляды

Працяг са старонкі 1.

Словы «ў мінулым» адразу электрызуюць залю, і яна з гатоўнасьцю раздраджаецца рогатам, калі абвінаваўца кажа пра тое, што дзяржава ня мела падстаў падкідаць Марынічу пісталет, бо «ён вельмі дарагі». Судзьдзя раздражнёна грукае па стале, патрабуючы цішыні.

Пракурор працягвае скорагаворкай зачытваць з паперкі абвінавачаньні: у Марыніча канфіскаваны пісталет, які ён захоўваў незаконна, што да кампутараў — Марыніч незаконна завалодаў «аргтэхнікай», скарыстаўшы службовае становішча не ў інтарэсах арганізацыі. У гэты час па залі з рук у рукі перадаюць прэс-рэліз Дзярждэпу ЗША, у якім гаворыцца пра тое, што Злучаныя Штаты ня маюць прэтэнзій адносна маёмасьці, знойдзенай у Марыніча.

Пра канфіскаваныя 90 тысяч даляраў, сярод якіх нібыта былі фальшывыя, размова не вялася: у зьвязку з гэтым эпізодам ён праходзіць толькі як сьведка.

Пракурор таксама папрасіў суд улічыць паводзіны абвінавачанага ў судзе: ён не прызнаў сябе вінаватым і не раскаяўся.

## Падвойная абарона

Першай прамаўляла адвакатка Валянціна Шыханцова. Спачатку яна спынілася на «пісталетнай вэрсіі»: так, зброя была знойдзена на лецішчы Марыніча, але невядома, дзе і калі абвінавачаны набыў пісталет і калі паклаў у схоў. Адбіткаў ягоных пальцаў няма ні на пісталеце, ні на пакеце, у якім ён ляжаў. Значыць, нельга выключаць, што пісталет падклалі. Экспэртыза даказала, што яшчэ даператрусу лецішча было кімсьці ўзламанае — пашкоджаныя замкі, разьбітая шыба ды знойдзеныя невядомыя адбіткі пальцаў.

Што да кампутараў, дык пацярпелага няма: ніхто да Марыніча прэтэнзій ня выставіў — ні ЗША, уладальнік кампутараў, ні "Дзелавая ініцыятыва", якая тымі кампутарамі карысталася.

Паводле слоў Шыханцовай, справу трэба было б разглядаць у рамках не крымінальнага, а грамадзянскага права, але і ў гэтым выпадку парушэньняў знайсьці нельга — складу злачынства няма.

Калі Шыханцова выклала фактычны бок справы, карыстаючыся сухімі юрыдычнымі аргумэнтамі, дык Вера Страмкоўская выступіла больш эмацыйна. Страмкоўская зьвярнула ўвагу на тое, што ў «клетцы» знаходзіцца шанаваны ўсімі чалавек (для суду гэта важна, бо ён мусіць улічваць асабістыя якасьці падсуднага пры вынясеньні прысуду). Яна таксама расказала пра дрэнны стан здароўя Марыніча і прыгадала Галіну Жураўкову, якая ходзіць у суд «сваімі нагамі» (былога прэзыдэнцкага «заўгаса» выпусьцілі з ізалятару пад падпіску аб нявыезьдзе, хоць яе і абвінавачваюць у тым, што яна скрала больш за мільён даляраў). Страмкоўская паведаміла, што паводле зьвестак Інтэрполу мадэль пісталета вельмі рэдкая і ні ў памежных краінах, ні ў Беларусі ня значыцца як зброя, якую выкарыстоўвалі ў злачынных мэтах. Адкуль ён узяўся на лецішчы Марыніча?

Абедзьве адвакаткі папрасілі суд прызнаць невінаватасьць кліента.

## «Віншую высокі суд»

30 сьнежня ля будынку суду сабралося 50 «зуброў». Побач — прыпаркаваныя аўтамабілі з дыпляматычнымі нумарамі. У залі суду Міхаіл Марыніч прамаўляе апошняе слова. «Менавіта з прычыны маёй грамадзянскай пазыцыі арганізавана кампанія дыскрэдытацыі мяне перад грамадзкасьцю, каб не дапусьціць мяне да ўдзелу ў будучых прэзыдэнцкіх выбарах». Абвінавачаньні ў захоўваньні незаконнай зброі і ў крадзяжы маёмасьці арганізацыі «Дзелавая ініцыятыва» Міхаіл Марыніч назваў «цынічнымі і сфабрыкаванымі ў КДБ на замову ўлады». Сваю прамову ён скончыў такімі словамі: «Я глыбока перакананы, што беззаконьне супраць мяне, гвалт і цынізм раней ці пазьней вернуцца да заказчыка і выканаўцаў. Я веру і ведаю: чакаць засталося нядоўга, перамены ў дарозе. Высокі суд, хай Госпад Бог пашле вам сілы і мужнасьці. Я прашу аднаго: быць аб'ектыўнымі, прыняць справядлівае рашэньне. Ня ведаю, ці можна мне з гэтай клеткі, але як нармальны чалавек я віншую высокі суд і ўсіх прысутных з Калядамі й Новым годам».

## Прысуд са спазьненьнем

У перапынку паміж заключным словам ды абвяшчэньнем прысуду, прызначаным на 16.30, «зубры» грэюцца, ходзячы колам перад ганкам суду з закладзенымі за галаву рукамі. Калідор перад заляй судовых пасяджэньняў поўны амапаўцаў у цывільным. Яны травяць анэкдоты.

А палове на пятую родных ды журналістаў запускаюць у залю. Тым, хто прыходзіць трохі пазьней, даводзіцца прадзірацца з боем — асабліва настырных журналістаў пагражаюць адвезьці ў РУУС. Прыяжджаюць дыпляматы, канфлікт сьціхае. Для пасла Нямеччыны Марціна Хекера ахова ставіць асобны зэдлік — месцаў на лавах больш няма.

Шыбы запацелі — іх даводзіцца расчыняць, бо няма чым дыхаць. У залі адсутнічаюць падсудны, судзьдзя ды пракурор. Нарэшце, праз паўтары гадзіны, усе ў зборы. Заля ўстае.

«Прысуд чытаць цалкам?» — пытаецца судзьдзя. «Так», — адказваюць адвакаты.

Судзьдзя зачытвае прысуд з усімі акалічнасьцямі справы, на падставе якіх было вынесенае рашэньне. «Чуеце? Пакінулі толькі тое, што было выгадна», — ідзе шэпт. Падчас зачытваньня часткі пра крадзеж голас судзьдзі гучыць надзвія дрыготка і слаба, а вось на частцы пра пісталет мацнее. Зь яе слоў робіцца зразумела — Марыніча прызнаюць вінаватым у крадзяжы аргтэхнікі, а «вэрсія зь пісталетам» не прайшла — даказаць, што Марыніч сапраўды меў нейкае дачыненьне да пісталета, абвінавачаньне ня здолела.

Працяг на старонцы 7.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Хто такі Марыніч

МІХАІЛ МАРЫНІЧ нарадзіўся 13 студзеня 1940 г. у вёсцы Старыя Галоўчыцы (Петрыкаўскі раён Гомельшчыны). Скончыў Політэхнічны інстытут, завочна — Інстытут замежных моваў. У 1970-я гады працаваў у будаўніцтве, з 1980-х — у сталічнай выканаўчай уладзе. Быў куратарам будаўніцтва мэтрапалітэну ды сыстэмы цеплазабесьпячэньня, старшынём Менгарвыканкаму. У 1990—1995 — дэпутат Вярхоўнага Савету.

Папрацаваў паслом у Чэхіі, затым вярнуўся ў Беларусь ды ўзначаліў Міністэрства замежнаэканамічных сувязяў. У 1999 г. Марыніча прызначылі паслом Беларусі ў Латвіі, Эстоніі ды Фінляндыі. У 2001 г. Марыніч нечакана падаў у адстаўку з пасольскай пасады і вырашыў балятавацца ў прэзыдэнты. Але ўзяць удзел у выбарах ня здолеў — сабраў менш за 100 000 подпісаў.

26 красавіка 2004 г. «Форд» Марыніча спыняе супрацоўнік ДАІ нібыта за перавышэньне хуткасьці. Марыніч адмаўляецца прад'явіць яму свае асабістыя рэчы для надгляду. Зьяўляюцца іншыя супрацоўнікі «органаў», знаходзяць у палітыка 90 тыс. даляраў і едуць да яго на лецішча, дзе ў адной з шафаў пад ручнікамі знаходзяць пісталет у пластыкавым мяшку. Пазьней, ужо ў часе сьледзтва, у гаражы сына Марыніча знаходзяць кампутарную тэхніку, што дае падставу вылучыць новае абвінавачаньне — у яе крадзяжы.

## НАВІНЫ

### Рэгуляваньне цэнаў на мяса

Пастановаю ўраду мяса ўключанае ў сьпіс сацыяльна значных тавараў, цэны на якія рэгулююцца. Гэта адбылося пасьля яго падаражаньня на 30—70% усьлед за рэфэрэндумным павышэньнем заробкаў і пэнсій. Экспэрты прагназуюць: рэгуляваньне можа прывесьці да масавага экспарту мяса і апусьценьня паліцаў у ятках.

### Ліцэй у Вільню?

Беларускі ліцэй разглядае магчымасьці пераносу навучаньня ў Вільню. Пра гэта паведаміў нашаму віленскаму кар. дырэктар Уладзімер Колас. Ліцэісты, пазбаўленыя будынку на Кірава, 21, ужо два гады туляюцца па кватэрах . Між тым у Вільні пустуе будынак легендарнае Віленскае беларускае гімназіі. З 24 сьнежня Вільня прыняла ліцэістаў на зімовую сэсію — ім аддалі Літоўскі дом. У гэтым інтэрнаце жывуць дзеці літоўцаў з дыяспары, якія вучацца на бацькаўшчыне. Цяпер яны на калядных вакацыях. Зь ліцэістамі сустрэўся дэпутат Сойму Літвы беларус Вацлаў Станкевіч (фракцыя сацыял-лібэралаў). Першы канал літоўскага тэлебачаньня LRT аддаў праймтайм пад жывую трансьляцыю сустрэчы зь ліцэістамі ў студыі.

### Адамовіча прытулілі

Паэт Славамір Адамовіч атрымаў палітычны прытулак у Нарвэгіі. Працэдура атрыманьня заняла больш за два гады. С.Адамовіч у 1996 г. адседзеў 9 месяцаў у турме за палітыку, а пазьней прылюдна зашыў сабе рот у знак пратэсту супраць уціску свабоды слова.

### Узьеліся на «ARCHE»

Яшчэ два папярэджаньні часопісу «ARCHE» выпісала Мініфармацыі. Адно Рэдакцыі: бачыцца бы за тое, што ў апошнім нумары «не пазначана дата выхаду». Другое заснавальніку: што часопіс зьмяніў тэматыку зь літаратурна-мастацкай на масава-палітычную.

### Воляй народаў

Віктар Ючшанка і Міхаіл Саакашвілі падпісалі ў сераду на горным курорце Тысавец Карпацкую дэкларацыю. У дакумэнце гаворыцца, што народы Ўкраіны й Грузіі «паказалі ўсяму сьвету, што свабода й дэмакратыя, воля народу мацнейшыя за дзяржаўную машыну, якой бы моцнай і жорсткай яна ні была», і «давялі, што антынародны рэжым ня здольны рэалізаваць надзённыя правы сувэрэннага народу». Толькі «пры свабодзе й дэмакратыі найлепш раскрываецца патэнцыял грамадзтва», пішуць яны. Дэклярацыя мае на мэце засьведчыць адданасьць эўрапейскім каштоўнасьцям і гатоўнасьць спрыяць апошняй хвалі дэмакратызацыі Эўропы.

**МБ, БелаПАН, svaboda.org**

# Цунамі

Што азначае, калі адбываюцца такія грандыёзныя катастрофы?

**ВІТАЛЬ ТАРАС**

> «Мы ня можам чакаць ласкі ад прыроды. Узяць яе — наша задача».
> *І.Мічурын*

Галоўнай навіной 26 сьнежня — апошняй нядзелі 2004 году — павінна было стаць перагаласаваньне на прэзыдэнцкіх выбарах ва Ўкраіне. Украінскія падзеі маглі б застацца галоўнай навіной году. Магчыма, і засталіся. Але ў той дзень тыя падзеі адсунуліся на другі плян. Першае месца ў паведамленьнях інфармацыйных агенцтваў і тэлеканалаў занялі вынікі стыхійнага бедзтва ў Паўднёва-Ўсходняй Азіі. Сам геаграфічны маштаб яго ўражвае. Гіганцкія хвалі — цунамі, выкліканыя падземнымі штуршкамі ў раёне тэктанічнага разлому на дне Індыйскага акіяну, — за некалькі імгненьняў зьнішчылі паселішчы й сродкі камунікацыі на берагох Інданэзіі, Маляйзіі, Тайлянду, Бангладэш, Паўднёвай Індыі, Шры-Лянкі, а таксама на Андаманскіх і Мальдыўскіх выспах ды зьнеслі дзясяткі тысяч чалавечых жыцьцяў. Стыхія мела сапраўды апакаліптычны характар: пасярод белага дня, пад бязвоблачным блакітным небам, пры поўным штылі на моры амаль што бясшумныя хвалі вышынёй да 30 мэтраў адна за адной накрылі ўзьбярэжжа ў многія тысячы кілямэтраў даўжынёй. Райскі трапічны сад, мара турыстаў, ператварыўся ў кашмарную мешаніну суднаў, машын, аскабалкаў дамоў, сьмецьця й чалавечых трупаў.

Чамусьці ўспомніліся словы Віктара Юшчанкі пра ягоны твар, пашкоджаны атрутай, пра які палітычны лідэр сказаў, што гэта твар Украіны. Чый твар мы ўбачылі ў той вечар на экранах тэлевізараў у руінах дамоў і гурбах сьмецьця — усяго чалавецтва?

Прыродныя катаклізмы быццам бы ня маюць непасрэднага дачыненьня да палітычных і сацыяльных узбурэньняў. Праўда, Герман Чыжэўскі, які першы суаднёс цыклы сонечнай актыўнасьці з цыклямі сацыяльнай актыўнасьці насельніцтва Зямлі, з такога сьцьверджаньня, відаць, толькі пасьмяяўся б. Паводле слоў спэцыялістаў-геліякасмолягаў, якія вывучаюць Сонца, адна зь нядаўніх успышак на паверхні сьвяціла і ўсьлед за гэтым магнітная віхура былі наймацнейшымі за ўвесь час назіраньняў. А пік сонечнай актыўнасьці, які супаў з пачаткам новага тысячагодзьдзя, магчыма, яшчэ не мінуў…

Але гаворка тут не пра сонечную актыўнасьць ці электрамагнітнае выпраменьваньне. Навуковыя гіпотэзы пакінем навукоўцам. Таксама й не пра выбары ва Ўкраіне размова. Прынамсі, ня толькі пра выбары. Справа ў тым, што калі адбываюцца такія грандыёзныя катастрофы, чалавек міжволі пачынае задумвацца — што гэта азначае? Ніводзін тэракт — нават 11 верасьня 2001 году ў Нью-Ёрку — няможна нават параўнаць са стыхіяй. У сярэдзіне XVIII стагодзьдзя, калі землятрус цалкам разбурыў квітнеючы горад Лісабон, сярод партугальцаў дый эўрапейцаў увогуле ўзмацніліся інфэрнальныя, апакаліптычныя настроі, якія, у сваю чаргу, прымусілі некаторых мысьліцеляў перагледзець іх рэлігійныя ды маральныя пастуляты ці засумнявацца ў некаторых зь іх (успомнім хаця б Вялікага Інквізытара ў Дастаеўскага).

Канечне, Другая сусьветная вайна пераўзышла вынікі любога стыхійнага бедзтва, зь якімі за апошнія тысячагодзьдзі сутыкалася чалавецтва. Вайна забрала мільёны жыцьцяў, нават існаваньне цэлага народу — габрэяў — было пастаўлена пад сумнеў. Але, як гэта ні цынічна гучыць, вайну, а таксама масавыя рэпрэсіі можна вытлумачыць прыродай чалавека, ягонымі хцівымі інстынктамі, карысьлівымі інтарэсамі, інтарэсамі асобных краін, клясаў, сацыяльных груп, груповак людзей, урэшце, прыхамацьцю правадыра-тырана і г.д. Так ці інакш, усе гэта можна хоць неяк растлумачыць і нават прадказаць. Але ж і падчас войнаў ці рэвалюцый здараліся бедзтвы й землятрусы. Большасьць гэтых катастроф прадказаць было немагчыма (максымум, што ўдавалася астролягам дагэтуль, дык гэта часам угадваць нешта з імавернасьцю 50/50).

Я сьвядома не бяру тут пад увагу **тэхнагенныя** катастрофы. Пра іх маральны сэнс, ці адсутнасьць такога сэнсу, гаварыў некалькі год таму Сяргей Дубавец у адной зь перадач цыклу «Вострая Брама» (пераказваць перадачу, дзе разглядаліся прыклады сьмяротных пажараў на лыжным курорце ў Аўстрыі, у аўтамабільным тунэлі ў Альпах і некаторыя іншыя інцыдэнты, тут ня бачу магчымасьці — адсылаю цікаўных да архіву радыё «Свабода» ў Інтэрнэце).

Гаварыць аб ролі выпадку ў такіх выпадках, прабачце за таўталёгію, не выпадае. Бо, як бы ні стараліся вынаходнікі, канструктары й будаўнікі розных тэхнічных збудаваньняў, выключыць саму магчымасьць аварыі ці збою ў працы кожнага мэханізму, кожнай машыны паводле азначэньня нельга. І чым вышэйшы ўзровень тэхналёгіі, чым больш складаны мэханізм ці сыстэма мэханізмаў, тым большая імавернасьць іх паломкі. Выдатны прыклад гэтаму — сам чалавек, найбольш дасканалы з усіх вядомых нам жывых мэханізмаў.

Але чалавек настолькі паверыў у сваю ўсёмагутнасьць, што цалкам ігнаруе ў сваёй жыцьцядзейнасьці законы прыроды, законы жыцьця й сьмерці, як бы пакідае іх за дужкамі штодзённай сьвядомасьці. І толькі прыродныя катастрофы здольныя нагадаць чалавеку аб ягоным сапраўдным месцы ў сусьвеце.

> Ніводзін тэракт — нават 11 верасьня 2001 году ў Нью-Ёрку — няможна нават параўнаць са стыхіяй.

У XXI стагодзьдзі неяк недарэчна казаць пра кару боскую, Апакаліпсіс ці нейкія знакі. Тое, у што людзям удалося ператварыць сваё жыцьцё ў мінулым стагодзьдзі, тыя вынаходкі ў сфэры фізычных і маральных зьдзекаў з падобных да сябе, якія яны стварылі (улучна з газавымі камэрамі і крэматорыямі), ня сьніліся старажытным прарокам і стваральнікам біблейскіх тэкстаў. Як папярэджваў Фройд, цалкам цывілізаваны й з выгляду культурныя людзі зь лёгкасьцю ператвараюцца ў быдла. Прыкладаў у гісторыі ўжо новага стагодзьдзя процьма — амэрыканскія салдаты зьдзекуюцца з палонных іракцаў; расейскі афіцэр гвалтуе і забівае палонную чачэнскую дзяўчыну; беларускія спэцназаўцы (ці як правільна іх назваць?) забіваюць паводле загаду начальства ні ў чым не вінаватых безабаронных людзей, карыстаючыся падручнымі сродкамі — у тым ліку, напрыклад, рыдлёўкай — і хаваюць іх у патаемным месцы ў лесе ці балоціне — як дзікіх зьвяроў.

Ніводная з папярэдніх катастроф не была ўспрынята як нейкае папярэджаньне, падстава для сур'ёзнага роздуму, а тым больш карэкціроўкі штодзённага жыцьця людзей або палітыкі цэлых дзяржаў. Можна не сумнявацца, што найбольшую цікавасьць да цунамі ў Індыйскім акіяне праявяць кінэматаграфісты. Дзе-небудзь у Галівудзе ўжо сьпеюць задумы стварэньня новых блякбастэраў на тэму катастрофы. Яшчэ адна высновa трагедыі — людзі сталі абыякавымі да ўсяго, што ў рэальнасьці адбываецца вакол іх, у тым ліку да сьмерцяў і крыві. Прывучаныя да гэтага тэлебачаньнем, кіно і электроннымі гульнямі, яны здольныя ўспрыняць трагедыю толькі ў выглядзе прафэсійна апрацаваных навін альбо, яшчэ лепш, прыгожа ўпакаванага відовішча.

Але ў той самы час катастрофа прадэманстравала каштоўнасьць інфармацыі. Коштам яе было ў літаральным сэнсе жыцьцё дзясяткаў тысяч людзей, і лік вёўся сапраўды на хвіліны. Калі б у пацярпелых краінах была сыстэма апавяшчэньня пра цунамі, калі б амэрыканскія навукоўцы змаглі давесьці інфармацыю аб падземных штуршках (якую яны атрымалі, фактычна, яшчэ да пачатку землятрусу) да людзей, здольных прымаць рашэньні й браць на сябе адказнасьць, трагедыя магла б быць значна менш маштабнай.

Як не прыгадаць тут Чарнобыль, калі ўлады — неймаверная, злачынная рэч — ня толькі не казалі ў першыя гадзіны пра характар і маштаб ядзернай катастрофы, а ўсяляк спрабавалі схаваць сам факт яе ад грамадзтва! Вытокі тае злачыннай бязьдзейнасьці (дый сучасных спроб кіраўніцтва Беларусі прымяншаць вынікі чарнобыльскай катастрофы) трэба шукаць у адносна надаўнім мінулым. Здаецца неправдападобным, але ахвярай цунамі ледзьве ня стаў шмат гадоў назад тады яшчэ нікому не вядомы пісьменьнік Васіль Быкаў, які служыў нейкі час афіцэрам Савецкай Арміі на Курылах, на высьпе Кунашыр. Як вынікае з успамінаў Быкава ў ягонай кнізе «Доўгая дарога дадому», землятрусы на Далёкім Усходзе, у прыватнасьці, на Кунашыры, — рэч звыклая. Далей цытую паводле кнігі: «Неяк я бег па вуліцы ў пачатку землятрусу, і вуліца перада мной трэснула на ўсю шырыню. Ледзьве пасьпеў пераскочыць шчыліну шырынёй з далонь. А ўвосень 52-га здарылася немаведама што. Рэчка, што працякала цераз пасёлак і ўпадала ў затоку, пачала цячы назад. Вадой заліло лугавіну, падтапіла дамоўкі. Ужо праз колькі дзён дазналіся, што то — ад цунамі».

Афіцэры дазналіся праз колькі дзён, цывільнае насельніцтва СССР, хутчэй за ўсё, не дазналася тады пра стыхійнае бедзтва нічога. Ахвярамі цунамі на Сахаліне, здаралася, рабіліся сотні, нават тысячы людзей. Але пра гэта маўчалі. Доўгі час, напрыклад, хавалася інфармацыя пра землятрус у сталіцы Туркмэніі Ашгабадзе ў 1948-м, які амаль цалкам зьнішчыў горад. У савецкіх газэтах пра гэта не было ані слова. А як жа — хто дазволіў несанкцыянаваную катастрофу?!

Толькі партыя ды яе рулявы мелі эксклюзіўнае, як кажуць, права пазбаўляць жыцьця людзей, распараджацца ізнімі лёсамі. А тут ня клясавыя, а нейкія загадкавыя прыродныя сілы. Нездарма тады нарадзіўся плян вялікага пераўтварэньня прыроды, які прадугледжваў, у прыватнасьці, паварот сібірскіх рэк, што ўпадаюць у Паўночны Ледавіты акіян, у адваротным кірунку, у бок Цэнтральнай Азіі.

Значна пазьней сябар Васіля Быкава, таксама франтавік, паэт Навум Кісьлік напіша: «Дурак во сне придумал, чтоб рекам течь вспять».

Можна дадаць — і плян асушэньня Палесься таксама.

Сёньня ў Кітаі пачалі ажыцьцяўляць плян пераўтварэньня ракі Янцзы, чымсьці падобны да павароту сібірскіх рэк. Ведаючы працавітасьць і ўпартасьць кітайцаў, можна не сумнявацца, што плян будзе зьдзейсьнены. Некалі ж удалося перастраляць там усіх вераб'ёў, абвешчаных галоўнымі ворагамі сельскай гаспадаркі (праўда, потым у палёх разьвялося столькі насякомых-шкоднікаў, што давялося вераб'ёў завозіць зь іншых краін, каб уратаваць ураджай).

Ужо даўно навукоўцы высьветлілі, што паводкі ў Бангладэш, напрыклад, якія здараюцца там ці не штогод, маюць настолькі разбуральны характар з той прычыны, што амаль усе землі там разараныя пад пасадкі рысу. І гэта вядзе да страшэннай эрозіі глебы. А калі так пойдзе далей, усю краіну зь цягам часу проста змые ў акіян. Але пасевы там па-ранейшаму пашыраюць, нягледзячы на новыя й новыя тысячы ахвяраў паводак.

От, дзе там тая Бангладэш! Але ж і кіраўнік зусім далёкай ад яе дзяржавы, што мяжуе цяпер з Эўразьвязам на Захадзе й мяцежнай Украінай на поўдні, упарта запэўнівае нас, што найлепшы паказьнік разьвіцьця сельскай гаспадаркі — гэта пашырэньне пасяўных плошчаў.

Зразумела, толькі ад вышэйшага кіраўніцтва могуць зыходзіць дырэктывы — быць дажджу або ня быць, калі пачынаць сеяць і калі — жаць. Толькі яно можа вырашаць, ці пакінуць жыцьцё таму ці іншаму чалавеку — злачынцу або былому паплечніку. (Каласы пад сярпом тваім?) Калі падначаленыя з гэтым згаджаюцца, значыць — так яно і ёсьць. Значыць, мы ўсе жывём яшчэ ў эпоху да сусьветнай біблійнай залевы.

Цунамі ды ўраганы зь лёгкасьцю разбураюць любыя, самыя магутныя будынкі й сьцены. Яны ніяк ня могуць разбурыць толькі бар'еры глупства й самаўпэўненасьці ў нашых галовах.


WASHINGTONPOST.COM

# Што новага ў заканадаўстве ад 1 студзеня?

Па традыцыі ў першы дзень году набываюць моц шэраг заканадаўчых навэл.

Так, з 1 студзеня пачала дзейнічаць пастанова Савету міністраў №1579, якая ўводзіць **мінімальную зарплату з 1 студзеня ў памеры 128 860 рублёў.**

У рэчышчы захадаў па ўзмацненьні сацыяльных гарантый было зацьверджана й **Палажэньне аб парадку ўвядзеньня зьніжак і надбавак да страхавых тарыфаў па абавязковым страхаваньні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасьці й прафэсійных захворваньняў** (пастанова Саўміну №1591). Спадарожнічае яму пастанова №1650 **«Аб зацьверджэньні на 2005 год памераў адлічэньняў у спэцыяльны страхавы рэзэрв і фонд папярэдніх (прэвэнтыўных) мерапрыемстваў па абавязковым страхаваньні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасьці ды прафэсійных захворваньняў»** (адлічваецца мусіць адпаведна 89% і 5%).

Для работнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў павінны быць цікавымі навагодзьдзя **памеры пакрыцьця выдаткаў пры службовых камандзіроўках** (з 1 студзеня сутачныя складаюць 10 000 руб., сутачныя пры аднадзённых службовых камандзіроўках і камандзіроўках у такую мясцовасьць, адкуль ёсьць магчымасьць штодзённа вяртацца да месца пастаяннага жыхарства, — 5 000 руб., кампэнсацыя расходаў па найме жылога памяшканьня без прад'яўленьня пацьвярджальных дакумэнтаў — 3 000 руб.).

Пачынае дзейнічаць і — **«Інструкцыя аб парадку выплаты грашовай кампэнсацыі сем'ям пры нараджэньні блізьнят».** З 1 студзеня **на 50% павялічваецца таксама памер аднаразовае дапапогі пры нараджэньні трэціга й наступных дзяцей.** Яна мае складаць блізу 408 000 руб.

Зь першага студзеня нарэшце набывае законную сілу распараджэньне Міністэрства інфармацыі **аб павелічэньні ў радыёэтэры аб'ёму айчыннай музыкі да 75%.** Пра апошняе было напісана летась так шмат і з розных бакоў, што няма сэнсу пакідаць нейкія адмысловыя камэнтары. Хочацца толькі выказаць спадзеў, што надалей гэтая безумоўна пазытыўная навэла ня будзе ўступаць у калізіі з нават не падзаконнымі, а проста-такі незаконнымі актамі, якія ўводзяць сьпісы «няправільных айчынных музыкаў». Не забудзься выключыць прас, беларусе!

Суб'екты гаспадараньня Беларусі й Расейскай Фэдэрацыі пераходзяць ва ўзаемным гандлі **на выплату ўскосных падаткаў паводле прынцыпу краіны прызначэньня**. Пры экспарце тавараў будзе ўлічвацца стаўка падатку на дабаўленую вартасьць і (альбо) вызваленьне ад выплаты акцызаў. Пры імпарце тавараў на тэрыторыю аднаго боку з тэрыторыі іншага ўскосныя падаткі пачынаюць зьбірацца падатковымі органамі толькі ў краіне імпарцёра, за выняткам тавараў, якія ўвозяцца для перапрацоўкі, перамяшчаюцца транзытам і г.д. Варта адзначыць, што канчаткова рашэньне аб ужываньні нулявой стаўкі набывае моц толькі пасьля пацьвярджэньня падатковым органам краіны-імпарцёра факту ўплаты падатку на дабаўленую вартасьць пакупніком.

Дарэчы, згодна з заявай расейскага МЗС, з 1 студзеня **грамадзяне СНД не здолеюць уяжджаць на тэрыторыю Расейскай Фэдэрацыі толькі па ўнутраных пашпартах сваіх дзяржаў, а таксама на падставе пасьведчаньняў аб нараджэньні ды розных ведамасных дакумэнтах**. Расейскія ўлады тлумачаць гэтыя захады барацьбой з тэрарызмам.

Разам з тым нашы заканадаўцы вырашылі сур'ёзна ўзяцца за вырашэньне розных транспартных праблем. Так, з 1 студзеня **абавязковае страхаваньне адказнасьці перавозчыка пашыраецца на ўсе віды транспарту**. Гэтую норму ўтрымлівае загад прэзыдэнта «Аб некаторых асаблівасьцях абавязковага страхаваньня грамадзянскай адказнасьці перавозчыка перад пасажырамі». Заканадаўца паклапаціўся пра пасажыраў ня толькі міжнародных, міжгародніх і прыгарадных зносін, але й гарадзкога транспарту, а таксама пра аматараў турысцкіх і экскурсійна-прагулачных маршрутаў на водным транспарце.

Але, пэўна, найбольш у новым годзе беларуса пацешыць раднюткая Дзяржаўтаінспэкцыя. **Асоб, якія кіравалі аўтамабілем у нецьвярозым стане, будуць пазбаўляць права кіраваньня транспартным сродкам на тэрмін ад аднаго да трох год, а паводле пастановы суду нават да пяці.** Па сканчэньні гэтага тэрміну кіроўцу — аматараў алькаголю чакае прыемная мажлівасьць спачатку даведацца пра стан свайго здароўя ў доктара-нарколяга, а потым зноўку спаткацца з аўтаінспэктарамі на паўторных іспытах па правілах дарожнага руху.

Неабыякавасьць беларусаў да алькаголю пацьвердзіў прыняцьцем палажэньня пра парадак уліку, захоўваньня, водпуску й перавозкі гэтае каштоўнае вадкасьці Савет міністраў. Дзяржава паклапацілася пра тое, каб юрыдычныя асобы і прадпрымальнікі абыходзіліся з празрыстай грашовай адзінкай ня як ім узбрыдзе ў галаву, а адпаведным уніфікаваным чынам, бо навошта ж дэвальваваць вартасьць прадукту?

Часам можна пачуць, нібы супрацоўнікі органаў унутраных справаў ня ведаюць пра такія рэчы, як этыкет і культура паводзін. З гэтым стэрэатыпам вырашылі змагацца ў Міністэрстве ўнутраных спраў. Першы ж загад міністра ў новым годзе тычыцца **пытаньня ветлівасьці і ўважлівасьці супрацоўнікаў МУС да грамадзян.** Да найбольш ветлівых зь міліцыянтаў плянуецца прымяняць практыку заахвочваньняў, а да хамаў, наадварот, спагнаньні. Высокая культура мусіць быць адной з абавязковых якасьцяў ахоўнікаў правапарадку, бо, на думку міністра, менавіта па супрацоўніках МУС народ мяркуе пра ўсю ўладу.

Савет міністраў пацешыў і тых, хто зь якое-колечы прычыны вырашыў захаваць чэкі «Маёмасьць». Паводле пастановы ўраду, тэрмін абарачэньня беларускіх «ваўчараў» скончыцца толькі 31 сьнежня 2005 г. Беларусы маюць яшчэ цэлы год, каб упэўніцца ў тым, што вынаходка нашага земляка Чубайса ёсьць насамрэч каштоўнай паперай.

З Новым годам, з новым прасам!

**Уладзіслаў Белавусаў**
**і Кірыл Касьцян**

Аўтары агляду — аналітыкі інтэрнэт-часопісу юрыстаў і палітолягаў «Праўнік» (praunik.org).

# Вінаградная — дарога жызьні

Маўчаньне пра забітых абяртаецца ганараваньнем забойцаў.

З жаданьнем жыхароў пазбавіцца ад змрочнай назвы можна пагадзіцца: наўрад ці каму даспадобы жыць на вуліцы Асьвенцімскай ці ў Расстрэльным завулку. Тым больш, у тапаніміцы раёну ўжо дамінуюць расьлінныя матывы. Нельга, аднак, не заўважыць, што, прыбіраючы назву, гарадзкая ўлада не паклапацілася пра захаваньне памяці пра забойствы. Тым больш што і ў гэтым напрамку ініцыятыў хапае. Праблема, такім чынам, не ў канкрэтным перайменаваньні, а ў сэлекцыйным падыходзе. Бо голас народу, паводле выразу Караткевіча, — голас «бога з машыны», а ўлада — рэжысэр, які загадвае, калі тую машыну пусьціць у рух. Таму мы ідзём па Вінаграднай як мага далей ад Курапатаў, да сьветлага жыцьця. У мінулым, якім хочуць яго бачыць праектанты нашае будучыні, рэпрэсіям няма месца. А гэта значыць, што ўжо сёньня пра тыя пастаўленыя на канвэер забойствы ня трэба згадваць.

Дыялектыка: замоўчваючы забойствы, па нейкім законе захаваньня мусім часьцей і часьцей згадваць забойцаў. Натуральна, ня ў гэткім статусе. Тапаніміка па-ранейшаму поўніцца імёнамі Дзяржынскага, Ландэра ды іншых. Яны застаюцца на месцы, застаецца некранутаю традыцыя іхняй гераізацыі. Нельга пакінуць мінулае ненаселеным, і, калі мы маўчым пра забітых, анічога не застаецца іншага, як ганараваць забойцаў. Але гэта — пабочны вынік. Бо паляваньне на непажаданыя згадкі выкліканае ня столькі жаданьнем захаваць сьветлае імя бальшавіцкіх праваднікоў (урэшце, шмат чые злачынствы асудзілі яшчэ ў савецкія часы), колькі стараньнямі не парушыць зручных сацыяльных стэрэатыпаў.

Шматгадовая перавага забойцаў над забітымі спрычынілася да ўсталяваньня шэрагу правілаў, звычаяў і выгодаў для немалой — і ўплывовай — часткі нашых суграмадзян. Чаму не перайменаваць вуліцы ў гонар вядомых сэлекцыянэраў, што вывелі кветкі, імёны якіх цнатліва ўганаравалі ваколіцы расстрэльнага ўрочышча? Выйшла б, прынамсі, нейкая гістарычная справядлівасьць. Але хіба хто імкнецца да тае справядлівасьці? Мэта маніпуляцый зь мінуўшчынай — утульнасьць і спакой, перадусім жа — стабільнасьць. Высокі статус і немалыя сацыяльныя прывілеі *чалавека ў пагонах* у значнай ступені абумоўлены ягонай прэзумпцыяй невінаватасьці ў вачах грамадзтва. Дзеля захаваньня гэткае ілюзіі можна вынішчэньне мільёна аўганцаў паставіць ніжэй за ахвяры тых, хто гэтае вынішчэньне ўчыніў, несамавітую адданасьць справе супрацоўнікаў размаітых сталінскіх «органаў» — вышэй за мільёны зьнішчаных жыцьцяў.

Посьпехі на гэтым шляху відавочныя: нават сяроод ахвяр палітычных пратэстаў трываe схільнасьць да разграшэньня «нашых хлопцаў». Дзеля стабільнасьці ў цяні апынаецца й сёньняшняя, важная і патрэбная, праца «сілавых структур» — нялёгка перакінуць масток паміж самаадданым вынішчэньнем «ворагаў народу», «кулакоў», «шкоднікаў», «шпіёнаў» і патрабаваньнем сёньняшняга дня, дзе на першае месца выходзіць, бадай што, стойкасьць перад спакусамі лёгкага заробку ды злоўжываньня гвалтам. Але стаўкаю — ня памяць ды сьветлыя ідэі карыфэяў, а заробкі і пэнсіі. Не гістарычная справядлівасьць, а штодзённая гарантаваная недатыкальнасьць прывілеяў. Дзеля гэткіх вартасьцяў можна рабіць апэрацыю на памяці. Іду па Абрыкосавай ды кручу на Вінаградную. Ня вуліца — дарога да салодкага жыцьця. Дробны крок для грамадзтва — вялізная зручнасьць для асобнага чалавека.

Крок, бадай што, сапраўды дробны. Маленечкая праява ладу жыцьця, спосабу мысьленьня і легкадумнага бачаньня будучыні — нашмат выразьнейшая за баламутную рыторыку ўрачыстых прамоў і перакручаную схалястыку «вучоных» ідэалягічных трактатаў, дзе можна пачуць і вычытаць усё што хочаш. Дзеля таго яны й пішуцца — а хадзіць мы будзем па Вінаграднай.

**Даніла Жукоўскі**

## НАВІНЫ ГАСПАДАРКІ

### На 143-м

Беларусь апынулася на 143-м месцы з 155-ці ў штогадовым рэйтынгу эканамічнай свабоды. Яго складаюць амэрыканская «Heritage Foundation» ды газэта «The Wall Street Journal». Найпрыдатнейшым для бізнэсу куточкам сьвету прызнаны Ганконг. Можна таксама парадавацца за эстонцаў – 4-е месца. Самі ЗША ня трапілі ў першую дзясятку.

### На месцы «чацьверкі» – офіс

На месцы інтэрнату БДУ, што на праспэкце Машэрава, 9, будзе пабудаваны гандлёва-офісны комплекс. Конкурс на забудоўшчыка правядуць улетку. Для БДУ ў іншай частцы гораду будзе збудаваны новы інтэрнат.

### Тэлевізар-балбатун

«Гарызонт» пачынае распрацоўку тэлевізару новай сэрыі «Humanik» са здольнасьцю «размаўляць» з карыстальнікам — выконваць загады, якія падаюцца голасам, даваць карысныя парады. Ці будзе тэлевізар валодаць абедзьвюма дзяржаўнымі мовамі, не паведамляецца.

### «Камунарка» здалася

Фабрыка «Камунарка» пачне выпускаць цукеркі з надпісамі па-беларуску на абгортцы. Дабілася гэтага Таварыства беларускай мовы. Пераход на новыя абгорткі адбудзецца пад лета. 40% салодкай прадукцыі «Камунаркі» экспартуе ў Расею, і моўная адметнасьць брэндаў дапаможа прадукцыі запамінацца.

### Мадэрнізацыя Лукамскай ДРЭС

Расейскае ААТ «Сілавыя машыны» выйграла ў суперніцтве з кампаніяй «Alstom» (Францыя) тэндэр на мадэрнізацыю трох энэргаблёкаў найбуйнейшай у Беларусі Лукамскай ДРЭС. Кошт праекту — $28 млн. Рэканструкцыя скончыцца да 2008 г.

### Біяпаліва з рапсу

Першыя 10 т беларускага біяпаліва для дызэляў выраблены ў Наваельні (Дзятлаўшчына). Калі экспэрымэнт палічаць удалым, за год у краіне выпусьцяць 2 тыс. т дызбіяпаліва.

### Украіна не бяз газу

Туркмэністан з 3 студзеня аднавіў падачу газу ва Ўкраіну, аднак па новай цане — $58 за тысячу кубоў (раней — $44). Назіральнікі зьвязваюць павышэньне цаны з нэрвовай рэакцыяй туркмэнскага дыктатара на перамогу В.Ючшанкі.

### Падаткі па-новаму

1 студзеня Беларусь ды Расея перайшлі на спагнаньне ўскосных падаткаў паводле прынцыпу краіны прызначэньня. Зьбіраць падатак на дабаўленую вартасьць ды акцызы будзе цяпер краіна-імпарцёр. Гэта мае штогод прыносіць 200 млн даляраў у бюджэт. Сыстэма, аднак, абяцае быць дужа бюракратызаванай (а значыцца, і патэнцыйна карумпаванай) — дзеля таго каб з прадпрыемства не спаганялі падаткаў дома, партнэр у іншай краіне павінен іх сплаціць, а падатковыя органы дзьвюх краін — пасьпець у тэрмін абмяняцца адпаведнай інфармацыяй.

### ЖЭС-экспэрымэнт

У Менску распачынаецца экспэрымэнт па камэрцыялізацыі ЖКГ. У чатырох раёнах сталіцы ЖЭСы заменяць на тры структуры: ЖЭУ (жыльлёва-эксплюатацыйныя ўчасткі), службы заказчыка (плянаваньне працы камунальшчыкаў) ды цэнтры працы з насельніцтвам (пашпартны стол і іншыя бюракратычныя функцыі). У ЖЭУ будуць працаваць электрыкі, сантэхнікі і іншыя спэцыялісты. Чакаецца, што канкурэнтамі ЖЭУ будуць прыватныя фірмы, якія таксама зоймуцца эксплюатацыяй жыльля.

**АК; БелаПАН, АФН**

# ЗАТ «РБ»

Працяг са старонкі 2.

Іраку ўзбраеньні, а ўзамен атрымлівалі грошы праз фінансавую схему з удзелам «Інфабанку».

## Мабільны рынак

Увесь год дзяржава паступова працягвала наступ на рынак сотавай сувязі. У траўні СП ААТ «МЛС» (Velcom) афіцыйна абавязваюць перадаць «Белтэлекаму» 20,9% акцыяў, што раней належалі кіпрскай кампаніі SB Telecom ды 10% акцыяў, якімі валодала ЗАТ «Белтэхэкспарт». У выніку «Белтэлекам», які да гэтага меў у МЛС долю ў 31%, атрымлівае пакет акцыяў, значна большы за кантрольны.

У верасьні МТС выходзіць у лідэры ды падключае мільённага абанэнта. Аднак дзяржава захоўвае кантрольны пакет у беларускім СТАА «МТС», нягледзячы на патрабаваньні расейскага ААТ «МТС» перадаць яму 2% акцыяў беларускай даччынай кампаніі.

Але галоўная сэнсацыя адбываецца 9 лістапада — у Беларусі рэгіструюць трэцяга, на 100% дзяржаўнага GSM-апэратара сотавай сувязі «Best». Кажуць, цэны на ягоныя паслугі будуць даступныя нават сялянам. 25% кампаніі належаць «Белтэлекаму», а 75% — вышэйзгаданаму «Агату». Акрамя вайсковага абсталяваньня, «Агат» вырабляе й гарадзкія таксафоны, што дае падставы для спэкуляцыяў на тэму стварэньня першага айчыннага сотавага тэлефона.

## Рознымі маршрутамі

Маршрутныя таксоўкі пачынаюць пераходзіць у сфэру дзяржаўных інтарэсаў. У жніўні Вышэйшы гаспадарчы суд сканфіскоўвае 200 мікрааўтобусаў «Мэрсэдэс-Спрынтэр» у ААТ «Міндаўг», найбуйнейшага прыватнага апэратара маршрутных таксаперавозак.

Гэтыя аўто «Міндаўг» набыў у лізінг у канцэрну «Даймлер-Крайсьлер». Каб плаціць меншыя мыты, «Міндаўг» паабяцаў, што будзе выкарыстоўваць машыны для замежных перавозак — інакш кажучы, «экспарту паслуг». Але насамрэч таксоўкі пусьцілі на сталічныя вуліцы. Дзяржаўны мытны камітэт зразумеў, што яго спрабуюць абхітрыць, і спагнаў зь «Міндаўгу» праз суд 2,5 млрд рублёў. Пакуль кампанія разьбіралася з запазычанасьцю, надыходзіць час плаціць за лізінг 200 маршрутак, а грошай не стае. «Даймлер-Крайсьлер» падае ў суд — аўто канфіскуюць. «Менскртранс» набывае мікрааўтобусы, абяцаючы больш нізкія цэны на перавозку.

## Банкі

Пытаньне ўвядзеньня супольнай валюты летась абмяркоўвалася досыць няўцямна. Але цесная інтэграцыя з расейскай банкаўскай сыстэмай усё-такі выйшла бокам: 13 траўня Цэнтрабанк Расеі адбірае ліцэнзію ў банку «Содбізнэсбанк», што прывяло да сур'ёзнага банкаўскага крызісу. Ягоная хваля дакацілася й да нас: людзі пачалі скупляць валюту. Сытуацыю выратоўвае пакуль яшчэ незалежны Нацбанк: ён прадае 66 млн даляраў са сваіх рэзэрваў ды гасіць паніку.

Людзі з-за мяжы чакаюць пабачыць у Беларусі клясычную плянавую эканоміку, але не знаходзяць яе. Дзяржава ўсё часьцей дзейнічае ня як супрацоўнік плянавага аддзелу, а як буйны бізнэсовец. Беларусь ператвараецца ў закрытае акцыянэрнае таварыства, дзе галоўная доля належыць аднаму акцыянэру, а грамадзяне застаюцца шараговымі супрацоўнікамі.

**Алесь Кудрыцкі**




Прэм'ер Сяргей Сідорскі ўручае генэральнаму дырэктару МАЗу Валянціну Гурыновічу ганаровы сьцяг з нагоды 60-годзьдзя прадпрыемства.

# Даеш 16 паказьнікаў!

Для падвышэньня заробкаў дзяржава гатовая ахвяраваць інтарэсамі прадпрыемстваў-экспарцёраў, лічыць эканаміст Уладзь Калупаеў.



Прыемна зьдзівіла ў 2004 годзе стабільнасьць абменнага курсу беларускага рубля да амэрыканскага даляра. За студзень — лістапад дэвальвацыя «зайчыка» адносна даляра склала ўсяго 0,8% пры статыстычным росьце цэн на 10,3% (праўда, паводле маёй ацэнкі, насамрэч рост цэнаў склаў каля 40%). Яшчэ год назад гэтыя лічбы складалі адпаведна 19,0% і 25,6%. Такім чынам, Нацбанк адмаўляецца ад палітыкі, якой ён трымаўся з 2000 г. — тады адносная макраэканамічная стабільнасьць дасягалася шляхам дэвальвацыі беларускага рубля сувымерна тэмпам інфляцыі. Галоўнай мэтай гэтай палітыкі было падтрымліваць цэнавую канкурэнтаздольнасьць прадпрыемстваў, арыентаваных на экспарт. Цяпер іншы арыенцір — выкананьне 16-ці абавязковых паказьнікаў, зь якіх бадай галоўным трэба лічыць рост заробку ў даляравым эквіваленце.

### Як зараблялі прадпрыемствы

Дагэтуль выходзіла супярэчлівая зьява. Спачатку мясцовыя прадпрыемствы, ня маючы іншых магчымасьцяў атрымаць дастатковы прыбытак і пазьбегнуць банкруцтва, падвышалі цэны на ўласную прадукцыю. Праз нейкі час яны прасілі падвысіць пошліны на замежную прадукцыю, каб перамагчы ў канкурэнтнай барацьбе на ўнутраным рынку. Затым пры стабільным абменным курсе і росьце цэн у краіне павышаліся даляравыя цэны на беларускую прадукцыю, і ўжо на замежных рынках яна траціла ў канкурэнтаздольнасьці. Натуральна, беларускія экспарцёры праз міністэрствы і канцэрны, а тыя праз урад, лабіравалі яшчэ і дэвальвацыю нацыянальнай валюты, каб кампэнсаваць страты.

Такім чынам, уся палітыка, як і пры плянавай эканоміцы ў савецкія часы, адпавядала выключна інтарэсам вытворцаў. Спачатку тыя падвышалі цэны, ніякім чынам не зьмяняючы ўласнай прадукцыі, і атрымлівалі неабгрунтаваны дадатковы прыбытак на ўнутраным рынку, затым пад іх дэвальвавалі нацыянальную валюту, і яны атрымлівалі яшчэ і дадатковы гэтак званы дэвальвацыйны прыбытак ад продажу прадукцыі на замежных рынках.

### Чаму гублялі спажыўцы

Але эканамічныя законы падмануць нельга. Калі нехта двойчы выйграў, значыць, нехта два разы прайграў. Гэтым «кімсьці» быў спажывец. Напрыклад, у пачатку 2003 году чалавек знайшоў новую працу, якая абяцала яму заробак у 600 тысяч рублёў, замест 400 тысяч, якія ён меў на старой працы. Ён на год заключыў кантракт з наймальнікам і з ахвотай пачаў працаваць, чакаючы, што да канца году павысіць уласны дабрабыт. Але да канца году цэны вырасьлі на 25%, і ўжо ў сьнежні ягоны заробак ператварыўся ў 450 тысяч рублёў. Чалавек пайшоў на рынак набыць якіх-небудзь імпартных, больш якасных і танных тавараў, аднак цэны на іх таксама падняліся, і ён са сваёй кішэні аплаціў павышэньне мытных пошлін. Рэшту заробку ён вырашыў абмяняць на замежную валюту, бо захацеў адкласьці грошы на адпачынак улетку. Але да канца году даляр падаражэў на 19%, і ягоны заробак ператварыўся ў 360 тысяч рублёў. У выніку чалавек лічыць сябе падманутым, бо ўвесь год ён выкладваўся на працы, разьлічваючы, што атрымае кошык тавараў на 600 тысяч, а атрымаў меншы, чым меў напачатку. І калі пэнсіянэрам дзяржава кампэнсуе інфляцыю, пэрыядычна падымаючы памер пэнсіі, каб захаваць іх ляяльнасьць, то наймальнік, часьцей за ўсё, цягам году гэтага ня робіць, бо мае на гэты час дамову з работнікам.

### Крэдыты лепшыя за даляры

Нават калі ўзяць афіцыйную статыстыку, то відавочна, што ў гэтай сытуацыі насельніцтву становіцца выгадным скупляць танныя даляры, але, зь іншага боку, становіцца складаней захаваць іх ад абясцэньваньня. Можна было б пакласьці іх у банк, але мясцовая банкаўская сыстэма не карыстаецца высокім даверам у насельніцтва. Значыць, застаецца набываць нерухомасьць, прадметы раскошы, паляпшаць стан наяўнага жытла і г.д. Стала выгадным браць крэдыты. Бо, нягледзячы на больш высокія працэнты на іх, чым у Польшчы і Літве, рэальны працэнт аказваецца ледзь нават ня меншым. Напрыклад, валютны крэдыт пад 12% гадавых на пакупку нерухомасьці ў гэтым годзе пры абясцэньваньні даляра на 9% трансфармаваўся ў рэальны 3%.

Найбольшае, што расчаравала ў 2004 годзе, — прамаруджваньне з уступленьнем Беларусі ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю. Беларусь пакуль не падпісала ніводнай дамовы зь дзяржавамі — чальцамі СГА і нават адстае ў перамоўным працэсе ад Расеі.

## Страсьці па Пілсудзкім

У сьнежні Польская амбасада зрабіла яшчэ адну спробу вывезьці зь Вялейшчыны валун Пілсудзкага. Першая, як памятаем, скончылася для іх паразай. Мясцовыя краязнаўцы тады перавезьлі камень у Вялейку, схавалі на тэрыторыі электрасетак.

Дзеля разьвязаньня пытаньня 21 сьнежня ў Вялейцы была склікана экспэртная нарада. Пасьля спрэчак было пацьверджана рашэньне пакінуць камень Пілсудзкага ў Вялейцы.

Была падтрымана думка галоўнага барацьбіта за камень Анатоля Рогача, які прапанаваў паставіць помнік ля будынку гарадзкога музэю. Камень зьявіцца на новым месцы ўвесну.

**Сяргей Макарэвіч, Вялейка**

## Шчасьлівы білецік

Галоўная бухгальтарка Полацкага гарвыканкаму Алена Вягіўская выйграла галоўны прыз лятарэі «Прыдзьвіньне-2» — аўтамабіль ВАЗ-2107. Жанчыне загадалі распаўсюджваць лятарэйныя білеты сярод работнікаў выканкаму. Ахвотных было мала, таму давялося выкупіць рэшту білетаў. Сярод іх і аказаўся шчасьлівы.

**Васіль Кроква, Полацак**

## Факсымільны крымінал

Супрацоўнік баранавіцкага інтэрнэт-клюбу раздрукаваў для сябе 10 000 рублёў на каляровай друкарцы. Ягоная маці, ня ведаючы пра гэта, узяла тую паперчыну ды разам зь іншымі грашыма панесла ў банк. Вынік вельмі сумны: жанчыну затрымалі, друкарку канфіскавалі, а на маладзёна завялі крымінальную справу.

## Мінусы Інтэрнэту

Блукаючы па сеціве ў баранавіцкай інтэрнэт-кавярні «Пункт», заежджы маскоўскі камэрсант так захапіўся, што не пачуў, як з кішэні курткі — яе павесіў на крэсла — выцягнулі 120 тыс. беларускіх і амаль 11 тыс. расейскіх рублёў. Злодзеяў пакуль не знайшлі.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Народная самаахова

Пры канцы 2003 г. урад прыняў пастанову аб стварэньні добраахвотных народных дружын. На сёньня ў Воршы на прадпрыемствах і ў буйных арганізацыях сфармаваны брыгады колькасьцю 300 чалавек. Зь Менску нават паступілі нагрудныя знакі ды пасьведчаньні.

Асноўная задача дружын — дапамога міліцыі ў падтрымцы парадку на вуліцах, дыскатэках, масавых мерапрыемствах. Відавочна, што вялікай колькасьцю міліцыянтаў ды байцоў унутраных войскаў справу аховы жыцьця і здароўя грамадзян вырашыць ніяк не ўдаецца.

## Із Сталіным у сэрцы

З падтрымкай пачыну расейскіх камуна-патрыётаў аб перайменаваньні Валгаграду ў Сталінград выступілі на старонках «Аршанскай газэты» асобныя вэтэраны вайны і пэнсіянэры. Напярэдадні сьвяткаваньня 60-годзьдзя перамогі, якую афіцыйная прапаганда (і ня толькі ў Беларусі) плянуе адпрацаваць на ўсе сто, зноў пачалі актыўна мусіраваць гэтую тэму. Мяркуючы па апошніх падзеях у Расеі, жаданьне апалягетаў Сталіна можа і спраўдзіцца.

## Гандаль — занятак прыбытковы

Адміністрацыйнай камісіяй пры Аршанскім гарвыканкаме звычайна разглядаецца каля 80 пратаколаў. Траціну зь іх складаюць матэрыялы аб парушэньні правілаў гандлю, якія паступаюць з гарадзкіх рынкаў. Збольшага гэта абважваньне ды продаж тавараў без сэртыфікатаў. Праўда, злоўленыя за руку гандляры асабліва не нэрвуюцца, хоць грашовыя пакараньні за ашукваньне спажыўцоў немалыя — ад 5 да 10 базавых велічынь (1 б.в. складае цяпер 24 тыс. руб.). Бывае, што адны і тыя ж людзі караюцца па некалькі разоў за месяц. Відаць, гандаль — досыць прыбытковы занятак.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Канстанцін Астроскі ў праекце

Праект помніка Канстанціну Астроскаму можна ўбачыць у гарадзкой выстаўнай зале на пэрсанальнай выставе скульптара Юр’я Палякова. Першапачаткова праект меўся знаходзіцца на выставе, прымеркаванай да ўгодкаў Аршанскай бітвы. Але з розных прычын выстава не адбылася. 50-гадовы скульптар і аўтар некалькіх памятных знакаў ды мэмарыяльных шыльдаў жыве і працуе пад Талачынам. Сярод яго твораў гарэльеф Караткевіча на аднайменнай вуліцы ў Воршы.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

## 100 гадоў Слуцкай бібліятэцы

Заснаваная стагодзьдзе таму, яна спачатку была чытальняй — такіх у Менскай губэрні налічвалася ўсяго шэсьць. А падчас апошняй вайны згарэла разам з усім скарбам (20 тыс. кніг), адрадзіўшыся толькі ў 1947-м.

Цяпер бібліятэка займае 4-павярховы будынак у самым цэнтры гораду, мае два філіялы ў мікрараёнах, а кніжны фонд налічвае 258 тыс. асобнікаў. Наведвае бібліятэку амаль кожны трэці случчак.

**Міхась Тычына, Слуцак**

## «Советскую Белоруссию» — на кожную фэрму

Адміністрацыя Жыткавіцкага раёну (Гомельшчына) загадала прадпрыемствам «падпісаць» вэтэранаў вайны на дзяржаўныя выданьні, а таксама забясьпечыць прысутнасьць гэтых газэт «у кожным цэху і на кожнай фэрме». На спэцыяльнай нарадзе з удзелам раённай адміністрацыі і кіраўнікоў прадпрыемстваў улады «выказалі заклапочанасьць» станам ведамаснай падпіскі на пэрыядычныя выданьні. Што азначае: усіх неадкладна нападпісваць.

Вось вынік: тыраж «Советской Белоруссии» вырас з 401 726 асобнікаў 31 сьнежня да 506 948 ас. 4 студзеня.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Папярэдне зацьверджаны праект адбудовы старое часткі сталіцы да 2020 году. Аляксандар Лукашэнка спыніў свой выбар на пляне інстытуту «Менскпраект». Паводле праекту, побач з Ратушай будзе адбудаваная рэнэсансная царква Сьвятога Духу.**

## МТС па-беларуску

На пачатку кастрычніка маладзёвая ініцыятыва «Вока» і Таварыства беларускай мовы абвесьцілі аб акцыі «МТС па-беларуску!». Быў распачаты збор подпісаў пад патрабаваньнем да МТС забясьпечыць доступ да аўтаматычнай службы сэрвісу абанэнта, ІССА, магчымасьці атрыманьня СМС-паведамленьняў на беларускай мове. І вось першыя вынікі акцыі: 31 сьнежня на афіцыйным сайце кампаніі зьявілася беларускамоўная вэрсія. Каардынатар кампаніі Віталь Дабранач кажа, што гэта «прыемны падарунак да Новага году, але гэта ня тое, чаго чакалі мы і абяцала кампанія. Бо такія функцыі як ІССА, форум і іншыя часткі сайту засталіся толькі на расейскай мове». Акцыю абяцаюць працягваць да поўнай беларусізацыі МТС. Калі вы жадаеце падтрымаць гэтую акцыю, прыходзьце на Румянцава, 13 у офіс ТБМ.

**МБ**

## Пэнсіянэр рамантуе палац

Шчучынскі пэнсіянэр Уладзімер Глаз дамогся рэканструкцыі Шчучынскага палацу князёў Друцкіх-Любецкіх. Помнік XVIII ст. стаяў разбураны, колісь у распараджэньні Міністэрства абароны СССР, потым на балянсе Шчучынскага РАПА. Апошні час будынак стаяў замкнёны і пачаў зусім занепадаць. Пэнсіянэр У.Глаз абышоў усе чыноўніцкія кабінэты, даводзячы, што неабходны рамонт будынку. У выніку ўлады адшкадавалі грошай на рамонт даху. Пэнсіянэр здолеў зацікавіць помнікам іншых людзей, якія набывалі матэрыялы для рамонту і за свае сродкі. Мясцовыя школьнікі зьбіраюць жалезьзе й макулатуру, каб заробленыя грошы перавесьці на адбудову. А У.Глаз тым часам шукае спонсараў за мяжой.

## Сацыяльная больніца

Першая на Гарадзеншчыне «сацыяльная» больніца працуе ў вёсцы Манцякі Зэльвенскага раёну. Больніца сястрынскага догляду састарэлых людзей розьніцца ад дамоў-інтэрнатаў тым, што яе жыхары могуць у кожны час пакінуць шпіталь. За знаходжаньне ў больніцы вылічваюцца грошы з пэнсіі, а даплачвае бюджэт.

Аддзяленьне сястрынскага догляду было пераведзена з Зэльвы ў Манцякі месяц таму, на базу былой мясцовай участковай больніцы. Сёньня ў Манцяках 28 пацыентаў, якіх абслугоўваюць 14 сацыяльных работнікаў. У больніцы ёсьць гарачая вада, але толькі адна ванна на ўсіх.

**Паводле «Газэты Слонімскай»**

# Суд на Каляды

Працяг са старонкі 3.

Нарэшце, прысуд: віну Марыніча ў незаконным захоўваньні агнястрэльнай зброі прызналі недаказанай. Але яго прызналі вінаватым у завалодваньні аргтэхнікай, якая была бязвыплатна перададзена ў часовае карыстаньне ўзначальванай ім арганізацыі «Беларуская асацыяцыя «Дзелавая ініцыятыва» — частка 4-я артыкулу 210 Крымінальнага кодэксу (крадзеж шляхам злоўжываньня службовымі паўнамоцтвамі, учынены групай, ці ў асабліва буйным памеры). У залі на сэкунду гасьне сьвятло. Марыніча прыгаворваюць да пяці год пазбаўленьня волі ў калёніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасьці. Кампутары ды аргтэхніку перадаюць яе ўладальніку — амбасадзе ЗША.

Суд пастанавіў спагнаць з Марыніча ў даход дзяржавы судовыя выдаткі ў памеры 8 405 руб.

## Абструкцыя ў судзе

«Прысуд зразумелы?» — пытаецца судзьдзя ў Марыніча, які моўчкі стаіць у клетцы, нібыта ня можа паверыць у тое, што адбываецца. «Тэрмін абскарджаньня зразумелы? Вам дазваляецца права азнаёміцца з пратаколам судовага пасяджэньня і агучыць заўвагі да яго. Гэта зразумела?» — глядзіць судзьдзя на Марыніча. І тут ён выбухае: «Гэта беспрадзел!» Судзьдзя і засядацелі пасьпешна сыходзяць пад крыкі «Ганьба!» ды сьвіст. «Вы ўсе будзеце ў чорным сьпісе невыязных!» — крычыць нехта. «Няхай жыве свабода! Свабода радзіме! Ад фашыстаў! Ад паразытаў!» — голасна заклікае Марыніч. «Трымайся!» — сьціскае кулак у паветры ягоны сын Павал.

Амапаўцы заглядаюць у залю праз дзьверы, але нічога ня робяць — класьці на падлогу журналістаў на вачах у паслоў не нармальна.

«Я веру, што моладзь Беларусі ацэніць усё гэта правільна! Украіна — прыклад! Гэтаму беспрадзелу паставіць ацэнку час. Трымайцеся! Не давайце ганьбіць нашу Бацькаўшчыну!» — не спыняецца Марыніч.

«Як вы ацэньваеце тое, што вас апраўдалі па адным з пунктаў?» — пасьпявае спытаць адзін з журналістаў. «Усё сфальшавана, але трэба ж было костку кінуць. Яны думаюць, што мы так будзем на касьцях і жыць. Не, ня будзем! Мы будзем змагацца за свабоду», — адказвае Марыніч.

Міліцыянт, немалады ўжо чалавек, са зьнякавелым выразам твару акуратна замыкае кайданкі на ягоных запясьцях.

## Чалавек і машына

У сваёй прамове Вера Страмкоўская назвала Марыніча «сапраўды вялікім чалавекам». Калі пакінуць у баку патаснае слова «вялікі», гэтая фраза не губляе сэнсу. Марыніч — чалавек. Нармальны, спакойны, людзкі — а гэта рэдкасьць для таго, хто ўсё жыцьцё працаваў у дзяржаўнай машыне. Былыя падначаленыя расказваюць, што Марыніч не любіў сварыцца — калі ён быў незадаволены, дык шматзначна маўчаў, і гэта дзейнічала лепш за гістэрыку. Тое, што яго й цяпер многія прыгадваюць добрым словам, не сакрэт. Марыніч ня паліць, ніколі не ўжывае мацюкоў, у яго спакойныя разумныя вочы.

Працэс стаўся апошнім папярэджаньнем ад рэжыму да намэнклятуры: не спрабуй рабіцца альтэрнатывай. Чакаць пасьля гэтага новых вылучэнцаў з уладнай сыстэмы на апазыцыйнае лідэрства наўрад ці варта.

Тэмпы росту валавой прадукцыі беларускай музыкі былі большыя за прагнозныя паказчыкі. Колькасьць выдадзеных дыскаў вырасла. Кліпаў зьнялі болей, чым у 2003-м. Год даў купу вынікаў.

# Беларуская музыка наступае на танках

## Альбом і сынгал году

Калі пазалеташняй асаблівасьцю была велізарная колькасьць відэакліпаў, то асноўнай прыкметай году 2004-га сталася павышэньне колькасьці выдадзеных дыскаў. Пры гэтым кліпаў зьнялі яшчэ болей, чым у 2003-м.

Калі раней найлепшы альбом выбіралі з трох-пяці кандыдатаў, то цяпер прэтэндэнтаў дзясятак: «Танкі» («Нэйра Дзюбэль»), «Паравоз каханьня» («WZ-orkiestra»), «Дні» («Індыга»), «Мой двор: вясельлі і пахаваньні» (Сярога), «Сем» («Троіца»), складанка «Генэралы айчыннага року»…

Наш выбар — за альбомам «Танкі». «Нэйра Дзюбэль» памяняў на трацiну склад і запісаў першую за сваю 15-гадовую гісторыю беларускамоўную праграму. «Танкі» цікавыя як музычна, так і ідэйна. Кулінковіч без кампрамісаў кажа, што галоўнае — не нарадзіцца тут, а тут памерці. З гарыччу сьмяецца з таго, што бусел ёсьць сэкс-сымбалем усёй Беларусі і з гонарам кажа «Беларусь — мая радзіма».

Атрымала большы распаўсюд такая піяр-форма, як сынгал, ці самотнік. Ў 2004-м упершыню зьявіліся такія цікавосткі, як відэасынгал («Безь білета» з «Лодачкамі»), інтэрнэт-сынгал («J-Морс» — «Сто дарог»), мультымэдыясынгал («Крамбамбуля» з «Радыё 0,33 FM»: песьні, размовы, мэлёдыі для мабільных, фота, флэш).



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ГЮНЭШ АБАСАВА ў 2004 годзе далучылася да «Крамбамбулі». На фота — з Аляксандрам Кулінковічам у часе каляднага выступу.**

## Падзея году

Пачатак 2003-га нам запомніўся дзесяцігодзьдзем «N.R.M.» — аднайменнай песьняй, «бэставай складанкай» і турнэ па Беларусі; красавік — «Генэраламі айчыннага року» ў Лядовым палацы; травень — трохдзёнымі «Таўкачыкамі», што сабралі ўвесь фолькмадэрн і выехалі за межы менскай кальцавой — у Любань.

У траўні ж дуэт "Аляксандра і Канстанцін" паехаў на «Эўрабачаньне-2004». Удзел беларусаў у буйным эўрапейскім поп-фэсьце можна лічыць падзеяй году, не зважаючы на месца, што яны там занялі.

З падзей другой паловы году — загад Мінінфармацыі павялічыць квоту на беларускую музыку ў FM-этэры да 75%, які мусіць выконвацца з 1 студзеня 2005. Пабачым, хто мае рацыю: радыйнікі, якія гавораць, што такія патрабаваньні — сьмерць для камэрцыйнага радыё ў Беларусі, ці тыя, хто кажа, што 75% пойдуць на карысьць усім.

## Тэндэнцыі

Першая — пашырыліся сувязі з суседняй Украінай. Летась беларускія гурты былі там частымі гасьцямі: Саша і Сірожа выступалі на канале «М-1», «Індыга» зьдзейсьніла міні-турнэ, даўшы там у сьнежні чатыры канцэрты, «Аляксандра і Канстанцін» з Русланай зайгралі на цэнтральным пляцы Львова, Вольскі з «N.R.M.» і «Крамбамбуляй» — на Майдане падчас Аранжавай рэвалюцыі, ну, а Сярогава папулярнасьць у паўднёвых суседзяў паступова пачынае дакатвацца і да Беларусі.

Другая тэндэнцыя — большае ўвагі да музычнай спадчыны. Выйшла кніга «Залатыя дыскі беларускага рок-н-ролу», рыхтуюцца да друку даведнікі «Сто беларускіх альбомаў… і ня толькі» і «Хто ёсьць хто ў беларускай музыцы». У 2004 г. убачылі сьвет на дысках легендарныя запісы — першыя тры альбомы «Ўлісу», ангельскамоўны альбом «Крамы» «Гарэлка in ice». Насьпела патрэба якасна выдаць запісы «Бонды» і «Мясцовага часу».

## Адкрыцьцё

У другой палове 2004 г. стрэльнула «Індыга». Руся са сваёй камандай упэўнена рушыць у вышэйшыя рок-эшалён і рыхтуе налета адразу тры праекты.

Хлопцы зь «Iq-48» на працягу году запісвалі рэп-коравы альбом (выйдзе ў лютым) і зрабілі з Аляксандрам Памідоравым яскравую песьню — «Выйсьце». Пасьля разьвітаньня са сваім ідэолягам Фройдам гурт ня згас, а яшчэ болей распаліўся.

## Песьня

Маркуючы па галасаваньнях у гіт-парадах, народ хіліцца да пазытыўных твораў. Наведнікі інтэрнэтаўскага гіт-параду «Тузін гітоў» прызналі найлепшай песьняй сэзону 2003/04 жыццярадаснае «Люблю» «Крамбамбулі». Сярод лідэраў — яе ж «Турысты», рок-н-рол «Баба Лена» ў выкананьні Варашкевіча.

Лідэры другой паловы году — «Жыцьцё» Кулінковіча, ужо згаданае «Выйсьце», «Ду-ду да-да» — пазытыўны твор ад «AiK».

Сярод расейскамоўных песень па-за канкурэнцыяй «Чорны бумэр» Сярогі — яе падхапілі ня столькі ў Беларусі, колькі ў Кіеве і Данецку, Піцеры і Маскве. Сярод мясцовых папсавікоў вылучым Хлястова («Мара мая»), Плотнікаву («Дзесьці») і Дарафееву («Човен»).

## Кліп

У 2004-м зноў пастаўлены рэкорд па вытворчасьці музычнага відэа на Беларусі. Пазалетась было зьнята крыху больш за 40 кліпаў, летась — звыш 50-ці. Рэжысэры пачалі запрашаць сапраўдных акцёраў (Зелянкоўская ў дэбютным кліпе «Атлянтыкі», Кот у кліпе «Цягні-Штурхай»), прадусары — укладаць вялікія грошы ў карцінку. Праўда, самы дарагі кліп году «Паштальёны» («Ляпіс Трубяцкой») свайго бюджэту — каля 50 тыс. даляраў — не апраўдаў. Сярод посьпехаў — маляваны шэраг да «Ішла далей» («Безь білета»), які ўзяў удзел у анімацыйным фэсьце ў Галяндыі.

У сэнсе відэа можна вылучыць «За табой» Сяргея Кавалёва і «3000 крокаў» («Цягні-Штурхай»), але гэта ня той выпадак, калі песьня і карцінка гарманічна ўзаемадапаўняюцца.

## Правалы і скандалы

Адно з расчараваньняў году — няўдалая спроба актывізаваць беларускі рэп. Складанка пад назвай «Пасадзіў дзед РЭПку» і канцэрт з гэтае нагоды прайшлі бясплённа, выявіўшы нават ня штучнасьць задумы, а хіласьць званага кірунку ў межах Беларусі.

Ня выявілі сябе патэнцыйныя «праекты году». Такія, напрыклад, як «Руны» з Іванам Кірчуком. Ідэя «Рунаў» палягала ў нетрадыцыйным выкананьні беларускіх народных сьпеваў ды іх яскравым сцэнічным увасабленьні. Разьлік — на Расею, адкуль, уласна, тая ідэя і прыйшла. Зацікаўленасьць з расейскага боку некуды зьнікла, адпаведна зьніклі і грошы, і фундатары праекту, таму ён вымушана згарнуўся.

Прэтэндэнтаў на ролю бурбалкі году, у прынцыпе, хапае і бяз «Рунаў». Гучную заяву на пачатку году зрабіла група «Тэзаўрус», саманазваўшыся «выбуховым дэбютам-2004». Але такім слоганам яны і запомніліся.

Пакуль не варушыцца «Тарпач» — ляўрэат «Басовішча-2004». Будзем спадзявацца, што яны стрэляць, як і «Індыга», налета пасьля свайго ляўрэацтва.

Ня самы пасьяховы год і для прадстаўнікоў поп-рок-плыні. Цікавасьць да творчасьці груп «Стокс», «Нэо», «Стэрэатыпы» згасла, а супольны канцэрт гэтых гуртоў прайшоў без гледачоў…

Самы гучны скандал 2004 г. выклікалі словы А.Лукашэнкі пасьля палітычна-музычнай акцыі 21 ліпеня пра «дзюбэляў і палацы». Гэта ўскладніла жыцьцё некаторым музыкам. «Палац» пазбавілі працы ў «Белканцэрце», Памідорава пагналі з СТВ, а дзяржаўныя СМІ абвесьцілі байкот усім удзельнікам таго канцэрту. Беларускія музыкі адгукнуліся стварэньнем сваёй Уніі і выданьнем дыску «БУМэранг».

У траўні быў створаны прэцэндэнт у справе распаўсюду музыкі ў Сеціве ў фармаце mp3. РУПІУ дамогся сымбалічнага пакараньня (3 базавыя велічыні штрафу) стваральніка неафіцыйнага сайту «Песьняроў» Хведара Караленкі. Судзьдзя доўга не магла дапяць, што за mp3 такое, аднак часткова віну Караленкі прызнала.

Гэты год запомніцца таксама сьмерцю Васіля Шугалея — культавага панк-музыкі і паэта.

## Поп-прарыў

Яшчэ адна яскравая тэндэнцыя — беларуская поп-музыка летась выйшла за межы ДК МТЗ. Ялфімаў выявіў напоўніцу свой талент на «Славянскім базары», «AiK» выступілі на «Эўрабачаньні», Алехна — у фінале «Народнага артыста», Падольская — на «Фабрыцы зорак». А хто там ідзе?..

**Сяргей Будкін**

# Паравоз каханьня



Зьміцер Вайцюшкевіч і Рыгор Барадулін, «Вэст-рэкардз», 2004

Сумесны прадукт Музыкі і Паэта. Альбом выкліча ў слухача цэлую гаму пачуцьцяў — ад замілаваньня да зьдзіўленьня. Клясык чытае вершы перад песьнямі («І валун можа закахацца, і ў крутых миразоў сэрца ёсьць...»), музыкант дапаўняе вершы ня менш трапнымі музычнымі вобразамі. Героі — пасажыры гэтага «паравоза каханьня» — Арыстакратка каханьня, Гаспадыня зорнага палацу, Пані «трошкі ў гадах» — увасабляюцца па-рознаму ў музычным пляне. Вайцюшкевіч ахвяраваў музычнай цэласнасьцю дзеля музычнай разнастайнасьці. Часам падыход да паэзіі Барадуліна вельмі сьмелы, як у песьні «SOS» — сапраўдным рокавым творы з паўнавартаснай рытм-сэкцыяй. Апраўданы такі крок ці не — вырашаць слухачу. Традыцыі гарадзкога шансону, распачатыя «Паравінамі», і тут маюць свой працяг («Актрыса», «Вясновы дзень»). Знаходзіцца ў «Паравозе» месца і баладнасьці («Пані», «Чакаю»), і псыхадэлу («Я ўсё сваё жыцьцё»).

У прадмове да дыску Ўладзімер Някляеў кажа, што «старэйшына беларускай паэзіі і маладзён беларускай музыкі... напісалі песьні, якія можна сьпяваць у цягніках». Можа, які рамантычны юнак і зацягне: «Мы не сустрэнемся, як астравы, спагады зорка не ўзышла над намі...» — але здарыцца такое можа толькі ў Паравозе Каханьня.

Адзнака: 9 (з 10).

# Вялікае калі ласка



«P.L.A.N.», «БМА-груп», 2004

Чарговы альбом ад айчынных блюзмэнаў, якія запісваюць па два альбомы на год. Пры гэтым ад першага («Блюз у канцы тунэлю») да апошняга прагрэс адчувальны. Аснова альбома — клясычныя блюзы і рок-н-ролы з простымі тэкстамі, ня надта сэнсава абцяжараныя. З посьпехаў — «грамадзянскі» блюз «Вялікае калі ласка», акустычныя «Ранішнія адчуваньні» і ўжо досыць вядомая «Шынкарачка». Цікавыя, як для азнаямленьня, хіп-хопавыя экспэрымэнты Плясанава са сваёй дачкой («Пасадзіў дзед рэпку») і былым ідэолагам «IQ-48» Фройдам («Новая купалінка»).

Цікава, што «P.L.A.N.» існуе толькі тры гады, хоць агулам удзельнікі каманды прабавілі ў музыцы не адно дзесяцігодзьдзе, а лідэр каманды Андрэй Плясанаў належыць да «першага пакаленьня беларускага року» — 1960-х (тады ён іграў у гурце «Пінгвіны»). Аднак пакінуў свае сьляды ня толькі ў музычнай сфэры, але ў кіно і ў жывапісе. Плясанаў колькі год працаваў на «Беларусьфільме» (быў сурэжысэрам культавага «Мяне завуць Арлекіна»), потым заняўся жывапісам і яго-ная праца трапіла ў нідэрляндзкі каталёг найлепшых мастакоў сьвету канца XX ст.

Адзнака: 7 (з 10).

**СБ**

# Арлоў і Бартосік у горадзе белай ночы

Уладзімер Арлоў прыехаў у Бялынічы на наступны дзень пасьля менскай прэзэнтацыі «Каханка яе вялікасьці» — 18 сьнежня. Тутэйшыя жартаўліва называюць райцэнтар White Night City.

Разам зь пісьменьнікам нябліскі шлях — 200 км — пераадолеў і Зьміцер Бартосік. Ён і адкрыў творчую сустрэчу ў мастацкім музэі: выконваў баляды, жартоўныя песьні, чытаў урыўкі са свайго «Чорнага пісталета». Слухачы найбольш упадабалі гісторыю пра немца, які наведаў беларускую правінцыю ў сярэдзіне 1990-х.

Арлоў адразу заінтрыгаваў прысутных, распавёўшы, што інтэрас да гісторыі прачнуўся пасьля таго, як ён яшчэ юнаком выпадкова праглынуў манэту з выявай Жыгімонта Аўгуста. Пісьменьнік дзяліўся ўражаньнямі ад першага каханьня, а вершам пра грудкі нават засмуціў дзяўчатак-школьніц. Праўда, пры канцы сустрэчы адна зь іх асьмелілася і папрасіла новую кнігу пісьменьніка для школьнага музэю, дзе ёсьць «куток Арлова».

Ахвотныя набывалі кнігі, у тым ліку «Краіну Беларусь». Пісьменьнік падкрэсьліў, што гэтай кнігай можна ўдарыць па галаве таго, хто па яе прачытаньні так і не прасякнецца беларускай гісторыяй. Жартаваў, вядома.

**Сяргей Будкін**

# Студзень

**1** — Новы год.

**3** — 150 гадоў з дня сьмерці выдаўца й пісьменьніка Антона Марціноўскага; рэдактара сатырычнага часопісу «Бруковыя ведамасьці», газэты «Літоўскі кур'ер», першага ў Беларусі і Літве навукова-літаратурнага часопісу «Віленскі дзёньнік».

**3** — 100 гадоў з дня нараджэньня паэта Ўладзімера Хадыкі (1905—1940), закатаванага саветамі.

**6** — Сьвята Трох каралёў у каталікоў.

**7** — Нараджэньне Хрыстова ў праваслаўных.

**9** — 100 гадоў з «Крывавай нядзелі» ў Пецярбургу.

**10** — 100 гадоў з дня нараджэньня афтальмоляга-акадэміка Тамары Бірыч (1905—1993).

**10** — 75 гадоў з дня нараджэньня хіміка-акадэміка Хведара Капуцкага.

**19** — Вадохрышча ў праваслаўных.

**20** — 100 гадоў з дня нараджэньня перакладчыка, выдаўца Яна Пятроўскага, які ўклаў і выдаў «Клясычны грэцка-беларускі слоўнік», перакладаў старажытнагрэцкіх філёзафаў.

**21** — 75 гадоў з дня нараджэньня легендарнага дыктара Ўладзімера Шэліхіна (1930—2002).

**23** — 100 гадоў з дня нараджэньня польскага паэта Канстантыя Ільдэфонса Галчынскага. У сваіх вершах пісаў пра міжваенную Вільню.

**25** — 75 гадоў з дня нараджэньня акадэміка-машынабудаўніка Віктара Чачына. 50 гадоў з дня нараджэньня Аляксандра Лакоткі (1955, Дзятл. р-н), архітэктара, рэстаўратара драўлянай архітэктуры.

**26** — 225 гадоў з дня нараджэньня мастака Яна Дамеля.

**31** — 75 гадоў з дня сьмерці заоляга й прыродазнаўца Бэнэдыкта Дыбоўскага. За ўдзел у паўстаньні Каліноўскага быў сасланы ў Сібір, дзе заняўся вывучэньнем прыроды Байкалу і басэйну ракі Амур. Потым вярнуўся на радзіму, вывучаў беларускія азёры, пісаў працы па біялёгіі, антрапалёгіі і этнаграфіі.

**75** гадоў таму, у студзені 1930 г., быў заснаваны часопіс «Беларусь».

# Легендарная кніжка

*Яе гісторыя нагадвае лёсы цяперашніх падпольных выданьняў.*



Зборнік «Пес'ні» — менавіта такое яго тагачаснае графічнае напісаньне, — першая беларуская кніга XX ст., выйшаў 100 гадоў таму, пад Каляды 1904-га. Гісторыя «Пес'няў» загадкавая.

Асноўны зьмест яго складаюць творы Багушэвіча. Адвольнасьць выбару мэтанакіраваная. Пачынаецца зборнік зь вершу «Дурны мужык, як варона». Затым ідуць «Як праўды шукаць», «У судзе», «Бог ня роўна дзеле», «Свая зямля». Яшчэ пры канцы зборніка зьмешчаны вершы Цёткі і Каруся Каганца. Спрэс будучыя клясыкі.

Зборнік надрукаваны на танюсенькай бялюсенькай папяроснай паперы. Яна аж сьвіціцца. На авантытульнай старонцы пазначана: «Дазволена цэнзураю». СПБ. 17 декабря 1903 г.». Ніжэй яшчэ адна паметка: «Пес'ні» друкаваліся ў сынадальнай друкарні. Той, хто ведае, зь якім боем прабівалася беларуская кніжка ў сьвет, тую памету адразу палічыць за дзёрзкасьць. А так і ёсьць! Выдаўцы зрабілі выклік: сынадальная друкарня — гэта вам не абы-што. Сынод — найвышэйшая праваслаўная царкоўная ўстанова. Так што, панове, купляйце беларускую кніжку сьмела. Сам сынод ведае пра яе! Насамрэч надрукаваць вальнадумскую кніжыцу ў легальнай друкарні было немагчыма. Толькі праз год, у 1905-м, будзе зьнята забарона зь беларускай мовы.

Вядома, аўтарства вершаў у зборніку не пазначана.

Як сьведчаць абвесткі «Нашай долі», у верасьні 1906 г. згаданы зборнік прадаваўся віленскай літоўскай кнігарняй Марыі Пясецкай-Шляпэліс. Ад 1907 г. «Песьні» ня згадваюцца ў сьпісах наяўнай літаратуры. Ці то прадалі, ці канфіскавалі. У трэцім нумары «Нашае Долі» паведамлялася праператрус у той кнігарні. З канца 1906 г. пачалася пара канфіскацыяў беларускіх кніжак.

У Нацыянальнай бібліятэцы ёсьць два асобнікі «Пес'няў». Зборнік адметны яшчэ і тым, што гэта была першая спроба выдаць Багушэвічавы творы кірыліцай (паэт пісаў лацінкай).

Набліжаўся 1905 год, і зборнік «Пес'ні» працаваў на новы час.

**Уладзімер Содаль**

НАВІНЫ

## Альбом Дарафеевай

14 беларускамоўных песень Ірына Дарафеева сабрала ў альбом «Каханачка». Ён записаны пад акампанэмэнт Прэзыдэнцкага аркестру.

## Ельскі ў «Кнігазборы»

Кніга Аляксандра Ельскага «Выбранае» стала 30-м томам залатой сэрыі «Беларускага кнігазбору». А ў сэрыі «Бібліятэка Бацькаўшчыны» ёсьць аж дзьве грунтоўныя навінкі: салідныя працы «Беларусы ў бітве за Монтэ-Касіна», укладзеная Юрем Грыбоўскім, і «Беларусы ў Аўстраліі. Да гісторыі дыяспары» Натальлі Гардзіенкі.

## Птушкі, зьвяры, расьліны

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусьціла першыя тры кнігі новае дзіцячае сэрыі «Зямля мая» — «Птушкі», «Зьвяры» й «Расьліны». Усё з ілюстрацыямі і па-беларуску.

## У тэатрах клясыка

Доля пастановак паводле п'есаў клясыкаў у 2004 г. вырасла да 30%. У 2003 г. яны складалі толькі 15%. Запаўняльнасьць заляў была ў сярэднім 73%. Усяго пастаўлена 97 новых спэктакляў. Для параўнаньня: у 2003-м — 92.

## Геві-мэтал-Бах

Гітарыст Віктар Смольскі, сын прафэсара Акадэміі музыкі Зьмітра Смольскага, выпусьціў сольны альбом «Majesty&Passion». Музыка пяць гадоў іграе ў нямецкім гурце «Rage». У сольніку ж ён апрацаваў у стылі геві-мэтал спадчыну Баха — сюіты і фрагмэнты з канцэртаў для скрыпкі з аркестрам. «Мэталёвую» гітару дапаўняе сымфанічны аркестар.

## Гадзіньнік у кнігу Гінэса

Гарадзенскія ўлады падалі заяўку на занясеньне гадзіньніка на Фарным касьцёле ў беларускую кнігу рэкордаў — як найстарэйшага зь дзейных вежавых гадзіньнікаў Эўропы. Аснова мэханізму захавалася з XVI ст. У 1992—1997 г. гадзіньнік быў канчаткова аднаўлены: цяпер ён адбівае нават чвэрці гадзіны.

## «Atlantica» пішацца ў Швэцыі

Гурт «Atlantica» рыхтуе свой дэбютны дыск у Швэцыі. «У Расеі запісаць было б лацьвей, але лепшыя расейскія студыі не параўнаюцца з швэдзкай», — кажа сьпявак Алекс. Дыск выйдзе ў лютым.

## Немцы слухаюць сваё

Бундэстаг прыняў закон, згодна зь якім 35% часу радыёстанцыі павінны аддаваць айчыннай музыцы. Закон падтрымалі вядомыя музыкі. Немцы змагаюцца з панаваньнем англамоўнай музыкі, беручы за прыклад краіны, дзе такія нормы ўжо ўведзены, — Францыю, Швайцарыю, Польшчу.

## Потэр-6

Джаан Роўлінг скончыла працу над шостай кнігай пра Гары Потэра. Выхад кнігі плянуецца на пачатак лета.

## Няма Зонтаг

У 71 год памерла амэрыканская пісьменьніца Сьюзан Зонтаг. Апошнія 29 гадоў яна змагалася з ракам, які атакаваў яе то ў адной, то ў другой праяве. Яна стала вядомая сваім пратэстам супраць вайны ў Віетнаме, у 1980-м падтрымлівала польскую «Салідарнасьць». У 1993 г. у абложаным Сараеве паставіла пры сьвечках «У чаканьні Гадо». На старыя гады Зонтаг адмовілася ад пацыфізму й падтрымала інтэрвэнцыю NATO ў Косаве. Разам з Ванэсай Рэдгрэйв бараніла Ахмэда Закаева. Апошні яе артыкул — «Пра катаваньні іншых» — прысьвечаны скандалу ў турме Абу-Грэйб. Яе найзначнейшае эсэ «Пра фатаграфію» друкавалася ў «Arche».

## Адраджэньне «Queen»

Легендарны гурт «Queen» адродзіцца з новым вакалістам. Першы канцэрт дадуць у ПАР па пэрсанальным запрашэньні Нэльсана Мандэлы. Усе сродкі ад канцэрту пойдуць у фонд барацьбы са СНІДам. Падчас свайго сусьветнага турнэ гурт мае даць некалькі канцэртаў у Цэнтральнай Эўропе.

**АВ, СБ; БелаПАН, Gazeta.pl**

# Спрэчка аб сьвятой зямлі

Ці можна аб'ектыўна напісаць пра нейкі канфлікт, тым больш калі ў аснове ляжаць рэлігійныя спрэчкі? Тым больш палестынскі. Ёсьць два дыямэтральна супрацьлеглыя погляды на палестынскі канфлікт.

Першы: Палестына — гэта другая назва Ізраілю і яна можа належаць толькі габрэйскаму народу. Ён ніколі не забываў на гэта і зашмат пакутаваў, каб проста так адрачыся Палестыны. А сёньняшнія палестынцы — не народ, а зграя тэрарыстаў, спансараваная арабскімі шэйхамі.

Другі: Палестына ніколі не была краінай толькі габрэяў, аб чым гаворыць сама назва, якая паходзіць ад найменьня філістымлян (старажытнага народу). А сёньняшнія габрэі з Эўропы і Амэрыкі — гэта эўрапейскія каланізатары, і іх дзяржаву чакае лёс усіх каляніяльных утварэньняў.

Гэта крайнія погляды, але яны даволі трапна перадаюць сутнасьць канфлікту.

Адкуль ён бярэ пачатак? Ад айца Аўрама зь ягонымі сынамі Ісакам і Ісмаілам? Ад цара Ірада, які выкарыстоўваў арабаў супраць сваіх падданых? Ад Мухамэда, якога юдэі не прызналі Мэсіяй?

Пачнём з таго, што мае да пытаньня непасрэднае дачыненьне.

Сіянізм прынята зьвязваць зь імем Тэадора Герцля (1860—1904). Бацька сіянізму паходзіў з Аўстрыйскай імпэрыі, дзе асыміляцыя габрэяў зайшла найбольш далёка. Гэта аднак ня зьменшыла вастрыні габрэйскага пытаньня. Меншасьці былі незадаволены тым, што габрэі далучаюцца да пануючых нацый — немцаў, вугорцаў, палякаў (у адной аповесьці І.Франка герой задае пытаньне, чаму ёсьць габрэі — расейцы, палякі і «*...няма габрэяў славакаў, русінаў?*»). Апошнія тры баяліся за чысьціню сваёй крыві.

Назіраючы за гэтымі тэндэнцыямі, а таксама за антысэмітызмам у іншых краінах, Герцаль прыйшоў да высновы, што паратунак для габрэяў — у стварэньні сваёй дзяржавы. Такія праекты існавалі і да Герцля, але менавіта ён абвясьціў дзяржавабудаўніцтва галоўнай габрэйскай задачай.

Тым ня менш сіянізм выклікаў спрэчкі сярод габрэяў. Супраць Герцля выступілі артадаксальныя юдаісты, абураныя тым, што нявеpуючы ўзяў на сябе функцыю мэсіі; асыміляцыяністы, якія лічылі, што будучыня габрэяў у краінах, дзе яны жывуць; бундаўцы, якія адстойвалі праграму культурнай аўтаноміі, запазычанай у аўстрыйскіх сацыялістаў.

Аўтаномію спрабавалі ажыцьцявіць у БССР, дзе дзеячы Бунду ўваходзілі ў вышэйшыя органы ўлады, а ідыш быў адной зь дзяржаўных моў. Сьцьвярджалася, што савецкая ўлада стварыла спрыяльныя ўмовы для разьвіцьця габрэйскай культуры на аснове не нерэакцыйных, г.зн. нерэлігійных, традыцый, і алія (вяртаньне ў Палестыну) ужо непатрэбна. І гэтаму верылі. Міхась Чарот укладаў у вусны героя сваёй паэмы «Карчма» Шлёмы наступныя словы: «О, я цяпер вольны! І нашто мне цяпер Палестына?»

Але Сталін вынішчаў бундацаў,



AP

Махмуд Абас, пераемнік Арафата, часовы кіраўнік Палестынскае аўтаноміі.

Гітлер — асыміляцыяністаў і абодва — юдаістаў. У выніку сіяністы атрымалі моцныя аргумэнты на сваю карысьць.

У той жа час з самага пачатку выявілася ўтапічнасьць герцлеўскага лёзунгу «Народу безь зямлі — зямлю без народу». Т.Герцль, будучы нерэлігійным габрэем, не лічыў спачатку такой зямлёй менавіта Палестыну. Акрамя яе ў якасьці месца для будучай дзяржавы ён называў таксама Афрыку, Паўднёвую Амэрыку.

Лідэр радыкальных сіяністаў, пісьменьнік Уладзімер Жабацінскі (1880—1940) пісаў: «Арабы ніколі не саступяць нам, бо яны ня зброд, а народ». Таму, на думку Жабацінскага, габрэі таксама не павінны саступаць арабам.

Жабацінскі сфармуляваў асноўныя прынцыпы ізраільскай палітыкі: габрэйская дзяржава абапал Ярдану, размова з арабамі толькі з пазыцыі сілы. З супрацьлеглага боку «ястрабам» быў муфтый ерусалімскі Хаджы-Амін аль-Хусэйні, сваяк па матчынай лініі Ясіра Арафата. Ягоныя палкія казаньні прыводзілі да выразаньня яўрэяў у Ерусаліме, а мэтамі былі вытурваньне з Палестыны габрэяў і брытанцаў ды стварэньне там арабскай дзяржавы. І дзеля гэтага ён пайшоў у 1936 г. на кантакт з гітлераўскай Нямеччынай, а ў 1941 г. нават перабраўся ў Бэрлін, дзе браў удзел у стварэньні мусульманскіх дывізій СС (пераважна з басьнійцаў) і распрацоўцы плянаў «канчатковага вырашэньня» габрэйскага пытаньня. Нацысцкія канцлягеры і мэтады вынішчэньня габрэяў прыводзілі муфтыя ў захапленьне. Толькі зацікаўленасьць нацыстаў у арабскім нацыяналізьме выратавала муфтыя ад статусу ваеннага злачынцы (ён нейкі час знаходзіўся ў Францыі пад хатнім арыштам), аднак ягоная галоўная мара — арабская дзяржава ў Палестыне — ажыцьцёўлена не была.

Стварэньне арабскай дзяржавы не было ажыцьцёўлена найперш якраз праз супраціў іншых арабскіх дзяржаў, што хацелі павялічыць сваю тэрыторыю за кошт «сьвятой зямлі». Такім чынам, казаць, што палестынскі рух створаны арабскімі ўрадамі, не зусім правільна. Падтрымліваючы антыізраільскія акцыі палестынскіх бежанцаў, яны не хацелі зьвязваць сябе абавязкамі на будучыню. Толькі палітычны крызіс у арабскіх краінах пасьля паразы ў «шасьцідзённай вайне» дазволіў палестынцам выступіць як самастойнай палітычнай сіле. Менавіта тады быў утвораны рух Арафата, а цяпер Абаса «Фатх», а неўзабаве за кошт далучэньня больш дробных палітычных утварэньняў — Арганізацыя вызваленьня Палестыны. Палестынскі рух узьнікаў як левадыкальны, таму ў супрацьвагу Арафату Захад пачаў таемна спрыяць ісламістам, таму ж Хамасу. Зьмена «чырвонай пагрозы» на «зялёную» прымусіла пайсьці на перамовы з Арафатам. Аднак спадзевы, што Нобэлеўская прэмія міру 1994 г. Арафату, Пэрэсу ды Рабіну пакладзе канец канфлікту, былі марнымі.

Што далей? Ці апошнія падзеі — сыход Арафата, адмова Шарона ад будаўніцтва паселішчаў — палепшаць сытуацыю? Пакуль усё паказвае на адваротнае. Дый ці магчыма талерантнасьць там, дзе прысутнічае рэлігійны канфлікт? Ад адказу на гэтае пытаньне залежыць усё астатняе.

**Усяслаў Шатэрнік**

# Новы балканскі трубаправод

Прадстаўнікі ўрадаў Баўгарыі, Македоніі і Альбаніі падпісалі дамову пра будаўніцтва трансбалканскага нафтаправоду. Па ім пацячэ касьпійская нафта.



**СЯРЖУК ВІНАГРАДАЎ**

Транспарт касьпійскай нафты і падтрымка празаходніх памкненьняў ва ўсходняй і паўднёва-ўсходняй Эўропе і на Каўказе — прыярытэт замежнапалітычнай стратэгіі Захаду.

Нафтаправод АМВО злучыць чарнаморскі порт Бургас у Баўгарыі і альбанскі порт Влёра на Адрыятыцы. Работы па будаўніцтве лініі даўжынёй 912 км мяркуецца пачаць сёлета і завяршыць праз тры-чатыры гады. Выконваць праект будзе брытанска-амэрыканскі кансорцыюм.

Нягледзячы на нестабільныя рынкавыя цэны, нафта і надалей застаецца галоўным энэрганосьбітам у сусьветнай эканоміцы. На думку экспэртаў АПЭК, доля нафты ў сусьветным энэргазабесьпячэньні застанецца да 2020 году на ўзроўні каля 40%, а разьведаных на сёньня запасаў нафты ў сьвеце мусіць хапіць на 80—100 гадоў. Выглядае, што і ў найбліжэйшы час важная роля належыць распрацоўцы новых нафтавых радовішчаў, пракладваньню транспартных ліній да іх і дапамозе нафтаздабыўным і транзытным краінам у разьвіцьці дэмакратычных і сацыяльных структур.

Адным з самых шматабяцальных нафтавых рэгіёнаў сьвету зьяўляецца рэгіён вакол Каспійскага мора з істотнымі запасамі нафты ў Казахстане і Азэрбайджане. Толькі казахстанскае радовішча ў Кашагане пераўзыходзіць сваім аб'ёмам усе паклады Паўночнага мора. Такім чынам, арганізацыя транспартаваньня касьпійскай нафты і падтрымка празаходніх памкненьняў у краінах усходняе і паўднёва-ўсходняе Эўропы і Каўказу выйшла на першы плян замежнапалітычнай стратэгіі Захаду.

З прычыны нястачы праходных магчымасьцяў у Басфорскім праліве было распачата праектаваньне трубаправодаў у абход Басфору. У праектах галоўную ролю адыгрывае амэрыканскі капітал і падтрымка амэрыканскага ўраду, варта найперш прыгадаць нафтаправод Баку—Джэйхан праз Азэрбайджан, Грузію і Турцыю. У якасьці дадатковых шляхоў злучэньня разглядаліся АМВО і, з другога боку, расейска-баўгарска-грэцкі праект трубаправоднага злучэньня Бургасу з грэцкім Александрупалісам. Паміж двума праектамі разгарнулася барацьба за палітычнае прызнаньне і інвэстыцыі. Пры гэтым падзеі вакол «Юкасу» і ўзмацненьне аўтарытарнага стылю кіраваньня ў расейскай эканоміцы спрычыніліся да падрыву даверу да Расеі з боку заходніх інвэстараў. Як выглядае, пераможцам у канкурэнтнай барацьбе выйшаў АМВО. Пачатак рэалізацыі АМВО — таксама вялікі дзелавы посьпех амэрыканскіх і брытанскіх нафтавых канцэрнаў, якія канкуруюць з эўрапейскім гігантам «Total'-Fina-Elf» у асваеньні нафтавых радовішчаў Касьпію.

Яшчэ з часоў адміністрацыі Клінтана амэрыканскі ўрад надаваў шмат увагі палітычнай стабілізацыі і пабудове дэмакратыі на паўднёвым усходзе Эўропы. Так, у паўднёвым Косаве была пабудавана ваенная база «Camp Bondsteel» — найбуйнейшы праект такога кшталту з часоў вайны ў Віетнаме. Падтрымка празаходніх дэмакратычных урадаў у Турцыі, Баўгарыі, Македоніі, Альбаніі і, далей па Каўказе, у Грузіі мела на мэце даць гэтым краінам пэрспэктыву ўваходжаньня ў паўночнаатлянтычныя структуры (у першую чаргу — NATO) і такім чынам дазволіць ім зрабіцца часткай заходняе цывілізацыі.

Пачатак ажыцьцяўленьня праекту АМВО азначае далейшае ўмацаваньне амэрыканскага ўплыву на ўсходзе і паўднёвым усходзе Эўропы. У той жа час Расея, якая дзякуючы рэлігійным і этнічным сувязям гістарычна мела сымпатыі сярод балканскіх краін, паступова траціць свае пазыцыі.

Дывэрсыфікацыя крыніц нафтавых паставак і транспартаваньня робіць краіны — спажыўцы нафты менш залежнымі ад сыравінных гігантаў накшталт Расеі і АПЭК. Большая гнуткасьць у энэргетычнай палітыцы робіць нафтавы кран менш верагодным інструмэнтам палітычнага ціску і павышае шанцы невялікіх краін на незалежнасьць і дэмакратыю.

Пачатак рэалізацыі праекту АМВО — дрэнная навіна для ўрадаў — аматараў нафтавага і газавага шантажу і добрая навіна для прыхільнікаў дэмакратыі ды стабільнасьці ва Ўсходняй Эўропе.

## Манэргейм — самы выбітны фін

У Фінляндыі прайшло нацыянальнае апытаньне «Самы славуты фін у гісторыі». Наперадзе чакана апынуўся дзяржаўны вайсковы дзеяч, барон Карл Густаў Манэргейм. 105 тысяч слухачоў нацыянальнага радыё патэлефанавалі і назвалі гэтага прадстаўніка швэдзкага арыстакратычнага роду, які да канца жыцьця размаўляў і пісаў па-фінску з памылкамі, найвялікшым сваім суайчыньнікам.

Генэралу расейскай арміі, удзельніку расейска-японскай і Першай сусьветнай вайны, этнографу Манэргейму было наканавана стаць адным з творцаў фінскай дзяржавы. Дзякуючы яму краіна двойчы адбілася ад савецкай навалы (у 1940 і 1944) і захавала незалежнасьць. Фіны адзначылі таксама, што дзякуючы Манэргейму ў краіне была пабудавана ўзорная дэмакратычная сыстэма і нацыянальная палітыка. Супраць Саветаў у фінскіх атрадах біліся прадстаўнікі ўсіх нацыянальных меншасьцяў. Найбольш вядомыя сярод іх — расейскі полк і габрэйскі батальён з уласнымі камандзірамі ды сьвятарамі. Нават нямецкія дарадцы зьмірыліся з апошнім фактам і вымушаны былі інспэктаваць габрэйскі зьвяз. Дарэчы, у пачатку ХХ ст. Манэргейм служыў на Падляшшы, тут атрымаў званьне генэрала ды пасябраваў з Радзівіламі.

Днямі ў менскім выдавецтве «Колас» выйшла біяграфія К.Г.Манэргейма ў перакладзе на беларускую Якуба Лапаткі.

Другое месца ў рэйтынгу (80 тысяч тэлефанаваньняў) атрымаў прэзыдэнт краіны Рыста Руці, які кіраваў краінай у 1940—1944 г. і па вайне нават на некаторы час быў асуджаны як ваенны злачынца. За ім ідзе Урхе Кеканэн, які кіраваў пасьляваеннай Фінляндыяй цягам даўгіх 25 гадоў, здолеўшы пабудаваць нармальныя стасункі з Масквой.

Далей ідуць дзіцячы лекар Арва Ульпа, бацька фінскай літаратуры, «фінскі Скарына» Мікаэль Агрыкала, цяперашняя прэзыдэнтка Тар'я Халанэн, пісьменьнік XIX ст. Алексіс Ківі, зьбіральнік нацыянальнага эпасу «Калевала» Эліяс Лёнрат, які найлепшыя руны запісаў па вёсках Мурманскага краю, дзе сёньня і сьледу няма ад фінаў. Замыкаюць дзясятку герой апошняй вайны генэрал Адольф Эрнрат ды кампазытар Ян Сыбэліюс. Цікава адзначыць, што з 10 найбольш славутых фінаў шасьцёра мелі роднай мовай швэдзкую.

**Паводле газэты «Dagens Nyheter»**

## Швэцыя скарачае армію

Швэдзкі рыксдаг прыняў гістарычнае рашэньне наконт вялікага скарачэньня нацыянальнага войска. У 1980 г. у швэдзкім войску служыла 700 тыс. салдат, досыць вялікая колькасьць была абумоўлена тым, што краіна ніколі не была сябрам NATO, таму пад пагрозай з боку СССР будавала ўласную сыстэму бясьпекі. У 2000 г. войска скарацілі да 160 тысяч жаўнераў. Паводле апошняга рашэньня, у 2005 годзе ў арміі застанецца ўсяго 31 500 салдат. 5000 афіцэраў будуць звольнены, астатніх чакае тэрміновая пэнсія. Такое значнае скарачэньне тлумачыцца адсутнасьцю патэнцыйных праціўнікаў у паўночнай частцы Эўропы. Пры гэтым штат паліцыі захоўваецца на ранейшым ўзроўні — 16 тысяч супрацоўнікаў на амаль дзесяцімільённую краіну.

**Паводле газэты «Metro»**
**Андрэй Катлярчук, Стакгольм**

НАВУКА

# Кіляграм састарэў

У прыгарадзе Парыжу Сэўры больш за 100 год пад шклянымі накрыўкамі захоўваецца кавалак мэталу. Падмяніць яго мараць большасьць гандляроў у сьвеце. Гэта эталён кіляграму, які, праўда, не адпавядае па масе сваёй назьве. Таму, купляючы на рынку кілё бульбы, будзьце пільныя!

Колісь вырабілі сем узораў кіляграма, і з дапамогаю жэрабя ўзялі адзін за сапраўдны, а астатнія залічылі ў копіі. Узор за ўвесь час вымаўся з сэйфу толькі тры разы (апошні раз 15 гадоў таму) — для параўнаньня з шасьцю копіямі. На самым пачатку яны важылі аднолькава, але пазьней копіі пачалі цяжэць. Дзіўна: узоры выкананы з аднолькавага мэталу, захоўваюцца ў аднолькавых умовах, таму зьмены павінны адбывацца ў іх такія самыя. Але ўжо цяпер «галоўны кіляграм» важыць на драбнютку менш за копіі. Хіба стаў лягчэйшы праз тое, што яго мылі перад кожнай праверкай.

Эталён кіляграму ўстарэў. Усе іншыя адзінкі, зацьверджаныя ў XIX стагодзьдзі, цяпер вымяраюць па-іншаму. Сэкунда, што лічылася дробам сутак, цяпер супастаўляецца з працягласьцю 9.192.631.770 ваганьняў выпраменьненьня атаму цэзію-133, частата якіх, як вынікае з фізыкі, нязьменная. Мэтар — дроб даўжыні Парыскага мэрыдыяну — потым займеў такі самы эталённы мэталічны стрыжань, які захоўваўся ў Сэўры. Цяперака мэтар — гэта адрэзак, які пераадольвае сьвятло ў вакууме за 1/299.792.458 сэкунды.

Такія зьмены гарантуюць, што нават на іншай плянэце недзе ў далёкай галяктыцы згаданыя адзінкі вымярэньня будуць аднолькавымі. Чаго нельга казаць пра кіляграм.

Бюро мераў кожнай краіны мусіць час ад часу правяраць у Францыі, ці іхні эталён мае аднолькавую вагу з адным з тых шасьці галоўных узораў, ці не.

Паўстала патрэба ў тым, каб навукоўцы знайшлі нейкі іншы, больш стабільны эталён, чым мэталічны ўзор у сэйфе пад некалькімі шклянымі накрыўкамі. Бо не выключаецца магчымасьць крадзяжу ці падмены галоўнага вызначальніка кіляграма.

Каб гэтага не адбылося, пачаліся пошукі новых мэтадаў узважваньня. Нямецкі фізык Пэтэр Бэцкера хоча скласьці адмысловую кулю з пэўнай колькасьці атамаў крэмнію. Тады б мера масы была нязьменная, бо залежала б ад колькасьці атамаў, а не ад вагі мэталічнага ўзору. Аднак дзеля гэтага трэба стварыць крышталь атамаў крэмнію, складзены ў адмысловую сетку, атамы ў якой было б лёгка лічыць. Ужо цяпер маецца прататып такой мадэлі — самы правільны шар, які толькі вырабляў чалавек. Калі б Зямля была настолькі геамэтрычна правільнай, дык пагоркі і ўзвышшы ўздымаліся б угару на некалькі мэтраў. Але ў тым прататыпе ёсьць дэфэкты — туды трапілі атамы іншага рэчыва, а паверхня пакрываецца вокісам.

Амэрыканскія ж навукоўцы зьбіраюцца паяднаць электрычнасьць з масаю. Адзін кіляграм можна супаставіць з электрамагнітнаю сілай, якая створыць раўнавагу на шалях. Тады новы ўзор кіляграма будзе вымярацца токам. Але тут таксама павінны ўлічвацца сіла, супраціўленьне і розныя іншыя электрычныя парамэтры і характарыстыкі. Затое ў гэтым выпадку можна скарыстаць зьяву Джозэфсана і квантавую зьяву Хола, дзякуючы якім узважваньне не залежыць ад ужытых матэрыялаў і робіцца паўтаральным.

З кожным экспэрымэнтам «электрычны кіляграм» робіцца ўсё больш дакладным. Відаць, хутка мэталічны ўзор сапраўды трапіць у музэй разам са сваімі копіямі.

**Падрыхтаваў Руслан Равяка**

* больш можна прачытаць на сайце: www1.bipm.org/en/si/si_brochure/chapter2/2-1/2-1-1/kilogram.html

## Цімашэвіч – сьпікер сойма

Міністар замежных справаў Польшчы Ўладзімер Цімашэвіч стаў сьпікерам Сойму. Месца сьпікера вызвалілася пасьля таго, як люстрацыйны суд вырашыў, што лідэр СЛД Юзэф Алексы ня можа займаць высокай пасады з прычыны таго, што ўтоіў сваё супрацоўніцтва з органамі дзяржбясьпекі за часоў ПНР. Апазыцыя, насуперак Цімашэвічу, падтрымлівала кандыдатуру цяперашняга віцэ-сьпікера Юзэфа Зыха (Польская сялянская партыя). Як Цімашэвіч, так і Зых у замежнапалітычным пляне актыўна падтрымліваюць беларускіх незалежнікаў.

З выбраньнем У.Цімашэвіча новым шэфам польскай дыпляматыі мае стаць Адам Ротфэльд, цяперашні дзяржсакратар МЗС, які дапамагаў прэзыдэнту Квасьнеўскаму ў ягонай пасярэдніцкай місіі ва Ўкраіне.

## Мэсіч — будучы прэзыдэнт Харватыі


AFP

Некалькіх тысяч галасоў не хапіла дзейнаму прэзыдэнту Харватыі Стыпэ Мэсічу, каб пераабрацца на другі тэрмін у першым туры выбараў. Яго падтрымала больш за 49% выбарцаў. Ягоную суперніцу, віцэ-прэм'ера ва ўрадзе хрысьціянскіх дэмакратаў Ядранку Косар — толькі 20%. Барадаты і красамоўны Мэсіч быў абраны прэзыдэнтам пасьля сьмерці генэрала Туджмана, вядомага сваімі дыктатарскімі замашкамі. З ініцыятывы Мэсіча прэзыдэнцкія паўнамоцтвы былі абмежаваныя, вярнуліся дэмакратычныя свабоды і павага да меншасьцяў, а Эўразьвяз запрасіў Харватыю ў свае шэрагі.

Пэўнай аздобай прэзыдэнцкай кампаніі быў Барыс Мікшыч, які 30 гадоў таму выехаў у Амэрыку па фальшывым пашпарце, а цяпер вярнуўся ў Харватыю як бізнэсовец-мільянэр. Ён вёў раскошную агітацыю ў амэрыканскім стылі. Але, як аказалася, харваты лічаць Мэсіча дастаткова сучасным і сьвецкім прэзыдэнтам і ня прагнуць лепшага.

Прэзыдэнт у Харватыі прызначае прэм'ера, камандуе Ўзброенымі сіламі, удзельнічае ў выпрацоўцы замежнай палітыкі. Але кіруе краінай усё ж парлямэнт праз урад.

## Швэцыя расчараваная ў дзяржаве, вяртаецца да Бога

Цунамі ў Азіі стала найбольшай катастрофай у найноўшай гісторыі Швэцыі. Паводле апошніх зьвестак, там прапала або загінула бязь вестак 2915 швэдаў. Грамадзтва ўскалыхнулася прамаруджваньнем ураду з рэакцыяй на катастрофу. Зь іншага боку, упершыню за доўгія гады швэды кінуліся да царквы. Раней у квітнеючай Швэцыі глядзелі на рэлігію як на адсталы звычай, і голас рэлігійных дзеячаў рэдка гучаў у публічных дыскусіях. Як трывога, то да Бога, пацьвярджаецца прымаўка.

## Кітайцаў 1,3 мільярды

Насельніцтва Кітаю ў чацьвер дасягнула 1,3 млрд — паінфармаваў Дзяржкамітэт па статыстыцы КНР.

## Ігналіну перабудоўваюць

1 студзеня спыненая дзейнасьць першага блёку рэактару Ігналінскай АЭС. Ігналінская АЭС, пабудаваная 21 год таму, была такога самага тыпу, як і Чарнобыль. Вызваленым супрацоўнікам будзе прапанаваная альтэрнатыва — праца на новым прадпрыемстве. Усяго на Ігналіне працуе 3525 чалавек, сярэдні заробак на станцыі — 2600 літаў (1040 даляраў).

Літва будзе заставацца атамнай краінай, але замест рэактараў савецкага тыпу ў Ігналіне паставяць сучасныя эўрапейскія.

## Хадаркоўскі: я стаў свабодны


WWW.CRJ.RU

Былы кіраўнік «Юкасу» Міхаіл Хадаркоўскі напісаў у расейскай газэце «Ведомости», што не ўспрымае страту свайго 15-мільярднага капіталу як трагедыю і зьміръюся зь лёсам. «Уласнасьць, асабліва буйная ўласнасьць, сама сабою зусім ня робіць чалавека свабодным. Будучы суўласьнікам «Юкасу», я марнаваў вялізныя высілкі на абарону гэтай уласнасьці. Я многае забараняў сабе... дзеля ўласнасьці, яе захаваньня і прымнажэньня. Ня толькі я кіраваў уласнасьцю — яна кіравала мною. І вось я перайшоў у іншую якасьць. Я станаўлюся звычайным чалавекам (з эканамічнага пункту гледжаньня — прадстаўніком забясьпечанае часткі сярэдняе клясы), для якога галоўнае — не валоданьне, а быцьцё. Барацьба не за маёмасьць, а за самога сябе, за права быць самім собой», — піша Хадаркоўскі.

## Забойцы беларусаў

23 сьнежня ў Стакгольме адбыўся суд над забойцамі двух маладых беларусаў. Злачынцы — таксама два маладзёны 20 і 16 гадоў, адзін прыехаў з Малдовы, малодшы — зь Беларусі. Абодва былі знаёмыя з ахвярамі і ў дзень забойства — 1 красавіка — разам зь імі пілі гарэлку на кватэры. Малдаванін атрымаў дзесяць гадоў, беларус — чатыры. Пасьля адбыцьця тэрміну злачынцы будуць высланы са Швэцыі. Кожны мусіць выплаціць сваякам ахвяр па 22 тысячы эўра. Малы тэрмін зьняволеньня тлумачыцца іх маладосьцю.

**МБ; gazeta.pl, svaboda.org; АК, Стакгольм**

## Студзень

**1** — Новы год.
**6** — Сьвята Трох каралёў у каталікоў.
**7** — Нараджэньне Хрыстова ў праваслаўных.
**19** — Вадохрышча ў праваслаўных.
**21** — Курбан-байрам у мусульманаў.

## Люты

**2** — Грамніцы ў каталікоў.
**10** — Новы (1426-ты) год у мусульманаў.
**13** — 300 гадоў з дня нараджэньня Францішкі Ўршулі Радзівіл (1705—1753), стваральніцы тэатру ў Нясьвіжы, пісьменьніцы.
**15** — Грамніцы ў праваслаўных.

## Сакавік

**15** — 75 год з дня нараджэньня Жарэса Алфёрава (1930, Віцебск), фізыка, Нобэлеўскага ляўрэата.
**25** — Дзень Волі (дзень абвяшчэньня незалежнасьці БНР, 1918).
**25** — Зьвеставаньне ў каталікоў.
**25** — Пурым (габр.).
**27** — Вялікдзень у каталікоў і пратэстантаў.

## Красавік

**2** — 200 гадоў з дня нараджэньня Ганса Хрысьціяна Андэрсэна (1805—1875), дацкага дзіцячага пісьменьніка.
**7** — Дабравешчаньне ў праваслаўных.

## Травень

**1** — Праваслаўны Вялікдзень.
**1** — Дзень Працы.
**9** — Дзень Перамогі над нацызмам (1945).
**10** — Радаўніца.
**11** — 150 гадоў з часу заснаваньня графам Яўстахам Тышкевічам у Вільні Музэю старажытнасьцяў (1855).
**16** — 50 гадоў гімнастцы Вользе Корбут (1955).
**25** — 75 гадоў з дня нараджэньня Мікалая Дземянцея (1930), старшыні Вярхоўнага Савету БССР у 1990—1991.
**28** — 100 гадоў з дня друкаваньня першага вершу Янкі Купалы: «Мужык» у газэце «Северо-Западный край» (1905).

## Чэрвень

**6** — 100 гадоў з дня нараджэньня Петруся Броўкі (1905—1980), народнага паэта Беларусі.
**7** — 125 гадоў з дня нараджэньня Вацлава Іваноўскага (1880—1943), міністра асьветы БНР.
**21** — 100 гадоў з дня нараджэньня Жана Поля Сартра (1905—1980), французскага пісьменьніка й філёзафа-экзыстэнцыяліста.
**23** — Купальле.
**24** — Сьвяты Ян у каталікоў.
**29** — Сьвятыя Пятро і Павал у каталікоў.




Студзень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | **1** | **2** |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | **8** | **9** |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | **15** | **16** |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | **22** | **23** |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | **29** | **30** |
| 31 | | | | | | |

Люты

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | **5** | **6** |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | **12** | **13** |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | **19** | **20** |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | **26** | **27** |
| 28 | | | | | | |

Сакавік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | **5** | **6** |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | **12** | **13** |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | **19** | **20** |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | **26** | **27** |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

Красавік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | **2** | **3** |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | **9** | **10** |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | **16** | **17** |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | **23** | **24** |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | **30** | |

Травень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | **1** |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | **7** | **8** |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | **14** | **15** |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | **21** | **22** |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | **28** | **29** |
| 30 | 31 | | | | | |

Чэрвень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | **4** | **5** |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **11** | **12** |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | **18** | **19** |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | **25** | **26** |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

Ліпень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | **2** | **3** |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | **9** | **10** |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | **16** | **17** |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | **23** | **24** |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

Жнівень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | **6** | **7** |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | **13** | **14** |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | **20** | **21** |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | **27** | **28** |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

Верасень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | **3** | **4** |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | **10** | **11** |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | **17** | **18** |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | **24** | **25** |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

Кастрычнік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | **1** | **2** |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | **8** | **9** |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | **15** | **16** |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | **22** | **23** |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | **29** | **30** |
| 31 | | | | | | |

Лістапад

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | **5** | **6** |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | **12** | **13** |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | **19** | **20** |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | **26** | **27** |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

Сьнежань

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | **3** | **4** |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | **10** | **11** |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | **17** | **18** |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | **24** | **25** |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | **31** | |

## Ліпень

**7** — Іван Вялікі ў праваслаўных.
**12** — Сьвятыя Пятро і Павал у праваслаўных.
**15** — дзень Грунвальдзкай бітвы.
**27** — Дзень Незалежнасьці ў гонар прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі (1990).

## Жнівень

**8** — 475 гадоў з дня сьмерці ў Тураве князя Канстанціна Астроскага (1460—1530), гетмана ВКЛ.
**15** — Прачыстая ў каталікоў.
**19** — Яблычны Спас у праваслаўных.
**23** — 125 гадоў ад нараджэньня Аляксандра Грына (Грынеўскага) (1880—1932), расейскага пісьменьніка, сына ўдзельніка паўстаньня Каліноўскага.
**26** — 125 гадоў з дня нараджэньня францускага паэта-мадэрніста Гіёма Апалінэра (1880—1918), нашчадка беларускага роду Кастравіцкіх (сапр. Вільгельм Альбэр Уладзімер Аляксандар Апалінары Кастравіцкі).
**28** — Прачыстая ў праваслаўных.

## Верасень

**8** — Дзень беларускай вайсковай славы.
**11** — 150 гадоў з дня нараджэньня Еўдакіма Раманава (1855—1922), этнографа й археоляга.
**25** — 50 гадоў ад прыняцьця (1955) Вярхоўным Саветам БССР тэксту й музыкі дзяржаўнага гімну «Мы беларусы».
**27** — 400 гадоў з часу Кірхгольмскай бітвы (1605), калі харугвы Рэчы Паспалітай на чале з гетманам Янам Хадкевічам разьбілі ўтрая большае войска швэдаў.

## Кастрычнік

**4** — 25 гадоў ад гібелі Пятра Машэрава (1980).
**4** — Рош Ашонэ (Новы год) у габрэяў.
**14** — Пакроў у праваслаўных.
**20** — 350 гадоў з часу падпісаньня Кейданскай уніі (1655) між ВКЛ і Швэцыяй.
**27** — 575 гадоў з дня сьмерці вялікага князя Вітаўта (1350—1430).
**30** — 100 гадоў з дня нараджэньня скульптара Андрэя Бембеля (1905—1986).

## Лістапад

**2** — Дзяды.
**4** — заканчэньне Рамазану ў мусульманаў.
**8** — 75 гадоў з часу запуску першай у БССР электрастанцыі БелДРЭС (1930).
**26** — 150 гадоў з дня сьмерці Адама Міцкевіча (1798—1855).
**26** — 75 гадоў з дня нараджэньня Ўладзімера Караткевіча (1930, Ворша — 1984).
**27** — Дзень Слуцкага збройнага чыну.
**29** — 175 гадоў паўстаньня 1830—1831.

## Сьнежань

**10** — Міжнародны дзень правоў чалавека.
**25** — Божае нараджэньне ў каталікоў.

## ЮБІЛЕІ ГОДУ

980 — першая згадка Турава ў «Аповесьці мінулых гадоў».
980 — захоп Полацку князем Уладзімерам Сьвятаславічам, паланеньне Рагнеды.
1155 — першая летапісная згадка пра Мазыр.
1330 — полацкія князі пачалі карыстацца пячаткай з «Пагоняй».
1330 — гандлёвы дагавор Полацку з Рыгаю. Яго тэкст — адзін зь першых пісьмовых помнікаў, у якім фіксаваліся асаблівасьці беларускага маўленьня.
1430 — зрываецца падрыхтаваная каранацыя на караля вялікага князя Вітаўта, бо асьвечаную Папам карону ў паслоў Вітаўта гвалтам забіраюць на мяжы палякі на загад Ягайлы. У далейшым надсечаная мячом карона выкарыстоўвалася кракаўскімі біскупамі.
1430 — абраньне Сьвідрыгайлы на вялікага князя (сын Альгерда, малодшы брат Ягайлы).
Каля 1530 — нарадзіўся Сымон Будны.
Каля 1580 — выданьне беларускамоўнага «Эвангельля» Васіля Цяпінскага.
1730 — нарадзіўся Міхал Казімер Агінскі (1730—1800), дзяржаўны дзяяч, дзядзька кампазытара Міхала Клеафаса Агінскага, стваральнік тэатру, капэлы й балетнай школы ў Слоніме.
1780 — нарадзіўся мастак Ян Дамель (1780—1840).
1780 — заснаваньне ў Магілёве тэатру.
1780 — утварэньне ў Магілёве каталіцкага арцыбіскупства, якому падпарадкоўваліся ўсе касьцёлы Расейскай імпэрыі.
1805 — адкрыцьцё ў горадзе Сьвіслач першай гімназіі на тэрыторыі Беларусі.
1905 — першыя вечары беларускай нацыянальнай культуры ў Вільні, Менску, Горадні, Полацку, Слуцку, Капылі, Дзісьне, Давыд-Гарадку, Радашкавічах.
1905 — Айнштайн стварае спэцыяльную тэорыю адноснасьці.

# Анёл і Чорт

СЬЦЯПАН ДЗІНЬ-ДЗІЛЕВІЧ

**Дзейныя асобы:**
Анёл.
Чорт.
Людзі (гледачы).

Анёл (*упрыгожвае ялінку і сьпявае*).

На вашым двары
Дрэва стаяла,
Раю-раіўся,
Хрыстос нарадзіўся
На вашым двары.
На тым дрэве
Цісова краваць.
Раю-раіўся...
А ў той краваці
Божая маці.
Божая маці
Сына радзіла.
Сына радзіла,
Раду радзіла.
Суяжджаліся
Князі-баяры.
Суды судзілі,
Раду радзілі.
Суды судзілі.
— Чым імём назваць?
Назвалі імём —
Ісусам Хрыстом!

Чорт. Стоп, стоп! Што ты тут галаву людзям дурыш — які Хрыстос, які Божы Сын? Гэта ўсё няпраўда.

Анёл. Праўда.

Чорт. Не.

Анёл. Праўда.

Чорт. Давай спрачацца.

Анёл. Давай, а хто рассудзіць?

Чорт. А хай сабе людзі рассудзяць. (*Паказвае на гледачоў.*)

Анёл. Рассудзіце нас? Добра?

Чорт. Дык вось — клянуся сваім рогам — няма ніякага Бога. (*Зьнімае і кладзе на стол свой рог.*) Малююць Бога на карцінках, пішуць пра яго ў кніжках — але хто яго бачыў? Гэта ўсё казкі...

Анёл. Крылом клянуся — вось. Бог ёсьць. (*Зьнімае і кладзе крыло.*) Калі б Бога не было, калі б рай і пекла былі б выдумкай, то і чорта быць не павінна. Але ж ён во тут стаіць, самы сапраўдны, і блюзьніць, і шкодзіць. Не, трэба пагадзіцца, што звышнія сілы дабра і зла існуюць.

Чорт. Клянуся рогам — няма Бога. (*Зьнімае і кладзе рог.*) Кажуць, Бог прынёс на зямлю мір і спакой. Дзе вы бачылі? Паўсюль вайна і тэрарысты. Вунь, нават у вашай Палестыне, сьвятой зямлі, дзе Хрыстос нарадзіўся, што цяпер? Вайна!

Анёл. Крылом клянуся — вось. Бог ёсьць! (*Зьнімае і кладзе крыло.*) Сапраўды, бывае, людзі сварацца, ваююць. Але ўсякая вайна канчаецца мірам. Калі б гэтага не было — даўно б усе адзін аднога перабілі б, нікога б не засталося. А так, бачыце, колькі на сьвеце людзей разьвялося?

Чорт. Клянуся хвастом — няма Бога. (*Адшпіляе хвост і кладзе.*) Калі б быў Бог усёмагутны, ці ж дапусьціў бы ён, каб яго любімыя дзеці — во гэтыя людзі, — паміралі...

Анёл. Сьвятлом клянуся — вось! Бог ёсьць! (*Зьнімае німб і кладзе.*) А ўявіце сабе — каб не было сьмерці. Гэта ж і злодзеі жылі б вечна. Гэта ж колькі б яны бяды нарабілі! А так раней ці пазьней кожнаму зладзейству прыходзіць канец... І галоўнае, галоўнае! Памірае што? Толькі цела. Душа вечная!

Чорт. ...Усё сказаў? Болей ніякіх доказаў ня маеш? А я маю! Клянуся сваім хвастом... (*Дастае яшчэ адзін прыхаваны хвост.*)

Анёл. Які хвост?! Ты ўжо кляўся хвастом. Гэта — падман. Гэта супраць правілаў!

Чорт. А мы, чарты, плюём на вашыя правільныя правілы! У гэтым нашая сіла, у гэтым нашая перамога!

Анёл. Але ж у нас ёсьць судзьдзі! Людзі — рассудзіце!

Чорт махае рукамі, кліча да сябе.
Анёл працягвае далоні людзям і таксама кліча да сябе...

(Аўтар ня ведае, колькі гледачоў падыдзе да аднаго і да другога і ня можа сказаць, чым закончыцца сцэнка.)


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Калядная імша для дзяцей у менскай Катэдры. 25 сьнежня.**



**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ**

* * *

Калі ні ўзораў на шкле, ні белай віхуры,
ды сам каляндар падказвае:
цуд магчымы;
калі на ружовых аблоках сядзяць
выключна Амуры,
страляючы ў мілых дзяўчат
выключна вачыма;

калі па гадзіньніку поўзае час-чарапаха
й калядныя колы дзеткам
вязуць кока-колы, —
жадаю, каб Вас віншавалі музыкай Баха
з мабільніка шчасьця
сьвятога ці проста Міколы;

каб я пераклаў Вам
найлепшую песьню Коэна
з малітваю, каб на вулічным
слотным трэшы
Вы да пачатку сьвята
вярнуліся ў дом спакойна,
ня трапіўшы на кантралёра
й не захварэўшы!

*31 сьнежня 2004*

Падборка вершаў Андрэя Хадановіча — **на старонцы 19**.

# Спроба жыць па праўдзе

«Падрыўная дзейнасьць супраць Рэспублікі і распальваньне варожасьці да дзяржавы» — паводле такога абвінавачаньня чэскі драматург і дысыдэнт Вацлаў Гавал сеў у турму ў 1977 г. Фармулёўка мала розьніцца ад тых, якія гучаць у беларускіх судах на працэсах над героямі нашаніўскай «Хронікі супраціву». Рух за нацыянальнае вызваленьне нібыта айсбэрг. Рашучыя, якія маюць дастаткова моцы, каб выйсьці на плошчу і пратэставаць, складаюць яго бачную, меншую частку. Тых, што спачуваюць і абураюцца моўчкі, — мільёны. Што мушу рабіць я, калі побач са мною нейкі юнак узьняў на мітынгу 7 лістапада транспарант «Далоў самадзяржаўе»? Або калі побач з мною жыве хлопец, што зачытаў на раённым радыё артыкул з фактамі фальсыфікацыі выбараў і яго за гэта выгналі з працы? Або калі мой сусед-школьнік — зубровец? Пра гэта нам гаворыць пасьпяховы чэскі досьвед і эсэ В.Гаўла «Спроба жыць па праўдзе». Напісанае ў 1980 г., яно актуальнае для нас сёньня.

ВАЦЛАЎ ГАВАЛ

Дырэктар праскай крамы гароднiны зьмясьціў у вітрыне, паміж цыбуляю і морквай, лёзунг «Пралетары ўсіх краін, яднайцеся!»

Гэты лёзунг нашаму дырэктару крамы прывезьлі разам з цыбуляй і морквай з базы, і ён павесіў яго ў вітрыне проста таму, што робіць так ужо шмат гадоў, таму што ўсе так робяць, таму што так мае быць. Калі б ён гэтага не зрабіў, мог бы мець праблемы; хто-небудзь нават мо зьвінаваціў бы яго ў апазыцыйнасьці.

Аднак лёзунг на транспаранце мае таксама функцыю *знаку*. Як такі ён утрымлівае схаванае, але цалкам пэўнае паведамленьне. Яго можна было б сфармуляваць так: «Я, гандляр гароднінай XY, сяджу тут і ведаю, што я павінен рабіць; я паводжу сябе так, як ад мяне чакаюць; на мяне можна пакласьціся і мяне ні ў чым нельга папракнуць; я паслухмяны і таму маю права на спакойнае жыцьцё».

Гэтае паведамленьне, само сабой, мае і свайго адрасата: яно скіраванае «наверх», да начальнікаў гандляра гароднінай, і адначасова гэта шчыт, за якім дырэктар крамы хаваецца ад патэнцыйных даносчыкаў.

Цяпер уявім сабе, што аднаго дня дырэктар крамы паўстане і ня будзе больш выстаўляць транспаранты зь лёзунгамі, якія ён выстаўляў адно каб яго не чапалі; ня будзе больш хадзіць на выбары, пра якія ён ведае, што гэта зусім ня выбары; пачне казаць на сходах тое, што ён сапраўды думае, і знойдзе ў сабе досыць моцы, каб салідарызавацца з тымі, з кім яму загадвае салідарызавацца ягонае сумленьне.

Праз такое паўстаньне дырэктар крамы выйдзе з «жыцьця ў хлусьні», адкіне рытуал і парушыць «правілы гульні». Ён знойдзе сваё прыгнечанае «я» і сваю годнасьць, ён вызваліць сябе. Ягонае паўстаньне будзе спробай *жыцьця ў праўдзе*.

Рахунак яму выставяць хутка: ён страціць сваю пасаду і вымушаны будзе працаваць шафёрам, развозіць тавары. Ягоны заробак будзе зьменшаны. Яму давядзецца адмовіцца ад надзеі зьездзіць на адпачынак у Баўгарыю. Далейшая адукацыя яго дзяцей апынецца пад пагрозай. Начальства будзе да яго чапляцца, калегі будуць глядзець на яго як на дзівака.

Насамрэч дырэктар крамы зьдзейсьніў ня толькі нейкае індывідуальнае, завершанае ў сваёй аднаразовасьці парушэньне, ён зрабіў нешта непараўнальна важчэйшае: парушыўшы правілы гульні, ён скасаваў *гульню як такую*. Ён пашкодзіў структуру ўлады, перарваўшы яе сувязі; ён паказаў, што «жыцьцё ў хлусьні» — гэта жыцьцё ў хлусьні.

Але з прычыны таго, што ўсе сапраўдныя праблемы і крызісныя зьявы схаваныя пад тоўстым слоем хлусьні, да канца ніколі ня ясна, калі ўпадзе, як той казаў, апошняя кропля, якая перапоўніць бочку, і што за кропля гэта будзе. Таму ўлада прэвэнтыўна і амаль аўтаматычна перасьледуе кожную спробу «жыцьця ў праўдзе».

**Працяг на старонцы 15.**

# Саюз з Расеяй ды Жанна Літвіна



**ЮРЫ ХАДЫКА**

**прафэсар фізікі, намесьнік старшыні Партыі БНФ**

Цемра масаў — не арганічная ўласьцівасьць, а выключна вынік клопату правадыроў.

Карысна чытаць расейскую прэсу. Можна напаткаць цьвярозы, прасякнуты болем аналіз няшчасьцяў сваёй радзімы, уласьцівых і Беларусі. Можа, калі-небудзь гэтыя родавыя балячкі будуць вылекаваныя. Гэткую надзею выклікае ў мяне артыкул былога прэс-сакратара прэзыдэнта Ельцына Вячаслава Косьцікава «Правадыры без п'едэсталаў», надрукаваны ў №51 «Аргументов и фактов».

Аўтар, аналізуючы прычыны заняпаду Расеі, піша: «Некаторыя прычыны ляжаць на паверхні: «цемра масаў», адсутнасьць шматпартыйнасьці, а ў выніку і спаборніцтва патэнцыйных лідэраў. Няма ў нас дасюль і ясных непарушных мэханізмаў зьмены ўлады і лідэраў. І нарэшце, «псута» правадыроў у выніку празьмернай канцэнтрацыі ўлады».

Тая рыса сацыяльнай рэчаіснасьці, якую аўтар назваў «цемрай масаў», сапраўды ляжыць у аснове няшчасьцяў — што Расеі, што Беларусі. «Цемра» ўзята ў двукосьсі, бо яна — не арганічная ўласьцівасьць мас, а выключна вынік дзейнасьці «правадыроў». У Беларусі раней, у Расеі крыху пазьней правадыры абвясьцілі вайну СМІ. Не хачу пісаць «незалежным СМІ», бо тэлеканалы Гусінскага і Беразоўскага залежалі ад сваіх гаспадароў. Аднак менавіта яны казалі праўду пра вайну ў Чачэніі, правадыроў, расказвалі пра нядаўнюю расейскую гісторыю. Пакуль яны дзейнічалі, партыі, якія баранілі лібэральныя каштоўнасьці ды каштоўнасьці свабоды і дэмакратыі, праходзілі ў расейскі парлямэнт. І масы былі не зусім цёмныя.

Сумленна выйграць спаборніцтва за праўду дзяржаўныя СМІ у «дрэнных» каналаў не маглі. Давялося выкарыстоўваць «адміністрацыйны рэсурс». Гэты славуты рэсурс у Беларусі быў выкарыстаны куды раней. Даводзіцца толькі ўспамінаць аб тым часе, калі разгубленыя правадыры дапускалі трансьляцыю з пасяджэньняў Вярхоўнага Савету. Але пасьля прыходу да ўлады ў 1994 г. новага правадыра беларускія масы атрымалі парлямэнт, які і сказаць нічога ня можа. Масы сталі «цёмныя», а замест СМІ зьявіліся СМП — сродкі масавай прапаганды.

У выніку ні ў Расеі, ні ў Беларусі няма рэальнай шматпартыйнасьці. Расея пасьпешліва дабівае яе зародкі і нават плянуе зрабіць наступны крок — замест партый, што паўсталі знізу, нарадзіць «партыі зьверху» — каб пры любым выніку выбараў улада заставалася ўсё ў тых жа руках. Гэта дазваляе спадзявацца на спыненьне крытыкі нашых выбараў з боку ўсіх гэтых няздатных міжнародных структур — АБСЭ ды ЭС, якія ніяк ня ў стане зразумець вялікага прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізму, што быў добра засвоены расейскай і беларускай намэнклятурай з часоў вялікага Сталіна. Такая вось гістарычна-культурная пераемнасьць.

Вядома, А.Лукашэнка таксама стварыў бы правую і левую партыі ўлады, калі б з гэтай творчасьці аўтаматычна не вынікала «спаборніцтва патэнцыйных лідэраў», як адзначаў В.Косьцікаў. Беларусі зь яе сьціплымі рэсурсамі гэткае спаборніцтва не пасуе. Таму мы яшчэ да ўвядзеньня ў Расеі дзьвюхпартыйнасьці ўвялі ў сябе пажыцьцёвае прэзыдэнцтва. Таксама файны спосаб захаваньня непарушнай стабільнасьці. Беларусь ізноў вырвалася наперад у саюзным спаборніцтве за лепшае задавальненьне памкненьняў «цёмных мас». І мы бачым, як У.Пуцін ужо не заяўляе рашуча чарговы раз пра немагчымасьць парушэньня Канстытуцыі, але паводле прыкладу малодшых «братоў» Кучмы ды Лукашэнкі спасылаецца на адсутнасьць часу падумаць пра свае пасьляпрэзыдэнцкія пляны. Знамянальны момант. Цалкам магчыма, што ў хуткім часе ён саступіць настойлівым просьбам прадстаўнікоў народу і пойдзе на трэці тэрмін. Таму што пабаіцца пакут масаў пры зьмене ўлады, як ва Ўкраіне. Усе расейскія СМП ужо шматкроць прадказалі яе раскол і грамадзянскую вайну праз нясьцерпную любоў некаторых украінцаў да экс-зэка В.Януковіча.

У цікавы час мы жывём. «Няма ў нас дасюль ясных і непарушных мэханізмаў зьмены ўлады і лідэраў». Вось і ходзім па коле.

Таму псуту правадыроў браць у двукосьсі зусім ня трэба. Кепскі пах не дазваляе. Правадыры «цёмных масаў» самі цёмныя і брудныя. Ім не стае ачышчальнай крытыкі апазыцыі і свабодных СМІ. Публічнай крытыкі, якая б гучала на ўсю краіну. У гэтым пляне Беларусь, зразумела, наперадзе Расеі. Як і ў адчайных спробах пэўнай часткі насельніцтва ды прэсы, што ня хоча быць «цёмнай», захаваць сваю чалавечаю годнасьць ды пэрспэктыву жыць у свабоднай і сьветлай краіне. Ім і стала ўзнагародай прэмія «За свабоду думкі» імя вялікага Андрэя Сахарава. Віншуем і ганарымся сябрамі Беларускай асацыяцыі журналістаў і яе старшынёй — Жаннай Літвіной. Жадаем ім і надалей не шкадаваць высілкаў, каб псута не перайшла ў цьвіль.

ВОДГУКІ

## Савецкая Рэспубліка была шанцам

Свабодаўская «Вострая Брама» Сяргея Дубаўца «Тры сюжэты пад заслону году» выглядае на сьнежаньскія тэзісы дэмрэвалюцыі. Я амаль з усім згодны. Акрамя аднаго: што варта распачаць усенародны суд над камунізмам.

**1.**

Давайце разьбяромся: ці існаваў насамрэч «Саюз вызваленьня Беларусі», 75-годзьдзе разгрому якога мы будзем успамінаць сёлета. Відаць, існаваў, няхай і ня ў выглядзе жорстка структураванай арганізацыі. Вэрсію пра тое, што «СВБ» не было, папулярызавалі ў 1980-х (найперш Барыс Сачанка), каб зьявілася магчымасьць вяртаць творы і постаці рэпрэсаваных пісьменьнікаў, палітыкаў і дзеячаў культуры. Амаль ніхто з гісторыкаў не зьвярнуў увагі на вэрсію Антона Адамовіча пра «мангольскі праект» — плян-ідэю, якая цыркулявала ў асяродку нацыянальна сьвядомай беларускай інтэлігенцыі. Ідэя была наступная: з дапамогай бальшавікоў аб'яднаць этнічныя ўсходнія беларускія землі, ініцыяваць народнае паўстаньне ў Заходняй Беларусі (пры ўдзеле Грамады), да якога актыўна далучаюцца ўсходнія беларусы, у выніку — утварыць незалежную краіну БНР, якая існавала б першы час пад пратэктаратам СССР, на ўзор Мангольскай Народнай Рэспублікі.

Калі была ідэя, дык былі і людзі, якія плянавалі яе рэалізацыю.

Тады робіцца зразумела, чаму ў савецкую Беларусь вяртаюцца Цьвікевіч, Ластоўскі, Жылка. Ясна, што не ўмацоўваць савецкую ўладу.

Калі вы апраўдваеце беларускіх дзеячаў, якія пайшлі на супрацоўніцтва з нацысцкай адміністрацыяй у часы Другой сусьветнай вайны, дык чаму не вытлумачваеце гэткімі ж матывамі супрацоўніцтва нацыянал-камуністаў з бальшавікамі?

**2.**

Па-другое, ці былі «маладнякоўцы» агентамі бальшавіцкай улады, як почасту іх абвінавачваюць з усіх бакоў?

Напрыклад, Антон Адамовіч у працы «Супраціў саветызацыі ў беларускай літаратуры» называе Алеся Дудара агентам ДПУ, які напісаў верш «Пасеклі наш край папалам...» дзеля правакацыі. Толькі ў сярэдзіне 1990-х сталі вядомыя матэрыялы справы Дудара з архіву КДБ. Высьветлілася, што не замаўлялі чэкісты паэту напісаць гэты верш, наадварот, актыўна шукалі яго аўтара. Найлепшы агент беларускіх «дзяржынцаў» А.Ульянаў дазнаўся пра імя аўтара крамольнага вершу ад самога Янкі Купалы — Алесь Дудар.

Ці былі маладнякоўцы структурай «СВБ»? Выглядае, што былі. Менавіта яны выконвалі асноўныя заданьні па зьдзяйсьненьні пляну беларусізацыі Рэспублікі. Эмісары «Маладняку» зьявіліся амаль у кожным больш-менш значным горадзе Беларусі. Наўрад ці іх знаёмілі з дэталямі генэральнага пляну і стратэгічнымі напрацоўкамі, але яны, трэба меркаваць, выдатна разумелі — што і дзеля чаго робяць.

Пры канцы 1927 г., калі працэс «беларусізацыі» пачаў згортвацца і ўзьнікла пагроза разгрому нацыянальнага руху ў Савецкай Беларусі, амаль усе пісьменьнікі-нацдэмы, розных узростаў, ад Купалы, Коласа да Чарота, Дудара, Зарэцкага, згуртаваліся ў аб'яднаньне «Полымя». Менавіта яны распачалі барацьбу на старонках газэт за беларускі тэатар, кіно, унівэрсытэт. Пры скандалах і пагрозах з боку ДПУ.

Нацыянал-камуністаў не падтрымалі «ўзвышэнцы». Таму і зьявілася апавяданьне Дудара «Вецер з усходу» — аўтар выводзіў (у мастацкіх вобразах) лідэраў «Узвышша», якія адно захапляюцца расейскай (буржуазнай, назваць яе імпэрскай было немагчыма з прычыны цэнзуры) паэзіяй, як «агентаў буржуазіі й контррэвалюцыі». Маўляў, усё кепскае прыносіць вецер з усходу. Гэтае апавяданьне Антон Адамовіч называе паклёпніцкім. Але, згадзіцеся, была прычына ў Дудара яго напісаць і канфліктаваць з «Узвышшам». Урэшце, мае рацыю Сяргей Дубавец, які ў іншай перадачы ў «Вострай Браме» казаў, што разборкі паміж пісьменьнікамі ў няпростых 1920—1930-х часта пачыналіся з прычын прыватных і дробязных.

Усе нацкамы-палітыкі, дзеячы навукі і культуры, а таксама большая частка «палымянцаў» былі жорстка вынішчаны, іх стралялі, як ваеннапалонных да Жэнэўскай канвэнцыі, вялікімі групамі. Зь верхавіны «Маладняку» з ГУЛАГу вярнуўся толькі Андрэй Александровіч. «Узвышша» пацярпела значна менш, прынамсі, Дубоўка, Пушча, Крапіва, Глебка, Лужанін дажылі да часоў «разьвітага сацыялізму».

**3.**

Ці былі нацыянал-камуністы інтэгратарамі з Расеяй?

Зноў вяртаемся да Алеся Дудара. Маладыя «палымянцы» вострa выступілі супраць пераўтварэньня «Маладняку» ў філію УАППу. Дудар прызнаваўся, што «пакуль стаялі на чале «Маладняку» мы, усе спробы УАППу завязаць з намі сувязь разьбіваліся аб сьцяну нашай упартасьці, бо мы лічылі, што УАПП нас хоча закабаліць, што сувязь зь ім прывядзе беларускую пралетарскую літаратуру [...] да заняпаду, да рабскага перайманьня...» Дайшло да таго, што «Полымя» адкрыта байкатавала прыезд Максіма Горкага ў Беларусь.

Сувязь з бальшавікамі была ад змушанасьці.

**4.**

І самае галоўнае пытаньне: ці былі нацкамы праўдзівымі камуністамі-бальшавікамі?

Я мяркую, яны былі найперш сацыял-дэмакратамі, традыцыі якіх у Беларусі сягаюць часоў першае «Нашай Нівы» і першых беларускіх партый — сацыял-дэмакратычных па духу.

Яны былі сапраўднымі патрыётамі сваёй Бацькаўшчыны, і мы мусім шанаваць іх імёны. Калі пачнём усенародны суд над камунізмам (без адпаведнай «дыфэрэнцыяцыі»), дык высьцебаем саміх сябе. І Жылуновіча, і Купалу, і Дудара, і Танка, і Куляшова, і Брыля, і Караткевіча, і Быкава... З чым застанёмся?

У 1918 годзе БНР не магла адбыцца ня толькі з прычын агульнапалітычных, але і праз кволыя рэсурсы ды слабую падтрымку насельніцтва. У беларускага лёсу заставаўся адзіны шанец — стварацъ савецкую Рэспубліку, што і зрабілі нацыянал-камуністы. Суд над камунізмам Панамарэнкі—Бермана—Цанавы — так. І нават над камунізмам Машэрава.

**Алесь Аркуш, Полацак**

### Думбадзэ на АНТ

...У адной з апошніх праграмаў «Контуры» рэпарцёр АНТ, уцякач з Аджарыі Тэнгіз Думбадзэ вучыў беларусаў праяўляць пільнасьць, бо на памежных тэрыторыях, у нашых заходніх ды паўночных суседзяў, будуць працаваць рэтрансьлятары новага радыё на беларускай мове. Своеасаблівым падрахункам былі апошнія яго словы: «Дарэчы, на мінулым тыдні дэпутаты нямецкай партыі ХДЗ прапанавалі бундэстагу адкрыць новы радыйны *беларускамоўны* канал, які вяшчаў бы на Беларусь. Бундэстаг гэтую прапанову скасаваў». Пры гэтым апошні сказ быў прамоўлены зь відавочнай радасьцю. Выйшла, што «нацыянальны» канал АНТ радуецца, што не ўзьнікаюць новыя *беларускамоўныя* радыёстанцыі.

**Алесь Залеўскі, Менск**

### Сапацьковая «Вераніка»

Да артыкулу З.Падбярэскага «Тузін падзей»: Сапацьковая «Вераніка» стала адным з найбольшых маіх музычных узрушэньняў за апошнія гады. На мой погляд, такой нізкай ацэнкі Сапацькоў ніяк не заслугоўвае. Быў бы дыск у продажы — купіў бы, ня думаў.

**Shept, праз nn.by**

### Будучыня за тарашкевіцай

На маю думку, тарашкевіца ў большай ступені пасуе сучаснасьці, чым наркамаўка, бо ёю (тарашкевіцай) карыстаецца пераважна моладзевая аўдыторыя. А будучыня, як вядома, за моладзьдзю, а значыць і за тарашкевіцай.

Чалавеку блізкаму да беларускамоўнага асяродку рана ці позна прыходзіцца задумацца над такою зьявай, як суіснаваньне наркамаўкі ды тарашкевіцы.

Пэрыёдыка на тарашкевіцы амаль не друкуецца: «Наша Ніва» ды прадукты моладзевае афіцыйнае культуры — «Навінкі» ды «Студэнцкая думка» — хутчэй, выняткам, што пацьвярджае правіла. Затое ў Інтэрнэце становішча зусім іншае: у сецiве пераважае тарашкевіца.

Тарашкевіца жывейшая, яна хутка прыстасоўваецца да новых зьяў. Ёю карыстаюцца сьвядомыя носьбіты, людзі, якія ўжываюць беларускую мову ў побыце. Прыхільнік тарашкевіцы, ня ведаючы адпаведнага беларускага слова, наўрад ці проста мэханічна агучыць у беларускім варыянце расейскі адпаведнік, хутчэй ужо польскі ці чэскі. Ён лепей патраціць час ды паглядзіць у слоўнік, абы не ўжываць расейскага слова, што працуе толькі на карысьць мове. Тарашкевіцаю размаўляюць людзі, для якіх беларуская мова — ня мова зь дзевяці ранку да шасьці вечара, гэта іх родная мова, якой яны ганарацца і за якую гатовы змагацца. У такога правапісу ёсьць будучыня й ёсьць пэрспэктывы не ў падручніках па гісторыі мовазнаўства, а ў сям'і разьвітых эўрапейскіх моў.

Таму мой голас — за тарашкевіцу.

**Віталь Каляда, Менск**

# Спроба жыць па праўдзе

Працяг са старонкі 13.

Саван «жыцьця ў хлусьні» зроблены з адметнага матэрыялу — пакуль ён гермэтычна ўкрывае ўсё грамадзтва, здаецца, што ён каменны. Але ў той момант, калі хтосьці робіць дзірку ў адным-адзіным месцы, калі адзін чалавек крычыць «Кароль голы!», калі адзін гулец парушае правілы гульні, такім чынам выкрываючы яе як гульню, усё раптам апынаецца ў іншым сьвятле і ўвесь саван падаецца зробленым з паперы — ён нібы пачынае разлазіцца на маленькія шматкі.

Найважнейшай палітычнай падзеяй у Чэхаславаччыне пасьля пачатку кіраваньня Гусака ў 1969-м, без сумневу, быў выступ «Хартыі'77». Аднак духоўны клімат для гэтага выступу быў падрыхтаваны не беспасярэдне палітычнай падзеяй, а працэсам над маладымі музыкамі з гурту «The Plastic People». Працэсам, у якім супрацьстаялі ня дзьве палітычныя сілы ці канцэпцыі, а два бачаньні жыцьця: з аднаго боку — стэрыльнае пурытанства істэблішмэнту, з другога — невядомыя маладыя людзі, якія не хацелі нічога іншага, як жыць у праўдзе: іграць музыку, якая ім падабалася, сьпяваць пра тое, як яны сапраўды жывуць. Яны хацелі свабоды, годнасьці й братэрства.

Гэта былі людзі без палітычнага мінулага, не сьвядомыя апазыцыянэры зь якімісьці палітычнымі амбіцыямі, не былыя палітыкі, выключаныя з структур улады. Гэтыя людзі мелі ўсе магчымасьці дапасавацца да абставінаў, прыняць «жыцьцё ў хлусьні» і жыць у спакоі і бясьпецы. А яны вырашылі інакш.

Гэта «простыя людзі», жыцьцё якіх напоўнена «простымі» клопатамі, і ад іншых яны розьняцца толькі тым, што гучна кажуць тое, чаго іншыя ня могуць ці не адважваюцца сказаць. Менавіта гэтым музыкі прыцягнулі такую пільную ўвагу палітычных органаў і паліцыі, і мо ў кагосьці склалася ўражаньне, што ўрад баіцца дысыдэнтаў як нейкае альтэрнатыўнае ўладнае групы.

У часы, калі Багемія і Славаччына былі неад'емнай часткай аўстра-вугорскай манархіі й ня мелі ні фактычных, ні палітычных, ні псыхасацыяльных перадумоў для пошукаў нацыянальнае ідэнтычнасьці па-за імпэрыяй, Тамаш Масарык пабудаваў чэскую нацыянальную праграму на ідэі «карпатлівай, або арганічнай працы». Гэта сумленная і адказная праца ў самых розных абсягах, але ў рамках існага ладу, скіраваная на ўзьняцьце нацыянальнай самасьвядомасьці.

Асаблівая вага, натуральна, надавалася элемэнтам асьветы, выхаваньня, адукацыі, маральнасьці і гуманнасьці. Адзіны зыходны пункт для годнага нацыянальнага лёсу Масарык бачыў у чалавеку. У тым, што чалавек найперш стварае перадумовы для ўласнага больш годнага людзкага лёсу. Зьмяненьне чалавека было для Масарыка зыходным пунктам зьмяненьня становішча нацыі.

Гэтая ідэя «працы для нацыі»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ўмацавалася ў нашым грамадзтве, аказалася пасьпяховай, шмат у чым жыве па сёньня. Апроч тых, хто за гэтай ідэяй хавае сваё калябаранцтва, і сёньня ёсьць шмат людзей, якія сапраўды кіруюцца ёй і — прынамсі ў некаторых абсягах — дасягнулі неаспрэчных посьпехаў.

Але ўсё часьцей здараецца, што гэтая «карпатлівая праца» сутыкаецца з мурамі сыстэмы і апынаецца перад дылемай — людзі альбо мусяць здавацца, адступаць ад сваёй сумленнасьці, адказнасьці і пасьлядоўнасьці, проста дапасоўвацца (пазыцыя большасьці), альбо працягваць распачатыя шлях і праз гэта непазьбежна ўступаць у адкрытую канфрантацыю зь дзяржаўнай уладай (пазыцыя меншасьці).

Калі ў 1974-м я працаваў на бровары, у мяне быў начальнік, нейкі Ш. Гэта быў чалавек, які ведаў сваю справу, які меў штосьці накшталт саслоўнага гонару і душою хварэў за тое, каб на нашым бровары варылася добрае піва. Бавіў амаль увесь свой час на працы, прыдумляў нейкія паляпшэньні, мучыў нас, маркуючы, што мы ўсе гэтак жа любім варыць піва, як ён.

Пасярод сацыялістычнай абыякавасьці наўрад ці можна было ўявіць сабе чалавека, які б меў больш канструктыўнае стаўленьне да працы, чым Ш. Кіраўніцтва бровару — а там сядзелі людзі, якія хоць і менш разумелі ў сваёй прафэсіі і менш яе любілі, але затое мелі больш палітычнага ўплыву — бадзёра руйнавала дабрабыт бровару.

Урэшце Ш. не заставалася нічога іншага, як напісаць у вышэйшую інстанцыю доўгі ліст, у якім ён паспрабаваў прааналізаваць усе хібы працы бровару, праўдзіва патлумачыць, чаму наш бровар найгоршы ў краіне, і назваць тых, хто быў у гэтым вінаваты.

Ягоны голас мог быць пачуты. Кіраўніка, які меў палітычны ўплыў, але ня ўмеў варыць піва, інтрыгаваў і пагарджаў работнікамі, маглі б замяніць, стан рэчаў на бровары ў выніку ініцыятывы Ш. мог бы палепшыцца. Калі б так і здарылася, гэта быў бы прыклад посьпеху «карпатлівай працы».

На жаль, сталася адваротнае: дырэктар бровару — як член акруговага камітэту партыі — меў «наверсе» добрых знаёмых і прыняў меры: аналіз Ш. быў прызнаны «пасквілем», Ш. атрымаў кляймо палітычнага шкодніка.

Яго выкінулі з нашага бровару і перавялі на іншы, на некваліфікаваную працу. Сказаўшы праўду, Ш. «выключыў» сябе. Ён парушыў правілы гульні і стаў «грамадзянінам найніжэйшай катэгорыі», з Каінавай пячаткай на лобе.

Такім чынам, дысыдэнтам чалавек робіцца не праз тое, што аднаго дня ён выбірае сабе гэтую адметную кар'еру, а праз тое, што пачуцьцё адказнасьці ў спалучэньні з цэлым наборам вонкавых акалічнасьцяў проста заганяе яго ў гэтае становішча.

Ён вылятае зь існых структур і аказваецца ў канфрантацыі зь імі: усё пачалося, ня больш і ня менш, з намеру добра рабіць сваю працу, — і вось маеш Каінаву пячатку ворага.

Спроба нашага дырэктара крамы «жыць у праўдзе» можа абмежавацца тым, што ён проста ня будзе больш рабіць некаторых рэчаў: ён больш ня будзе вывешваць сьцягоў з акна, каб падлашчыцца да домакіраўніка, які можа на яго данесьці; ён ня будзе хадзіць на выбары, якія ён не ўважае за такія; ён ня будзе хаваць свае погляды перад сваімі начальнікамі. Ягоная спроба, такім чынам, можа абмежавацца «толькі» тым, што ён адмовіцца адпавядаць некаторым патрабаваньням сыстэмы (што ўжо зусім нямала!).

Аднак гэтая спроба можа перайсьці ў нешта большае: гандляр гароднінай можа пачаць *рабіць* штосьці канкрэтнае. Тое, што выходзіць за межы беспасярэдняга асабістага супраціву маніпуляцыі і ў чым аб'ектывуецца ягоная зноў знойдзеная «вышэйшая адказнасьць».

Напрыклад, ён можа арганізоўваць сваіх калег на супольныя выступы для абароны іхных інтарэсаў. Ён можа пісаць у розныя ўстановы і паведамляць пра хібы і несправядлівасьць вакол яго. Ён можа даставаць неафіцыйную літаратуру, перапісваць яе і пазычаць сябрам.

Зразумела, ня *кожная* спроба «жыць у праўдзе» аўтаматычна зьяўляецца дысыдэнцтвам.

Наадварот, «жыць у праўдзе» ў першапачатковым і найшырэйшым сэнсе ўяўляе сабой вельмі шырокі, невыразна акрэсьлены і вельмі цяжка вызначальны абсяг малых дзеяньняў.

> Саван «жыцьця ў хлусьні» зроблены з адметнага матэрыялу — пакуль ён гермэтычна ўкрывае ўсё грамадзтва, здаецца, што ён каменны. Але калі адзін гулец парушае правілы гульні, такім чынам выкрываючы яе як гульню, увесь саван нібы пачынае разлазіцца на маленькія шматкі.

Найбольшая частка гэтых спроб застаецца ў фазе элемэнтарнага паўстаньня супраць маніпуляцыі: чалавек проста выпростваецца і жыве — як асоба — *больш годна*.

Толькі дзе-нідзе вырастае нейкая злучаная і відочная ініцыятыва, якая выходзіць па-за межы «толькі» індывідуальнага паўстаньня і пераўтвараецца ў вызначаную, сьвядомую, структураваную і мэтаскіраваную дзейнасьць. Гэтая мяжа, за якой «жыцьцё ў праўдзе» перастае быць «толькі» адмоваю «жыцьця ў хлусьні» і пачынае пэўным чынам творча *артыкуляваць* само сябе, ёсьць месцам, дзе нараджаецца тое, што можна было б назваць «*незалежным духоўным, сацыяльным і палітычным жыцьцём грамадзтва*».

Тое, што пазьней называюць «грамадзянскай ініцыятывай», «дысыдэнцкім рухам» ці нават «апазыцыяй», зьяўляецца — як тая верхавіна айсбэргу — толькі з гэтага «незалежнага жыцьця грамадзтва».

Сыстэма вядзе глябальны *наступ* на чалавека, ён супрацьстаіць ёй адзін, кінуты й ізаляваны. Таму цалкам натуральна, што ўсе «дысыдэнцкія рухі» маюць выразны *абарончы характар*: яны бароняць чалавека і сапраўдныя інтэнцыі жыцьця ад інтэнцыяў сыстэмы.

Польскі Камітэт абароны рабочых сёньня называецца Камітэтам грамадзкай самаабароны, слова «абарона» ёсьць і ў назвах іншых падобных груп у Польшчы, але і савецкая Хельсынская група, і наша «Хартыя'77» таксама маюць выразна абарончы характар.

З гледзішча традыцыйнай палітыкі гэтая абарона можа падавацца хоць і зразумелай, але ўсё ж мінімалісцкай, урэшце, усё ж нэгатыўнай надзвычайнай праграмай: супраць пэўнай канцэпцыі, мадэлі ці ідэалёгіі ў гэтым выпадку не выстаўляецца іншая канцэпцыя, іншая мадэль і іншая ідэалёгія.

Я думаю, што такая праца выкрывае абмежаванасьць традыцыйнай оптыкі, бо гэтая сыстэма ня ёсьць нейкай канкрэтнай палітычнай лініяй нейкага канкрэтнага ўраду, але чымсьці прынцыпова іншым: гэта складанае, глыбокае і працяглае гвалтаваньне ці самагвалтаваньне грамадзтва. Спроба супраціўляцца гэтай сыстэме праз тое, што ейнай лініі супрацьстаўляюць іншую лінію і пасьля імкнуцца зьмяніць урад, была б ня толькі цалкам нерэалістычнай, але перадусім і *недастатковай*.

Часам мы мусім упасьці на самае дно мізэрнасьці, каб зразумець праўду, — падобна да таго, як толькі на дне калодзежу нам відаць зоркі. На маю думку, сёньня гэтая «мінімалістычная» і «нэгатыўная» надзвычайная праграма — чыстая абарона чалавека — ёсьць самай *пазытыўнай* і *максымальнай* праграмай: яна нарэшце вяртае палітыку да таго адзінага пункту, зь якога тая можа зыходзіць, калі хоча ўнікнуць старых памылак, — гэта значыць да *канкрэтнага чалавека*.

**Пераклад Алеся Пяткевіча**

**Друкуецца з скарачэньнямі**

# Навіны зь мінуўшчыны

Аўтарам Акту 25 Сакавіка мог быць Антон Луцкевіч, сьцьвярджае гісторык Анатоль Сідарэвіч

Неяк так сталася, што ніхто дагэтуль ня даў адказу на гэтае пытаньне, дый, здаецца, не задаваў яго. Ад кагосьці я пачуў, што аўтарамі трэцяе Ўстаўнае граматы Рады БНР зьяўляюцца тыя асобы, якія падпісалі яе, — народныя сакратары Язэп Варонка, Канстанцін Езавітаў, Іван Серада, Тамаш Грыб, Леанард Заяц, Яфім Бялевіч, Пётра Крачэўскі, Аркадзь Смоліч, Пелагея Бадунова, А.Карач.

Між тым самі народныя сакратары ў аўтары не прасіліся. Усе, хто бачыў Грамату ці яе копію (напрыклад, у 16-м томе «Беларускае энцыкляпэдыі»), могуць пераканацца, што пасьля тэксту Акту 25 Сакавіка на другой старонцы надрукавана прыпіска: «Гэту Ўстаўную Грамату Рады Беларускай Народнай Рэспублікі прымаем і подпісамі абяцаем спаўняць усе варункі, якія акт гэты патрабуе, і праводзіць іх у жыцьцё». А пасьля прыпіскі ідуць подпісы сяброў Народнага Сакратарыяту.

Між тым у кожнага дакумэнту маецца аўтар або (іншы раз) суаўтары яго праекту («рыбы», «касьцяку»). Не маглі ж гэтыя дзевяць народных сакратароў калектывам, хорам складаць праект. Тым больш што людзі засядалі 12 гадзін запар і нехта зь іх мог вельмі стаміцца. А вынікам 12-гадзіннага пасяджэньня, як сьведчыць Антон Луцкевіч, была кароткая пастанова: «Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвяшчае Рэспубліку незалежнай і выдае стасоўную ўстаўную грамату». Але граматы яшчэ не было.

(Прашу ўлічваць такія акалічнасьці. Тэкст пастановы — сэнсам аднолькавы — у артыкуле «Незалежная Беларусь» («Homan», 3 красавіка 1918 г.) і ва ўспамінах «25 марца» («Наша думка», 25 сакавіка 1921 г.) перадаецца трохі адрознымі словамі. У артыкуле гаворыцца, што Рада засядала з 5 гадзін вечара 24 сакавіка да 5 гадзін раніцы 25 сакавіка, а ва ўспамінах — што з 6 гадзін да 6 гадзін. Гэтае разыходжаньне тлумачыцца тым, што ў першым выпадку падаецца сярэднеэўрапейскі час. Менавіта гэты час быў агавораны ў запрашэньні сябрам Рады на пасяджэньне, якое надрукавана ў 1-м томе «Архіваў БНР» Сяргея Шупы. Далей у артыкуле і ўспамінах адрозьненьне паміж сярэднеэўрапейскім і менскім часам не праводзіцца).

Такім чынам: прыняўшы пастанову, сябры Рады разыходзяцца да 12 гадзін дня на адпачынак (дый дзень сьвяточны — Дабравешчаньне, птушка кубла ня ўе).

Вось у гэты прамежак — паміж шасьцю гадзінамі раніцы і дванаццацьцю гадзінамі дня 25 сакавіка — і нараджаецца тэкст «стасоўнае граматы».

У артыкуле «Незалежная Беларусь» чытаем: «Пасьля адкрыцьця далейшай нарады быў прынят тэкст устаўнай граматы…». Пра тое ж і ва ўспамінах: «…роўна ў 12 гадзін дня Рада прадоўжыла сваё начное засяданьне. Тэкст Устаўное Граматы ўжо гатоў». А хто яго падрыхтаваў — пра тое ані слова.

Аўтар артыкулу «Незалежная Беларусь» прызнаваўся, што тэксту 3-е граматы «прад сабой» ня мае, але даволі дакладна пераказваў яе зьмест. Значыць, быў добра з гэтым тэкстам знаёмы.

Што аўтар гэтага ананімнага артыкулу — Антон Луцкевіч, сумневаў няма, але на падставе гэтага артыкулу нічога пэўнага пра аўтарства Акту 25 Сакавіка сказаць было нельга.

…У 1932 г. Луцкевіч «выбухнуў». Ён доўга трываў асабістыя нападкі на яго «Biełaruskaje Krynicy». Выдатна ведаючы, што фактычна газэтаю кіруе кс.Адам Станкевіч, ён напісаў вялікі артыкул «На ўсенародны суд» і бяз подпісу надрукаваў яго ў «Беларускім Звоне» 13 траўня. У артыкуле ён жорстка крытыкаваў правадыра беларускае хадэцыі і вінавацiў яго ў правакатарстве. Сярод іншага Луцкевіч без усякіх ваганьняў сьцьвярджаў, што падставаю для яго арышту 12 кастрычніка 1927 г. і 7-месячнага зьняволеньня ў Лукішках быў артыкул кс.Станкевіча, у якім той пісаў «аб нябылых зносінах [Луцкевіча] з бальшавіцкім камісарам Мясьніковым».

На артыкул Луцкевіча кс.Станкевіч адказаў сваім артыкулам, а 27 траўня 1932 г. Луцкевіч надрукаваў у «Беларускім Звоне» ананімны артыкул «Палеміка» кс.Станкевіча». І тут мы вычытваем нешта надзвычай цікавае. Пішучы пра сьветлую традыцыю заходнебеларускага грамадзянства штогод сьвяткаваць 25 Сакавіка, ён адзначае: «…сёлета… кс.Станкевіч адрокся ад гэтае сьветлае традыцыі». І пытаецца: «…мо затым, што тварцом Акту 25 Сакавіка 1918 году быў гр.Антон Луцкевіч?!»

Такім чынам, можна сьцьвярджаць: аўтарам 3-е Ўстаўнае граматы Рады БНР, яе праекту, быў Антон Луцкевіч.

Ці ў каго ёсьць пярэчаньні?

## Беларускія сацыял-дэмакраты і бальшавікі

Мне ўжо даводзілася пісаць аб падабенстве паміж бальшавіцкай і нацыяналістычнай гістарыяграфіяй. Напрыклад, бальшавіцкія аўтары пісалі пра тое, што зь «Беларускай сацыялістычнай грамадой бальшавікі вялі самае бязьлітаснае змаганьне». Нацыяналіст Станіслаў Станкевіч давёў гэты тэзіс да крайнасьці: «Беларуская Сацыялістычная Грамада… стаяла далёка ад бальшавіцкага руху, ня маючы зь ім нічагусенькі супольнага». Гэтае выказваньне др. Станкевіча наводзіла на роздум: ці ён быў такі недасьведчаны, ці сьвядома хлусіў? Са смуткам даводзіцца канстатаваць: хлусіў. Як і бальшавікі.

За дзесяцігодзьдзі ідэалягічнага супрацьстаяньня і закрытасьці архіваў нагрувасьціліся горы хлусьні і ненаўмысных памылак. Вось і я, ідучы за іншымі аўтарамі, лічыў, што Беларуская сацыял-дэмакратычная работніцкая група (БСДРГ) 1915—1918 г. утварылася ў выніку разыходжаньняў паміж марксістамі і народнікамі — дзеячамі БСГ. Ды высьвятляецца, што я кепска чытаў А.Луцкевіча, што на тэрыторыі, акупаванай немцамі, не засталося народнікаў з БСГ, а работніцкая група была створана ўнутры Віленскага камітэту Грамады як аўтаномная адзінка і аб'ядноўвала менавіта работнікаў. Я раблю гэтую выснову і на падставе ўспамінаў Луцкевіча «За дваццаць пяць гадоў» (ён пісаў пра БСДРГ як пра «нібы філію Грамады»), і на падставе рукапісу тэлеграмы імпэрскаму канцлеру Нямеччыны, падпісанага Антонам Луцкевічам, Вацлавам Ластоўскім, Дамінікам Сямашкам, Іванам Луцкевічам, а таксама прадстаўнікамі «Беларускай работніцкай групы» — трыма Язэпамі, пра якіх А.Луцкевіч, зноў-такі, піша ва ўспамінах: Салаўём, Ліцкевічам і Туркевічам. Рукапіс гэты захоўваецца ў БДАМЛМ (ф.3, воп.1, адз. захав. 132, арк.3). Зь іншага дакумэнту (адз. захав. 139, арк. 19) можна зрабіць папярэднюю выснову, што БСДГ (і такая абрэвіятура значыцца) была аформілася 6 студзеня 1916 г.

Пра Салаўя і Туркевіча я пісаў у «Arche» (2003, №2). Чытачам можна таксама параіць раман-хроніку Максіма Гарэцкага «Віленскія камунары». Там напісана, што Язэп Туркевіч працаваў сталяром на камбінаце графа Тышкевіча, жыў на Пагулянцы, хадзіў у Беларускі клюб, меў славу шчырага беларуса. Пра Язэпа Салаўя — зь сярэдзіны 1917 г. рэдактара «Гоману» — у рамане гаворкі няма. Затое даецца партрэт Язэпа Ліцкевіча: высокі, сьветлавусы, заўсёды лагодны і вельмі жартаўлівы чалавек. Ведаў ён «шмат народных беларускіх прыказак, сьмешных апавяданьняў, жарцікаў і любіў пагутарыць, пасьмяяцца».

Туркевіч завёў героя раману Мацея Мышку ў віленскі Работніцкі клюб на Вароняй, дзе лекцыі чыталі знакамітыя эсдэкі — Францішак Эйдукевіч (Пранас Эйдукявічус), Цётка і яе муж С.Кайрыс. Там, у клюбе, Мацей Мышка пачуў гутарку Ліцкевіча з Цёткаю, якая скончылася словамі: «Эх, Цётка! Ня мне казаць, не табе слухаць... Павінна ты гэта ведаць лепей за мяне… Я — рабочы. Я — інтэрнацыяналіст. Дзе я працую — там маё і ўсё».

Ведама, раман ёсьць раманам — не бяз выдумкі, але…

Я таму так падрабязна пішу пра БСДРГ, што адзін зь яе лідэраў — Я.Ліцкевіч — у 1918 г. стаў бальшавіком.

Калі напрадвесьні 1918 г. немцы акупавалі амаль усю Беларусь, перад сацыялістамі і камуністамі стаяла пытаньне: што рабіць і як? Сацыял-дэмакраты Эйдукевіч, Ліцкевіч і Луцкевіч ды інш. выйшлі на кантакт з бальшавікамі. Эйдукевіч і Ліцкевіч бальшавізаваліся і прадстаўлялі былых сацыял-дэмакратаў у Краёвым камітэце камуністычных арганізацый акупаванай Беларусі і Літвы (са жніўня). Пералічваючы сяброў гэтага камітэту, «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» піша: Ю. (Юзаф?) Ліцкевіч.

Пра тое, што Луцкевіч кантактаваў з бальшавікамі і ўдзельнічаў у падпольнай нарадзе зь імі, можна прачытаць ва ўспамінах яшчэ аднаго сябра Краёвага камітэту, былога польскага эсдэка Адама Славінска-



УСТАЎНАЯ ГРАМАТА
РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Год назад народы Беларусі разам з народамі Расіі скінулі ярмо Расійскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь; ні пытаючися народу, іон кінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускіе. Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднаго краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расійскіе цары на наш вольны і незалежны край. Ад гэтаго часу БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА АБВЕШЧАЕЦЦА НІЗАЛЕЖНАЙ І ВОЛЬНАЙ ДЗЯРЖАВАЙ. Самі народы Беларусі, у асобі свайго Ўстаноучаго Сойму, пастановяць аб будучых дзяржаўных звязях Беларусі.

На моцы гэтаго траціць сілу усе старыя дзяржаўныя зьвязі якія далі магчымасьць чужому ураду падпісаць і за Беларусь трактат у Берэсьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелючы зямлю яго на часткі. На моцы гэтаго урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае увайсьці у адносіны з зацікаўленымі старонамі, прапануючы ім перагледзіць тую часціну Берэсьцейскаго трактату, якая датычыць Беларусі, і падпісаць міравую умову з усімі ваюючымі дзяржавамі.

Беларусская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічебную перевагу беларускі народ, а ласьне: Магілеўшчыну, беларускія часьціМіншчыны, Гродзеншчыны /з Гродняй Белостокам і інш/. Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чэрнігаўшчыны і сумежныя часьці суседніх губерняу, заселеныя беларусамі.

Беларуская Народная Рэспубліка падцьверджывае усе тыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны Устаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918г.

Абвешчаючы аб нізалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што ўсе любячые волю народы дапамогуць беларускаму народу ў поўнай меры здейсьніць яго палітычна-дзяржаўные ідэалы.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі
Дана у Менску-Беларускім
25 сакавіка 1918 году

Гэту Устаўную Грамату Рады Беларускай Народнай Рэспублікі прыймаем і падпісамі абецаем споўняць усе варункі, якіе акт гэты патрабуе, і праводзіць іх у жыцце.

Часовы Старшыня Ураду Язэп Варонка
Сакратары:

Трэцяя Ўстаўная грамата ўраду БНР з подпісамі народных сакратароў.

га, зьмешчаных ва ўкладзенай Самуілам Агурскім кнізе «Кастрычнік на Беларусі: Зборнік матэрыялаў і дакумэнтаў» (1927). Спачатку я думаў, што тут памылка друку, што гаворка пра Ліцкевіча, але зірнуў у паказьнік імёнаў і пераканаўся, што памылкі няма: Ліцкевіч і Луцкевіч не ўтаясамленыя.

Пра што мог размаўляць Луцкевіч са Славінскім ды іншымі «інтэрнацыяналістамі»?

Ускосны адказ на гэтае пытаньне дае інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў дзёньніку Луцкевіча. Узначальваючы ўвосень 1918 г. Надзвычайную дэлегацыю Рады БНР у гетманскай Украіне, ён вёў адначасна перамовы зь вядомым дзеячам сацыял-дэмакратычнага руху ў Баўгарыі, Румыніі, Нямеччыне і Расеі, а ў 1918—1923 г. старшынём Саўнаркаму Украінскае ССР Хрысьціянам Ракоўскім. Гаворка ішла пра будучыню Беларусі. Луцкевіч піша, што Ракоўскі фармуляваў магчымую ўгоду паміж РСФСР і БНР «на гэткіх трох асновах: прызнаньне незалежнасьці Беларусі, адначаснае апавяшчэньне фэдэрацыі з савецкай Расеяй і ўвядзеньне ў Беларусі савецкай канстытуцыі». Аднак Ленін, Сталін, Мясьнікоў ды інш. яшчэ не дасьпелі, каб прыняць два першыя пункты. Дасьпеюць яны толькі ў другой палове сьнежня, калі згодзяцца на абвяшчэньне БССР.

Нельга выключыць, што і на той нарадзе, пра якую згадваў Славінскі, Антон Луцкевіч гутарыў з бальшавікамі перш-наперш пра Беларусь.

### Чаму не «раскруцілі» «тактычны цэнтар»?

Пра «Саюз вызваленьня Беларусі» цяпер ёсьць нямала публікацый. Маюцца таксама публікацыі пра «Беларускі філіял меншавікоў», «Беларускі філіял прампартыі» і «Беларускі філіял Працоўнай сялянскай партыі» (тут трэба згадаць працы Ўладзімера Міхнюка і Тацяны Процькі).

Тры апошнія «справы» былі ўсчатыя ДПУ ўжо пасьля таго, як амаль усе «дзеячы» «СВБ» былі высланыя за межы Беларусі (былога рэвалюцыйнага матроса Алеся Гурла, асуджанага на 5 гадоў, пакінулі ў Менску: сухоты зрабілі яго нетранспартабэльным). «Справа» «БФПСП» была заведзена ў траўні 1931 г., а дзьвюх астатніх «філіяў» — улетку таго ж году. Але яе асноўныя рысы былі вядомы ўжо ў канцы сакавіка.

20 сакавіка ў Менску адкрыўся III Усебеларускі зьезд калгасаў (трэці таму, што калгасы меліся і да калектывізацыі і, хоць у час калектывізацыі тыя — клясава нячыстыя — калгасы разагналі, парадкавы нумар зьезду захавалі). З дакладам на гэтым зьезьдзе выступіў другі сакратар ЦК КП(б)Б Васіль Шаранговіч. Гаворачы пра «СВБ», ён адзначыў: «Даныя і факты, якія мы маем за апошні час, гавораць аб тым, што справа не ідзе аб нейкай групы беларускіх інтэлігентаў, якая нібы змагалася за ажыцьцяўленьне на буржуазным прынцыпе адзінства беларускай нацыі і культуры. Справа, зразумела, ня ў гэтым. Ясна, што гэта таксама было адным з элементаў іх праграмы і дзеяў. Уся справа зводзілася да велізарнага разгортваньня шкодніцкай работы, да падрыхтоўкі разам з польскімі фашыстамі і, па сутнасьці, пад іх кіраўніцтвам разам і пры дапамозе Прампартыі, меншавіцкага маскоўскага цэнтру і Працоўнай сялянскай партыі, — інтэрвэнцыі…».

Вось як! Беларускія нацдэмы пад кіраўніцтвам польскіх фашыстаў зьядналіся з «прампартыяй», «трудавікамі» і меншавікамі (і зь імі — ворагамі беларускае дзяржаўнасьці і адэптамі «единой и неделимой»)…

Шаранговіч паведаміў, што ў БССР быў створаны тактычны цэнтар — шкодніцкая арганізацыя, «у якую ўваходзілі і беларусы, і яўрэі, і расійцы, і так званыя эсэры, і меншавікі, і проста сволач».

Чытаючы даклад В.Шаранговіча ў «Савецкай Беларусі» за 30 сакавіка 1931 г., я вачам сваім не паверыў. «Тактычны цэнтар». Дзе я сустракаў такія словы? Ці не ў Аляксандра Салжаніцына? Так і ёсць: у «Архіпэлягу ГУЛАГу» (частка першая, разьдзел 8 «Закон — дзіця») апавядаецца, што «справа» «Тактычнага цэнтру» разглядалася 16—20 жніўня 1920 г. у Маскве. Гэта быў антыінтэлігенцкі працэс з 28 падсуднымі і пэўнай колькасьцю абвінавачаных завочна. Па «справе» праходзіла і Аляксандра Талстая, малодшая дачка «таго самага» Талстога.

Цяпер — у 1931 г. — і Беларусь дачакалася свайго «тактычнага цэнтру».

Выявілася, што яшчэ да выкрыцьця «СВБ» меншавікі, «прампартыйцы» і «трудавікі» гутарылі з нацдэмамі аб будучым урадзе. Вось як павінен быў выглядаць гэты ўрад. Крэсла прэм'ер-міністра і міністра замежных спраў прызначалася Цьвікевічу. Ня сказана, катораму — Аляксандру ці Івану? Хутчэй за ўсё, першаму. Міністрам гандлю і прамысловасьці меркавалася прызначыць інжынэра Аляксандра Галавінскага, а намесьнікам яго — Каплана. Шаранговіч удакладняе: «Каплан — гэта кіраўнік цэнтральнай часткі прампартыі ва ўмовах Беларусі». Партфэль міністра аховы здароўя чакаў доктара Паўла Трамповіча. Міністрам фінансаў меўся стаць «нехта з «прампартыі», а міністрам па вайсковых справах — «нехта з-за мяжы» («Больш верна, — кажа другі сакратар ЦК, — генэрал Булак-Балаховіч»). На месца міністра асьветы думалі прызначыць Сьцяпана Некрашэвіча ці Язэпа Лёсіка. Яшчэ больш было кандыдатаў на пасаду міністра земляробства — Аркадзь Смоліч, Гаўрыла Гарэцкі або Радзівон Бонч-Асмалоўскі (два апошнія зь «філіялу Сялянскай працоўнай партыі»; праўда, Гарэцкі ўжо прайшоў па «справе» «СВБ»).

> Пра свой «міністэрскі партфэль» акадэмік Гаўрыла Гарэцкі нічога не апавядаў нават сыну.

Калі я агучваў гэты фрагмэнт дакладу В.Шаранговіча ў адной грамадзе, акадэмік Радзім Гарэцкі прызнаўся, што ён першы раз чуе пра міністэрскі партфэль для свайго бацькі. Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі нічога не апавядаў пра гэта свайму сыну. Нават пра само абвінавачаньне ў прыналежнасьці да «тактычнага цэнтру».

На той імпрэзе прысутнічалі таксама гісторыкі Ўладзімер Міхнюк і Віталь Скалабан. Было відаць, што і яны першы раз чуюць пра «наш» «тактычны цэнтар». Магчыма, нехта з гісторыкаў зацікавіцца гэтым сюжэтам і адкажа на пытаньні: чаму партыя і яе збройны атрад — ДПУ — не далі ходу «справе» «тактычнага цэнтру», не пачалі новых справаў супроць нацдэмаў адразу, а адклалі іх на пазьнейшы час?

# Ці можа беларускамоўны стаць афіцэрам Беларускае арміі



Маладафронтавец Алесь Смольскі, адлічаны з Суворaўскай, шкадуе, што не пасьпеў сабраць подпісы за наданьне вучэльні імя Касьцюшкі.

Былы курсант Менскай суворaўскай вайсковай вучэльні маладафронтавец Алесь Смольскі працягне навучаньне ў адной з жодзінскіх школ.

Алесь правучыўся ў Суворaўскай чатыры з паловай гады. «Я ня быў выдатнікам, але асаблівых праблемаў з навукай у мяне не было. — Дый вучоба падабалася», — кажа хлопец.

Праблемы ў юнака пачаліся ў сьнежні, калі кіраўніцтва вучэльні дазналася пра яго ўступленьне ў шэрагі незарэгістраванага «Маладога фронту». У асабістых рэчах юнака знайшлі членскі білет арганізацыі, які і канфіскавалі як рэчавы доказ. За лічаныя дні кіраўніцтва падпісала загад аб адлічэньні, а камандзір узводу Юры Пуцятаў патэлефанаваў бацькам — каб тыя прыехалі і забралі сына. Напярэдадні Калядаў Алесь здаў форму і забраў дакумэнты.

Больш за астатніх перажывае бабуля хлопца. Гэта была яе ініцыятыва — зрабіць з унука сапраўднага «суворaўца». Сам маладафронтавец шкадуе толькі, што не пасьпеў рэалізаваць сваю запаветную мару — сабраць подпісы за наданьне вучэльні імя Тадэвуша Касьцюшкі. «Тое, што вучэльня носіць імя Суворава, — гэта абраза для патрыётаў», — упэўнены хлопец.

Пытаньне «Куды далей?» выклікае пэўную разгубленасьць: «Раней хацеў стаць вайскоўцам, аднак цяпер прыйдзецца падумаць пра іншую прафэсію».

**Юлія Дарашкевіч, фота аўтара**

## ХРОНІКА

Сьвятар незарэгістраванай Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай (народнай) царквы айцец **Леанід Акаловіч** 25 лістапада атрымаў штраф ад адміністрацыі Маскоўскага раёну Менску за «стварэньне рэлігійнай арганізацыі й кіраваньне ёю».

У сьнежні ў Гарадку (Віцебшчына) адбыўся суд па справе сябра БСДГ, дырэктара Ворхаўскай базавай школы, дэпутата райсавету **Леаніда Гаравога**, якога абвінавачвалі ў хуліганстве; судзьдзя Натальля Карабліна прыняла рашэньне спыніць справу. Сп.Гаравы думае, што гэта была спроба запалохаць яго за палітычную дзейнасьць. Ён кандыдаваў у палату прадстаўнікоў ад дэмакратычнае кааліцыі.

14 сьнежня адміністрацыя Маскоўскага раёну Менску прыгразіла ліквідаваць будынак пратэстанцкага храму **царквы «Новае жыцьцё»**. 28 сьнежня на 3 млн 600 тыс. руб. аштрафаваны адміністратар грамады гэтай царквы **Васіль Юрэвіч** за арганізацыю «незаконнага сходу чальцоў грамады».

Карэспандэнта **сайту «Прафсаюзны рух Беларусі»** 17 сьнежня не пусьцілі на прэс-канфэрэнцыю старшыні ФПБ Леаніда Козіка.

**Валера Леванеўскага** 21 сьнежня перавялі ў Магілёўскую калёнію агульнага рэжыму.

22 сьнежня **Вера Страмкоўская** напярэдадні працэсу над Міхаілам Марынічам атрымала ад Менскай гарадзкой калегіі адвакатаў строгую вымову за «грубае парушэньне правілаў адвакацкай этыкі». Яна зьвязвае гэта з абаронай М.Марыніча.

Актывістаў незарэгістраванага «Зубра» **Мікіту Сасіма** і непаўналетнюю **Настасьсю Шашкову** затрымалі 22 сьнежня, калі яны раскідвалі ў цэнтры сталіцы з дахаў дамоў улёткі ў падтрымку М.Марыніча; складзены пратаколы. Іх жа, а таксама **Кацярыну Дзіяткоўскую** й **Ніку Лазоўскую** 27 сьнежня затрымалі каля ўкраінскага пасольства ў Менску: яны навязвалі аранжавыя стужкі на агароджу.

22 сьнежня невядомыя ў цывільным і міліцыянты правяліператрус у офісе **грамадзянскай ініцыятывы «Партнэрства»** й забралі сыстэмныя блёкі кампутараў. Падчасператрусу быў затрыманы апэратар расейскай тэлекампаніі «Ren TV» **Уладзімер Косьцін**.

Уначы на 23 сьнежня ў **офісе АГП** пабывалі невядомыя, якія быццам бы сьпісалі інфармацыю з сыстэмных блёкаў кампутараў.

**РГА «НІСЭПД»** 24 сьнежня атрымала папярэджаньне ад Мінюсту: у публікацыі ў «Народнай волі» спасылка на НІСЭПД давалася без указаньня, што гэта грамадзкае аб'яднаньне. Для Інстытуту гэты ліст — дзявяты за тры з паловай месяцы. Кіраўніцтва НІСЭПД мяркуе, што такім чынам сацыёлягаў хочуць запалохаць, каб яны спынілі дзейнасьць.

Мінінфармацыі 24 сьнежня адмовіла гарадзенскай газэце **«Биржа информации»** скараціць тэрмін прыпыненьня выданьня.

Пракуратура Беларусі вынесла 24 сьнежня афіцыйнае папярэджаньне галоўнаму рэдактару «БДГ» **Пятру Марцаву** за артыкул «Пад ударам. Пракуратура ініцыявала распрацоўку найбліжэйшага атачэньня Тозіка», апублікаваны пад псэўданімам «Георгій Дань»: Марцаў адмовіўся назваць пракурорам аўтара артыкулу й крыніцы інфармацыі.

24 сьнежня стала вядома, што спэцдакладчыку Камісіі ААН па правах чалавека па Беларусі **Адрыяну Сэвярыну** адмоўлена ў беларускай візе.

24 сьнежня актывістка АГП **Марына Багдановіч** атрымала позву ў пракуратуру Ленінскага раёну Горадні, а намесьніца старшыні АГП **Людміла Гразнова** — у пракуратуру Менску.

Актывіст «Зубра» **Аляксандар Казакоў** затрыманы людзьмі ў цывільным 26 сьнежня ў Барысаве за вывешваньне аранжавага сьцяга. «Зуброўцаў» **Руслана Мацьвеева** і **Зьмітра Дубіцкага** затрымалі 27 сьнежня ў Менску каля раённага суду, дзе яны клеілі ўлёткі з партрэтам Марыніча перад пачаткам пасяджэньня.

28 сьнежня на **Андрэя Клімава** пракуратура Менску распачала крымінальную справу за «абразу прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі» ў кнігах «Відавочныя ісьціны» ды «Я зрабіў свой выбар».

27 сьнежня Менгарвыканкам адмовіў недзяржаўнай газэце **«Вольны горад»** з Крычава ў атрыманьні юрыдычнага адрасу; у самім Крычаве рэдакцыя таксама ня можа атрымаць юрадрас і, адпаведна, зарэгістравацца.

Калегія па грамадзянскіх справах Менгарсуду 27 сьнежня адмовілася аднавіць на працы авіядыспэтчара **Алега Доўбіка**, звольненага за прафсаюзную дзейнасьць.

У менскім парку Янкі Купалы 28 сьнежня затрыманы блізу 20 удзельнікаў навагодняга сьвяткаваньня, у тым ліку **М.Багдановіч** (АГП), актывістка «Зубра» **Ірына Тоўсьцік**, журналістка «Народнай волі» **Вольга Класкоўская**, «маладафронтаўцы» **Зьміцер Дашкевіч** і **Артур Фінькевіч**.

У Віцебску за раздаваньне каляндарыка радыё «Свабода» 28 сьнежня затрыманы сябры ПБНФ **Кастусь Горны** і **Ўладзіслаў Токараў**.

28 сьнежня Ганцавіцкі раённы вузел электрасувязі адмовіў газэце **«Ганцавіцкі час»** у просьбе разьмясьціць рэкляму ў этэры раённага радыёвяшчаньня, спаслаўшыся на адсутнасьць тэхнічнай магчымасьці.

Беларускі прафсаюз работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці **(РЭП)** 29 сьнежня зьвярнуўся ў Камітэт па свабодзе аб'яднаньня Міжнароднай арганізацыі працы са скаргай на дзеяньні ўладаў Беларусі: у Слуцку і Гомелі ўлады сілком пераводзяць сяброў РЭПу ФПБ.

30 сьнежня актывіст «Зубра» **Павал Угрыновіч** звольнены з працы на Магілёўскім домабудаўнічым камбінаце за ўдзел у акцыях у падтрымку Міхаіла Марыніча.

**АШ**

# Успамін пра маіх сумных бл.дзей

**ГАБРЫЭЛЬ ГАРСІЯ МАРКЕС**

Інапярэдадні свайго дзевяностагодзьдзя я, не палуднаваўшы, ня мог сканцэнтравацца на чытаньні, чакаючы навінаў ад Розы Кабаркас. Цыкады ўзрывалі стракаценьнем сьпёку другой гадзіны дня, сонца цягнулася ад аднаго расчыненага акна да іншага, змусіўшы мяне тры разы мяняць месца для гамака. Мне заўсёды здавалася, што на мае народзіны выдаюцца самыя сьпякотныя дні году, і я навучыўся прыстасоўвацца да гэтага; але ў той дзень настрой быў не такі. А чацьвёртай я паспрабаваў супакоіць сваю істоту шасьцю сюітамі для віялянчэлі, напісанымі Ёганам Сэбасьцьянам Бахам ды пададзенымі мне Пабла Касальсам. Я лічу іх самымі мудрымі з усяе музыкі, але, замест таго, каб супакоіць, сюіты пакінулі мяне ў стане найгоршай прастрацыі. Я пачаў важыць носам табаку падчас гучаньня другой, якая мне здаецца крыху лянотнай, і ў сьне стаў блытаць ныцьцё віялянчэлі з працяглымі скаргамі сумнага карабля, які паплыў і не вярнуўся. І якраз у гэты момант мяне разбудзіў тэлефон, і пржавелы голас Розы Кабаркас вярнуў мяне да жыцьця.

— Табе шанцуе, як апошняму дурню, — сказала яна. — Я знайшла табе найлепшую дзяўчынку, як ты хацеў, але ёсьць адна перашкода: ей яшчэ ўсяго каля чатырнаццаці.

— Я шчэ не забыўся, як мяняць пялюшкі, — адказаў я жартам, не разумеючы намёкаў.

— Не табе іх мяняць, — адказала яна, — але хто будзе плаціць, калі мне дадуць тры гады турмы?

Ніхто ня будзе плаціць, а яна тым болей, канечне. Яна зьбірала свой ураджай між малалетак, якія працавалі ў ейнай краме. Яна іх пасьвячала і выціскала — ажно пакуль не даводзіла да жыцьця апошніх прастытутак з вартага гісторыі бардэлю «Чорная Эўфэмія». Роза ніколі не плаціла штрафаў, бо ейны двор быў аркадыяй для мясцовых кіраўнікоў, ад губэрнатара да апошняга прайдзісьвета з муніцыпалітэту, і было цяжка ўявіць, каб гаспадыні не хапала магчымасьцяў парушаць закон у сваё задавальненьне. Такім чынам, апошнімі ваганьнямі яна толькі старалася павысіць свой ганарар за паслугу, які, натуральна, быў тым вышэйшым, чым больш даваў за такую лянотнасьць судзьдзя. Давялося накінуць яшчэ два пэса за паслугі, і мы дамовіліся, што а дзясятай вечара я буду ў яе дома з пяцьцю пэса наяўнымі, якія я павінен заплаціць наперад. Ні хвілінай раней, бо дзяўчынка мусіла накарміць і пакласьці спаць сваіх малодшых братоў ды сёстраў, а таксама дапамагчы легчы ў ложак паралізаванай рэўматызмам маці.

Заставалася чатыры гадзіны. Па меры таго як яны праходзілі, сэрца маё напаўнялася нейкай кіслотнай пенай, якая замінала дыхаць. Я зрабіў марнае намаганьне забіць час, наводзячы марафэт. Нічога новага, канечне ж, бо нават Даміяна кажа, што я апранаюся, нібы біскуп на службу. Я пагаліўся адмысловым нажом, быў змушаны пачакаць, пакуль крыху астыне вада ў душы, пераграэтая ў трубе на сонцы, і між тым зноў спацеў ад простага намаганьня, зробленага дзеля таго, каб абцерціся ручніком. Я апрануўся ў поўнай адпаведнасьці з маёй начной авантурай: касьцюм зь белага лёну, кашуля ў блакітныя палоскі ды зь цьвёрдым каўняром, белы гальштук з кітайскага шоўку, паднуўленыя цынкавым бялілам чаравікі, гадзіньнік з чыстага золата, прычэплены ланцужком да гафткі. І ўрэшце я падкасаў калашыны, каб не было заўважна, што я стаптаўся прыблізна на пядзю.

Мяне лічаць скнапным чалавекам, бо ніхто не паверыць, што я менавіта празь беднасьць жыву там, дзе жыву. А насамрэч тая ноч у сваім грашовым эквіваленце нашмат пераўзыходзіла мае рэсурсы. З куфра-схованкі, запхнутага пад ложак, я дастаў свой скарб. Два пэса за пакой, чатыры — для гаспадыні, тры — для дзяўчынкі і пяць — запас: на вячэру ці якія яшчэ дробныя выдаткі. Гэта і былі тыя 14 пэса, якія мне плаціць раз на месяц газэта за мае нядзельныя нататкі. Я схаваў іх у сакрэтную кішэньку скуранога рамяня і чмыхнуў на сябе балёнчыкам «Agua de Florida de Lanman & Kemp-Barclay & Co». У той момант мая істота адчула лёгкую драпіну панікі, і зь першым ударам звона а восьмай вечара я вобмацкам спусьціўся па лесьвіцы, пацеючы ў змроку ад страху, і выйшаў у ноч, што выпраменьвала мае чаканьні.

Пасьвяжэла. На бульвары Калюмба купкі мужчынаў гучна спрачаліся пра футбол, стоячы між пашыхтаваных пасярод праезнай часткі таксовак. Вандроўныя музыкі гралі лянотны вальс між квеценi алеяў Coriaria ruscifolia. Адна з гаротных прастытутачак, якія палююць паважаных кліентаў на вуліцы натарыюсаў, папрасіла ў мяне цыгарэту — як заўсёды, і я адказаў таксама, як заўсёды. Сёньня трыццаць тры гады, два месяцы і сямнаццаць дзён з таго часу, як я кінуў паліць. Мінаючы залаты «El Alambre», глянуў у падсьветленыя вітрыны і ня ўбачыў таго сябе, якога чакаў убачыць. Я быў старэйшы і горш апрануты.

Надыходзіла дзясятая, калі я злавіў таксоўку і папрасіў кіроўцу завезьці мяне да могілак «Universal», каб ён не здагадаўся, куды мне насамрэч трэба. Таксіст хітравата зірнуў на мяне ў люстэрка і сказаў:

— Ня трэба мяне палохаць, мудры чалавек, няхай мяне Бог беражэ такім жа жывым, як вас!

Мы разам выйшлі з машыны ля могілак, бо ў кіроўцы не было дробязі. Мусілі мяняць грошы ў «Магіле» — бедңай кавяраньцы, дзе аплакваюць сваіх нябожчыкаў заўсёдныя п'янічкі. Калі я разьлічыўся, кіроўца папярэдзіў мяне з сур'ёзным выразам твару:

— Будзьце асьцярожныя, спадару, бо ў доме Розы Кабаркас няма ўжо і ценю таго, што было раней.

Мне нічога не заставалася, апроч як падзякаваць; я быў перакананы — як і ўсе — дла таксістаў з бульвару Калюмба не існуе ніводнага сакрэту ў гэтым сьвеце.

Я заглыбіўся ў раён беднякоў, які ўжо ня меў абсалютна нічога супольнага з тым, што я памятаў. Гэта былі тыя самыя шырокія вуліцы гарачага пяску, дамоў з адчыненымі дзьвярамі, сьценаў зь негабляваных дошак, дахаў з чорнай пальмы і двырыкаў са жвірам. Але людзі гэтых вуліц страцілі спакой. У большасьці дамоў гулі кампаніі пятнічных музыкаў-гуляк, чые бубны ды талеркі даставалі да вантробаў. Яны маглі за 50 сэнтава зайсьці на сьвята, якое больш было даспадобы, апрача таго мелі магчымасьць на дурніцу застацца танцаваць на ганку. Я крочыў, а пад маёй франтаватай апраткай палала жаданьне праваліцца пад зямлю. Але ніхто не зьвярнуў на мяне ўвагі, апрача кашчавага мулата, які драмаў, седзячы ля дзьвярэй аднаго з дамоў.

— Шчасьліва, доктар! — прароў ён. — Шчасьліва патрахацца!

Што я мог зрабіць, апроч як падзякаваць яму? Мне прыйшлося тры разы спыняцца, каб аддыхацца, пакуль я дапяў апошняга пад'ёму. Адтуль быў бачны вялізны мядзяны месяц над гарызонтам; і раптам нечаканы сыгнал з страўніка змусіў мяне пачаць баяцца за посьпех справы, але ўсё прайшло. У канцы вуліцы, дзе кварталы пераўтвараліся ў лес фруктовых дрэваў, я зайшоў у краму Розы Кабаркас.

Гаспадыня была ўжо ня тая, што раней. Гэтая самая незаўважная і таму самая вядомая мадам. Жанчына вялікіх памераў, якую мы жартам клікалі сяржанткай пажарнае службы — як праз мажнасьць, так і праз эфэктыўнасьць у справе тушэньня сьвечак для кліентаў. Але адзінота ссушыла цела, зморшчыла скуру і зрабіла голас такім дзіўна высокім, што цяпер яна нагадвала старую дзяўчынку. Ад ранейшай у ёй засталіся толькі цудоўныя зубы, адзін зь якіх гульліва паблісківаў золатам. Роза трымала жалобу па памерлым пасьля паўстагодзьдзя сумеснага жыцьця мужу, жалоба тая стала яшчэ чарнейшая са зьяўленьнем чорнае шапачкі — пасьля сьмерці адзінага сына. Сына, які дапамагаў маці ў яе бядотах. Жывымі ў Розы заставаліся толькі вочы — празрыстыя і жорсткія, — і менавіта дзякуючы ім я заўважыў, што натура гэтае жанчыны не зьмянілася.

Цьмянае сьвятло адзінае лямпы разьлівалася па краме, і на паліцах не было амаль нічога на продаж — яны былі слабой шырмачкай для бізнэсу, пра які ўсе ведалі, але ніхто не казаў. Якраз у той момант, калі я ўвайшоў на дыбачках, Роза Кабаркас справаджвала аднаго з кліентаў. Ня ведаю, ці яна насамрэч мяне не пазнала, ці проста зрабіла выгляд — зь меркаваньняў этыкету. Пакуль Роза вызвалялася, я прысеў на крэсла для чаканьня і паспрабаваў згадаць, якой яна была. Думаю, яна прачытала мае думкі. Калі мы былі маладыя, Роза пару разоў зьдзіўляла мяне гэтым. Вось і цяпер яна павярнулася да мяне і праэкзамэнавала сваім позіркам так пранізьліва, што стала трывожна.

— Час цябе не бярэ, — з сумам прашаптала яна. Мне захацелася зрабіць ёй прыемнае:

— А цябе — бярэ, але табе гэта на карысьць.

— Сур'ёзна, — сказала яна. — Нават твая мёртвая конская морда крыху аджыла.

— Відаць, таму што памяняў кармушку, — адказаў я жартам. Настрой у яе палепшыў.

— Колькі сябе памятаю, у цябе быў чэлес, як у катаржніка на галерах, — сказала яна. — Як ён маецца?

Я выкруціўся:

— Адзінае, што зьмянілася з часу нашае апошняе сустрэчы, — цяпер мне часам пячэ ў срацы.

Яе дыягназ быў імгненны:

— Бо мала задзейнічаная.

— Я сракай раблю толькі тое, для чаго мне Бог яе даў, — адказаў я. — Але ўсё адно пячэ ў срацы з даўніх часоў, і кожны раз — на поўню.

Роза пакалупалася ў сваёй кравецкай скрыньцы ды адчыніла бляшаначку зь зялёным шмаравідлам, якое пахла арнікай.

— Скажы дзяўчынцы, каб намазала табе яе пальчыкам вось так, — яна зь бесцаромнай красамоўнасьцю рухала ўказальным пальцам. Я адказаў, што, дзякуй богу, пакуль здольны даць сабе рады і безь сялянскіх мазяў. Яна буркнула:

— Ай, маэстра, прабачце на праміль бог, — і страціла да мяне інтарэс.

— Дзяўчынка ў пакоі ад дзясятай гадзіны, — сказала Роза. — Яна прыгожая, чысьценькая і добра выхаваная, але амаль мёртвая ад страху, бо адна яе сяброўка, што ўцякла з грузчыкам з Гайры, сьцякала крывёю дзьве гадзіны. Але добра, — зазначыла Роза. — Гэта можна зразумець, нездарма ж пра хлопцаў з Гайры кажуць, што пад імі нават асьліца застогне.

І яна вярнулася да асноўнай думкі:

— Бедненькая, апрача ўсяго яна яшчэ і цэлы дзень працуе на фабрыцы, прышывае гузікі.

Мне гэты занятак ня здаўся надта цяжкім.

— Гэта мужчыны так лічаць, — адказала яна. — Але гэта цяжэй, чым часаць камяні.

Апрача таго Роза паведаміла, што дала дзяўчынцы пітво з бромам і валяр'янкай, дык малая заснула. Я баяўся, што гэтае шкадаваньне скончыцца чарговым падвышэньнем цаны, але не: Роза сказала, што ейнае слова — закон. Правілы цьвёрдыя: кожная рэч аплачваецца асобна, наяўнымі і наперад. Так і зрабілі.

Я ішоў за ёю па двары, расчулены зьвяласьцю яе скуры і тым, як яна ішла — распухлыя ногі ў баваўняных панчохах. Поўня падбіралася да цэнтру неба, і сьвет нібы патанаў у зялёных водах. Каля крамы была пальмавая паветка для гулянак мясцовага начальства, са шматлікімі паабіванымі скурай табурэткамі і гамакамі, падвешанымі да падпорак. На заднім дворыку, дзе пачынаўся лес фруктовых дрэваў, была галерэя з шасьці цагляных нетынкаваных адпачывальняў, на вокнах — сетка ад маскітаў. У адзінай занятай гарэла цьмянае сьвятло ды Тоньяла Нэгра сьпявала па радыё песьню пра нешчасьлівае каханьне. Роза Кабаркас удыхнула паветра:

— Балеро — гэта жыцьцё.

Я быў цалкам згодны, але дагэтуль не адважваўся напісаць гэта. Яна штурхнула дзьверы, зайшла на імгненьне і адразу вярнулася.

— Сьпіць, як і спала, — сказала Роза. — Ты зрабіў бы добра, каб даў ёй адпачыць столькі, колькі патрабуе цела: твая ноч даўжэйшая за яе ноч.

Мае думкі пераблыталіся:

— Што ты хочаш, каб я рабіў?

— Ты зразумееш, — сказала яна зь нейкай ненатуральнай для сытуацыі мяккасьцю, — нездарма ж ты мудры. — Яна павярнулася і пакінула мяне сам-насам з маім страхам.

Шляху назад не было. Сэрца шалёна калацілася, калі я зайшоў у пакой і ўбачыў дзяўчынку: яна спала, была голая і безабаронная на вялізным несваім ложку — як маці нарадзіла. Ляжала крыху на баку, тварам да дзьвярэй, яскрава асьветленая лямпай, што не пакідала схаванай ніводнай драбніцы. Я прысеў на край ложка, каб любавацца ёе цалам. Усе мае пяць органаў пачуцьцяў былі зачараваныя. Яна была чарнявая і цёплая. Яе падвяргалі рэжыму гігіены і адточваньня прыгажосьці, не забываючыся і на нясьмелы пушок на лабку. Ёй завівалі валасы, і на пазногцях рук ды ног мела яна натуральную паліву, але скура колеру патакі выглядала грубай і змучанай. Нядаўна народжаныя грудзі яшчэ былі зусім як у



Габрыэль Гарсія Маркес — калюмбійскі пісьменьнік, нобэлеўскі ляўрэат. Найбольш вядомыя раманы — «Сто гадоў адзіноты» і «Восень патрыярха». Сваёй творчасьцю сфармаваў стыль, названы «магічным рэалізмам». На беларускую мову творы Маркеса перакладаў Карлас Шэрман. Новы раман пісьменьніка ў першы ж дзень пабіў рэкорды кніжных продажаў у гішпанамоўным сьвеце. Ня дзіва — гэта першы за апошнія дзесяць гадоў вялікі твор культавага раманіста. Шалёныя спрэчкі ў друку выклікала й ужываньне ў загалоўку не зусім цэнзурнага слова putas. Прадавець бэстсэлер пачалі ў сярэдзіне кастрычніка, за тыдзень да афіцыйнай прэзэнтацыі. Гэткі сьпех быў выкліканы зьяўленьнем на рынку пірацкага выданьня кніжкі, коштам усяго 5 эўра. Аўтар, у сваю чаргу, перад самым выхадам раману крыху зьмяніў апошні разьдзел, чым зьменшыў каштоўнасьць «пірацкіх вэрсіяў».



ДЫЕГА РЫВЭРА. «ПРАДАВАЧКА КВЕТАК»

хлопчыка, але ўжо былі прыўзьнятыя нейкай схаванай энэргіяй, гатовай вось-вось выбухнуць. Найлепшымі зь ейнага цела былі ногі, створаныя для таемных крокаў, з доўгімі ды пачуцьцёвымі пальцамі — як у некаторых на руках. Нягледзячы на вэнтылятар, яна была ўся прапітаная фасфарасцэнтным потам, і гарачыня рабілася ўсё больш нясьцерпнаю па меры таго, як насоўвалася ноч. Было немагчыма ўявіць, якім насамрэч быў яе шчодра размаляваны твар: густы слой рысавай пудры з двума яблычкамі румянаў на шчоках, штучныя вейкі, нібы падвэнджаныя сажай бровы, павялічаныя шакаляднай касмэтыкай вусны. Але нават такі марафэт ня мог схаваць яе характару: ганарлівы нос, злучаныя бровы, яркія вусны. Я падумаў: «Пяшчотны баявы бычок».

Аб адзінаццатай па заўсёдных справах я падаўся ў ванны пакой, дзе знайшоў бядняцкую дзявочую апратку, складзеную з паважнасьцю багацейкі: кісейны касьцюм у матылькі, жоўтыя штаны зь дзіўнага матэрыялу і сандалі з валокнаў агавы. На адзеньні ляжаў надзвычай танны бранзалецік і мэдальён з вывай Дзевы Марыі на танюсенькім ланцужку. На кансолі рукамыйніка — сумачка з алоўкам для вуснаў, скрыначкай румянаў, ключом і дробнымі манэтамі. Усё было такім танным і зацяганым, што цяжка было ўявіць кагосьці, бяднейшага за яе.

Я распрануўся і павесіў рэчы на вяшак — акуратна, як толькі ўмеў, — каб не пашкодзіць ядвабу сарочкі ды ня зьмяць адпрасаваныя штаны. Седзячы, — каб не абсікаць бакавінак гаршка, як вучыла мяне малога Флярына дэ Д’ёс, — пасцаў ва ўнітаз усё яшчэ — прэч сьціпласьць — магутным і працяглым цурком грубага канякі. Перад выхадам зірнуў у люстэрка над рукамыйнікам. Конь, што глядзеў на мяне з таго боку, быў ня мёртвым, а маркотным, меў папскае двайное падбародзьдзе, пашыраныя зрэнкі й нягеглую грыву, хіба так можна было назваць маю густую шавялюру музыкі.

— Халера, — прамовіў я, — што рабіць, калі ты мяне ня хочаш?

Спрабуючы не разбудзіць дзяўчынку, я сеў галяком на ложак, прызвычаіўшыся ўжо да падманнага чырвонага сьвятла, і агледзеў яе пядзя за пядзяй. Я правёў кончыкам пальца ўздоўж ейнай успацелай шыі, і ўся маладая істота затрымцела зь сярэдзіны, нібы акорд арфы, перавярнулася з рохканьнем тварам да мяне і прынесла з сабою воблака кіслага дыханьня. Вялікім і ўказальным пальцамі я зацісьнуў ёй нос, яна страсянулася, прыбрала галаву і, не прачнуўшыся, павярнулася да мяне сьпінай. Ад нечаканага спакушэньня я паспрабаваў рассунуць ёй ногі каленам. Пры дзьвюх першых спробах яна перашкодзіла мне сваімі ладнымі сьцёгнамі. Я прасьпяваў ёй на вушка: «Твой ложак, Дэльгадына, акружаны анёламі». Яна крыху расслабілася. Гарачы струмень падняўся па венах, і мой павольны, пэнсійнага ўзросту, зьвер абудзіўся ад доўгага сну.

«Дэльгадына, душа мая! — апантаны жаданьнем прасіў я. — Дэльгадына…» Яна нудна прастагнала, выкруцілася з маіх сьцёгнаў, адвярнулася сьпінай і скруцілася, нібы сьлімак у ракавіне. Адвар валяр’яну мусіў быць такім жа эфэктыўным для мяне, як і для яе, бо нічога не адбылося — ні зь ёй, ні з кім. Ды мне было ўсё роўна. Прыніжаны і сумны ў сваіх пачуцьцях, халодны, нібы ўюн, я запытаў самога сябе, што трэба было зрабіць, каб разбудзіць яе.

Чыстыя і непазьбежныя, прагучалі удары звона а дванаццатай ночы, і пачалося 29 жніўня, дзень Сьвятога Пакутніка Яна Хрысьціцеля. Нехта плакаў на вуліцы, і на яго не зьвярталі ўвагі. Я памаліўся за яго на ўсялякі выпадак, а таксама за сябе, дзякуючы гэткім чынам за атрыманыя ласкі: «Няхай не падманвае сябе ніхто, думаючы, што тое, чаго чакае, мусіць быць большым за ўжо бачанае». Дзяўчынка рохнула ў сьне, і я памаліўся і за яе: «Няхай усё адбываецца менавіта гэткім чынам». Пасьля выключыў радыё і сьвятло, каб паспаць.

Прачнуўся на сьвітаньні, ня памятаючы, дзе знаходжуся. Дзяўчынка працягвала спаць у позе зародка сьпінай да мяне. У мяне было няпэўнае ўражаньне, нібы я чуў, як яна ўставала ў цемры, чуў шум вады ў ванным пакоі, але ўсё гэта магло мне проста прысьніцца. Гэта было нешта новае для мяне. У мяне не было спрыту да спакушэньня, і я заўсёды выбіраў сяброўак на адну ноч наўздагад, прычым больш зважаў на цану, чым на зьнешнія вабноты; і мы займаліся каханьнем без каханьня, напалову апранутыя, у большасьці выпадкаў, і заўсёды ў цемры, каб здавацца адно аднаму лепшымі. У гэтую ноч я адкрыў для сябе неймавернае задавальненьне ў любаваньні целам жанчыны, якая сьпіць. Бязь лішніх штуршкоў пажадлівасьці ці перашкодаў сарамлівасьці.

Я падняўся а пятай, занепакоены тым фактам, што мая нядзельная нататка павінна была ляжаць на стале ў рэдакцыі да дванаццатай. Зрабіў, яшчэ ў зьзяньні поўні, свой пунктуальны ўнёсак у каналізацыю і, калі торгаў за шнурок, адчуў, што мая ранейшая злосьць сыходзіць у нябыт па сьцёкавых трубах. Сьвежы і апрануты, я вярнуўся ў пакой і ўбачыў, што дзяўчынка спала тварам дагары ў замірэнчым сьвятле сьвітанку, раскінуўшыся на ўвесь ложак, з раскрытымі рукамі — поўная гаспадыня сваёй дзявоцкасьці. «Няхай Бог беражэ яе для цябе», — сказаў я ёй. Усе грошы, якія заставаліся ў мяне, ейныя і мае, я пакінуў на падушцы і назаўсёды развітаўся пацалункам у лоб. Дом, як і кожны бардэль раніцай, выглядаў, як нешта вельмі падобнае да раю. Я выйшаў праз дзьверы ў сад, каб ні з кім не сустрэцца. Пад пякучым сонцам вуліцы адчуў цяжар сваіх дзевяноста гадоў і стаў лічыць — адну за другой — хвілі начэй, што мне заставаліся да сьмерці.

**Пераклаў з гішпанскай**
**Багдан Арлоў**

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

# Варшаўскі дывэртысмэнт

(з кнігі «Сто лі100ў на tut.by»)

@ @ @

І птушкі, і зьвяры
глядзяць свае віры...
Але прыемна, што б там ні казалі,
заснуўшы на баку,
прачнуцца ў цягніку
ў Варшаве на чыгуначным вакзале.

На пляцы Трох Крыжоў
наведаць трох бамжоў,
прадбачліва не абмяняўшы грошай.
І кожны зь іх табе
сумленьне пашкрабе,
і назаве істотай нехарошай.

Гатэль. Тут адпачні
ля поля для гульні
з назовам пэдыкюрным *piłka nożna*.
Твой беларускі сьпеў
абрыднуць не пасьпеў,
але сьпяваць і на «трасянцы» можна.

Свабодныя паўдня,
і ты амаль зраньня
па вуліцах Варшавы едзеш зноўку.
Чаго ні прамільгне
ў аўтобусным акне...
Ды ўважлівей — прапусьціш *астаноўку*!

@ @ @

У панядзелак пайшоў зранку ў Лазенкі.
Замкі ружовых ілюзіяў у разрусе.
Наўкол ніводнай размовы бязь імені Лукашэнкі.
Я ўпарта маўчу, каб ня сьцямілі, што зь Беларусі.

@ @ @

Прыходзіць да Мар’енштату — нібы ўжываць цытату,
а ты толькі рады, што гэтае ўжо было;
а ты ўжываеш цытату й прыходзіш да Мар’енштату,
бо зноў западаеш і зноўку не западло.

Шчасьлівы, што сонца й што пысу шчэ не набілі,
сядаеш за круглы столік, як рыцар Івэйн.
Навокал прыпаркаваныя аўтамабілі,
а ты з гарачым віном, што тут не завецца «глінтвэйн».

А ты не ўстаеш і йдзеш — сядаеш і едзеш.
(Аўтабіяграфіі горшыя ад біяграфій аўто.)
І афіцыянт падміргне табе: «*Kto ty jesteś*?»
І ты аднавокаму скажаш проста: «Ніхто».

@ @ @

На вільготным узгорку
Каралеўскіх Лазенак
пялішся на вавёрку,
не шкадуючы зенак.

Восень падае з клёнаў.
Сплін у крыві расьлінаў.
На абломках калёнаў
здані летніх паўлінаў.

Паўз палац над вадою
і тэатар на вадзе
за рудой серадою
мокры чацьвер ідзе.

Дзень такі неабсяжны —
і ня лічыш хвілін,
маляўнічы і мажны,
як мясцовы паўлін.

@ @ @

Дзясятая ранку. Кракаўскае Прадмесьце.
Жоўтае сонца глядзіцца ўва ўсе сьвятлафоры.
Лаўкі пасьля дажджу, і ня маеш дзе сесьці.
Хіба паклаўшы пад задніцу ўласныя творы.

У Інтэрнэце — вітаньні зь Менску і Львова,
а ў галаве — толькі ранішняя дрымота.
Як наркаман, натхненьня шукаеш нэрвова
пад калёнаю Зыгмунта-Жыгімонта.

Сонечнае праменьне адсоўваючы рукамі,
прыслухоўваешся да лякальнага землятрусу:
трое жаўнераў, паблісківаючы штыкамі,
прагрукаталі ля помніка Баляславу Прусу.

@ @ @

Замкнулі «Рыбітву». Што стала зь любаю кнайпай?!
Няма дзе танна купляць алькагольны *напуй*!

Замкнулі «Рыбітву». Ад гора едзе падстрэшша.
І толькі сабака ўсярэдзіне сумна брэша.

Замкнулі «Рыбітву». Бязь яе ўсё херовей:
*Rybitwo, ojczyzno moja, ty jesteś jak zdrowie*!

@ @ @

Няма «Рыбітвы» — застаўся Ўнівэрсытэт,
дакладней, Бібліятэка Ўнівэрсытэту:
сюды завітае й лох, і супэрэстэт,
і проста аматар халяўнага Інтэрнэту.

Такая бібліятэка ў сьвеце адна:
вялізарная й зялёная, нібы лайнэр,
толькі што выцягнуты з акіянскага дна.
Цікава, колькі «Оскараў» атрымаў дызайнэр?

На даху бібліятэкі разьбілі сады.
(Пра мэту толькі Сэмірамідзе вядома.)
Здаецца, наведнікі ходзяць якраз туды,
а кніжкі чытаць, выбачайце, можна і дома.

А я тут дарваўся да электроннае пошты
і шлю гэты вершык. Ня трэба пытаць пра кошты.

@ @ @

На кожным кроку чаргуюцца храмы і рэстарацыі.
Ты блытаеш назвы страваў з раскладамі набажэнстваў.
Адно галубы не губляюць сябе ў прастрацыі,
штодня на варшаўскім бруку, нібы на працы,
ганяюць за булкай з энэргіяй пажылых «адраджэнцаў».

Сядзіш у Варшаве, бы ў псыхіятрычнай лякарні,
і адчуваеш сябе шторанку ўсё меней хвора,
і гоніш тугу так далёка, куды Макар не
ганяў цялятаў, пакуль мясцовы Макартні
левай рукою кратае сваё «Ўчора».

І гоніць па Вісьле вёслы вецер-галернік,
і кожны завулак табе прапануе прытулак,
і круцяцца сонца й зоры, і медны Капэрнік,
і круціць жоўтай лістотай польскі *październik*,
зьбіваючы з ног салодкім водарам булак.

*17—22 кастрычніка 2004,*
*Варшава*

# Падарожжа да Сьвятога Францішска

Эсэ

**ФРАНЦ СІЎКО**

Зрэчаў, што засталіся ў спусьцелай хаце дзядулі па ягоным сыходзе з жыцьця — а было там няма-ла і цікавых, і нават нечаканых, — чамусьці найбольш заманулася ўзяць адну — асобнік выдадзенага ў 1934 годзе варшаўскімі капуцынамі Катахізму трэцяга закону Сьвятога Францішка з Асызаў. Ці то любы майму воку балацяны колер вокладкі рарытэту паланіў, ці то інтуіцыя штосьці падказала, але кніжачка тая пры ўсёй маёй непрыхільнасьці да рознага кшталту старызны назаўжды прапісалася ў асабістым архіве. Шляхі ж боскія нявызнаныя: крыху больш за дзесяць гадоў прамінула з таго часу, і вось я на радзіме сьвятога, у месьце, дзе, паводле Рэпіна, далячынь «з тэрасы… падасца морам». Неспадзяванка тым больш прыемная, што яшчэ і ў дзень ад'езду на Апэніны пра вандроўку ў Асызы нічога не было вядома.



Базыліка Сьвятога Францішка, збудаваная ў гістарычна найсмутнейшым кутку Асызы — на ўзгорку, дзе ў даўніну выконваліся сьмяротныя прысуды.

Што праўда, вандровак з Рыму ў італьянскую правінцыю ў той ня надта каб сьпякотлівы для тамтэйшых шыротаў чэрвень не бракавала. Але асыская, насуперак неадэкватным для такое значнае, прынамсі для мяне, падзеі паводзінам у аўтобусе сьпешчанай дарункамі лёсу амэрыканскай моладзі, зь якою сабіла патрапіць у адну групу, сталася ці ня самаю запамінальнаю.

Цяпер, калі б ізноў выпала такая мажлівасьць, я б, напэўна, нават метры таго эскалятару, што падняў ад падножжа гары да першае асыскае пляцоўкі, палічыў, тады ж… Тады, на тле ледзь ня штотыднёвых наведзінаў то Арвіету, то Пампэі, то Монтэ-Касына, усё падалося наўздзіў будзённым, шараговым. Да гэткае ступені шараговым, што я, нават маючы ў кішэні на дробныя выдаткі сякія-такія грошы, не палічыў патрэбным набыць дзеля памяткі копію ўкрыжаваньня, зь якога Хрыстос прамовіў да Сьвятога Францішка ў Сан-Даміяне. Пра што дасюль шкадую, уяўляючы зрэдчасу, як файна выглядала б яна на дыванку над ложкам пры запаленых сьвечках у які-небудзь сьвяточны, прыкладам, калядны, вечар.

З тэрасы пры Ніжнім касьцёле асыскія ваколіцы сапраўды нагадваюць мора. Два моры: упобачкі, за сьпіною — людзкое, вірлівае і гаманкое, што час ад часу радзее коштам аматараў паласавацца марозівам у ціхім утульным бары збоч вулкі; унізе, дакуль сягае вока, — прыроднае сіняе, сьпярэшчанае плямамі ізумруднага, сатканае з сакавітых красак Умбрыі. Гэткае ж амаль, без канца і краю, толькі зусім бязьлюднае, пашчасьліла ўбачыць пасьля яшчэ аднойчы — пазамінулым летам з гары пад назовам Маяк на Браслаўшчыне, куды неспадзявана трапілі разам зь Сяргеем Панізьнікам і Вольгаю Іпатавай пасьля літаратурнае імпрэзы.

Дзе б ні ступіў у Асызах, усюды наткнешся на напамін, што тут — калыска слыннага сьвятога. Местачковага бэйбуса ды забаўніка, затым — ваяра падчас вайны з Пэруджаю, яшчэ пазьней — заснавальніка манаскага ордэну, асобы, якой лёсам было наканавана стаць апекуном Італіі. Улюбёнага пэрсанажа Джота, што падоўгу жыў у Асызах і пакінуў пасьля сябе ў Верхнім касьцёле, менаваным у гонар Францішка, адмысловую галерэю сюжэтаў зь ягонага жыцьця. Цяпер, мабыць, ужо адноўленых пасьля згубы падчас не такога даўняга землятрусу: італьянцы, у адрозьненьне ад нас, кошт помнікаў сваёй мінуўшчыны ведаюць добра.

Базыліка Сьвятога Францішка, збудаваная, між іншым, у гістарычна найсмутнейшым кутку Асызаў — на ўзгорку, дзе ў даўніну выконваліся сьмяротныя прысуды і дзе завяшчаў пахаваць сябе Францішак, — з тых месцаў, што неяк вокамгненна поўняць цябе сьвятлом. Сьвятлом, што не пакідае і праз гады, успыхваючы няўзнак у памяці, накіроўвае да таго ісьнага, чым ёсьць вера і яе пастуляты ў шырокім, агульначалавечым сэнсе. Сьвятлом, што і само, па вышэйшым рахунку, ёсьць тое ісьнае.

Другая выбітная асоба, якая ў немалой ступені спрычынілася да ператварэньня правінцыйных Асызаў у цэнтар хрысьціянства сусьветнае вартасьці і праз тое назаўжды засталася ў аналах яго гісторыі, — паплечніца сьвятога Францішка Кляра. Пасьлядоўніц яе, сёстраў-клярысак, можна ўбачыць у касьцёле па-за кратамі падчас збору ахвяраваньняў. Убачыць — умоўна: клярыскі не адкрыюць твару, нават і рук староньняму чалавеку ні пры якой нагодзе. Таемнасьць побыту звычайных учора яшчэ жанчын, ад усьведамленьня трагедыйнасьці якога да высновы, што горай і табе, чалавеча, магло стацца (а ці мо і станецца яшчэ), як у гэтую во сёньняшнюю скрушлівую хвіліну, — адзін крок.

Асызы — аазіс для душы.

Асызы — філязофія, для таго, вядома, для каго пошук адвечных ісьцінаў не пусты гук. Яшчэ ж — дарунак лёсу, што пасылаецца Богам-айцом ці то дзеля ўзнагароды за дабрадзейства, ці то дзеля штуршка да выкупленьня граху.

Асызы — з тых мясьцінаў, якія хутчэй узновіш у памяці агулам, чым прыгадаеш драбніцамі. І ўжо аніяк ня места, зь якога — «усё злое».

Каляды. На падстаўцы пры дыванку палае сьвечка, жагнае зырклівым агнём вольнае месца, што чакае запаветнае выявы Збаўцы, замоўленай сябру, які выпраўляецца днямі — шацунчык! — у вандроўку да тае самае тэрасы, адкуль далячынь нагадвае мора.

**АДАМ ГЛЁБУС**



# Сучасьнікі

## 2002. Халіп і беларускасьць

У кавярні «Грунвальд» п'ю каву зь Іраю Халіп і надыктоўваю інтэрвію для «Белорусской деловой газеты «Для служебного пользования» (www.bdg.by/dsp/2002/03/02/p22.htm). «Глёбусік, скажы праўду… Ты ж не беларус?» — «Чаму?» — «Беларусы такімі разумнымі, як ты, не бываюць!» І якога толькі камплімэнтарнага глупства не пачуеш ад журналісткі, калі ёй замовілі зрабіць з табой інтэрвію.

*26.06.2004, 19:22*

## 2002. Судзукі, «Muji» і сусьветная экспансія

Спадар Кей Судзукі з вуліцы Грэйт Портлэнд, што ў Лёндане, кіруе сеткаю эўрапейскіх крамаў «Muji». Наконт «эўрапейскіх» трэба ўдакладніць: Судзукі падпарадкоўваюцца 10 лёнданскіх і 8 парыскіх крамаў. «Парыж — бедны горад, — скардзіцца японец. — Мы будзем згортваць дзейнасьць у Францыі, адну краму мы зачынілі…» Не зьдзіўляцца. Калі Судзукі кажа, трэба верыць. Калі адна ягоная крама ў Лёндане абарочвае 200—250 тысяч ангельскіх фунтаў штомесяц, трэба прыслухоўвацца да парадаў.

«Muji» абвясьціла ў нэце пра сваю глябальную экспансію — жэст, варты павагі. «Каб шапік з рэчамі «Muji» быў рэнтабэльны і прыносіў невялічкі прыбытак, трэба той шапік паставіць на вакзале, на скрыжаваньні чыгункі і мэтро, дзе штодня праходзіць больш за мільён пасажыраў. У іншых месцах ставіць шапікі нявыгадна. Вынятак — ЗША, дзе тавары «Muji» ўспрымаюцца творамі мастацтва і прадаюцца ўтрая даражэй…» Дзе гэта ў Вільні праходзіць мільён патэнцыйных пакупнікоў? Ад Вільні да найбліжэйшай станцыі мэтро 170 кілямэтраў, і яна за мяжой, яна ў Менску. Менавіта ў Вільні я намерваўся адчыніць краму «Muji». Крама ня шапік, краме не патрабуецца мільён патэнцыйных пакупнікоў, але калі Парыж — горад бедны, то што казаць пра Вільню…

«Muji» — магутная вытворчая і гандлёвая імпэрыя, гадавы абарот якой больш за 6 мільярдаў даляраў. Адкрыцьцё стваральнікаў «Muji» вельмі простае: усё начыньне гіпэрмаркетаў — ад кавалку мыла да збудаванага катэджу — выканана ў адной стылістыцы. Уражвае. Але мы, эўрапейцы, не супадаем з «Muji» ў маштабе. У нас зашмат індывідуалістаў і традыцыйных каштоўнасьцяў, каб прымаць адну стылістыку памерам з гіпэрмаркет. Я падзякаваў спадару Судзукі за размову і прыняў рашэньне: на пэўны час адмовіцца ад удзелу ў сусьветнай экспансіі кампаніі «Muji».

*1.07.2004, 16:50*

**АЛЯКСАНДАР ВОРВУЛЬ**

# Слоўнік скептыка



**І г.д.** — скарачэньне, якое прымушае думаць, нібыта вы ведаеце болей, чым на самай справе.

**Ідыёт** — наўмысная памылка прыроды.

**Ідэалёгія** — падмена жывога сьветапогляду сэрыйным пратэзам.

**Ідэя** — тое, што дурню нельга ані патлумачыць, ані выбіць зь яго башкі.

**Ізраіль** — частка сушы, з усіх бакоў атачоная арабамі.

**Ікра чорная** — чырвоная ікра ўладальнікаў чорна-белых тэлевізараў.

**Імпатэнцыя** — радыкальны сродак засьцеражэньня ад вэнэрычных захворваньняў.

**Інвэстыцыя** — няўдалая спэкуляцыя.

**Інспэктар ДАІ** — чалавек, заўжды гатовы патлумачыць вам сэнс дарожных знакаў.

**Інспэктар падатковы** — начны кашмар, які прыходзіць толькі ўдзень.

**Інтрыга** — адзіны спосаб быць палітыкам жывым і 50-гадовым адначасова.

**Інтуіцыя** — адчуваньне, што маеш рацыю нават тады, калі ня маеш рацыі.

**Інтэлект штучны** — спаборнік натуральнага глупства.

**Інтэлектуал** — чалавек, які знайшоў нешта больш цікавае, чым сэкс.

**Інтэрнэт** — самы заразны інтэрнэт-вірус.

**Існаваньне** — доказ таго, што твайму бацьку хоць раз, ды было добра.

**Ісьціна** — падзея, якую могуць пацьвердзіць дзьве суседкі.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Бензярук Р. Зайцаў кажушок:** Казкі / Маст. І. Семілетаў. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 79 с., іл. 3000 ас.

**Кіпель В., Кіпель З. Бібліяграфія беларускага друку на Захадзе:** Часапісы, газэты = Belarusian Publishing in the West: A bibliography. Periodicals. — Нью-Ёрк: The New York Public Library Slavic, Baltic, and Eurasian Resource Series, 2004. — 150 с.

Кнігу склаў пералік беларускіх выданьняў з Заходняй Эўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амэрык, Аўстраліі, выдадзеных з XIX ст. да 2000 г. уключна.

**Зуёнак С. Птушкі: Крылатая песьня Зямлі.** Нарысы. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 64 с. 3000 ас. — (Сэрыя «Зямля мая»).

**Камінскі А. Аб чым расказваюць званы і сьвятыні Крэўскай зямлі.** — Крэва: Краязнаўчы музэй крэўскай школы, 2004. — 20 с. 20 ас.

**Камінскі А. Крэва. Шлях праз стагодзьдзі.** — Крэва: Краязнаўчы музэй крэўскай школы, 2004. — 24 с. 20 ас.

Гістарычны нарыс і храналягічны даведнік да гісторыі мястэчка Крэва.

**Камінскі А. Крэва. Пад знакам «Лялівы».** — Крэва: Краязнаўчы музэй крэўскай школы, 2004. — 20 с. 20 ас.

Напісаныя нарысы зьмяшчаюць матэрыял аб жыцьці мястэчка і местачкоўцаў у розныя часы.

**Кніга пра расьліны** / Пер. з расейскай і апрац. С.Фядотавай. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 64 с. 3000 ас.

У кнізе, адрасаванай дзецям малодшага школьнага ўзросту, дасьціпна і прыгожа напісана пра навакольны расьлінны сьвет. Цана каля 5000.

**Сяргей Лескець**

# Шахіды перад тэлевізарам

Цотных гадоў у спорце заўсёды чакаеш. Бо ў гэты час праводзяцца Алімпійскія гульні і чэмпіянаты сьвету ды кантынэнту па футболе — галоўныя міжнародныя спаборніцтвы. У гэтыя месяцы палітыка ды войны нібы адыходзяць на другі плян. Памятаеце, як падчас «Euro-2004» і атэнскай Алімпіяды ўсе чакалі тэрактаў? Нічога не адбылося. Ці то спрацавалі беспрэцэдэнтныя захады бясьпекі, ці шахіды — такія ж спартовыя заўзятары, як і звычайныя людзі, і, замест таго каб шэндацца абы-дзе з выбухоўкай, дружна паселі перад тэлевізарамі.

Гучных палітычных падзей таксама ў чэрвені і жніўні 2004 году не прыпомніцца. Таму я рэкамэндаваў бы Цэнтравыбаркаму правесьці наступныя выбары ў чэрвені 2006 году, калі пройдзе футбольны мундыяль. Якая палітыка, якія акцыі, калі ўжывую паказваюць хакей Канада—Чэхія ці футбол Нямеччына—Аргентына!

2004 год прынёс беларускаму спорту як радасьці, так і расчараваньні. Галоўнай падзеяй стаў залаты мэдаль Юліі Несьцярэнкі на атэнскай стомэтроўцы. Поспех сусьветнага маштабу, бо ўпершыню з 1980 году прэстыжную дыстанцыю выйграла — выбачаюся за непаліткарэктнасьць — беласкурая жанчына. Дарэчы, здымак пераможнага фінішу жыхаркі Берасьця агенцтва Reuters назвала найлепшым у мінулым годзе.

На Юлію мусяць маліцца і беларускія спартовыя чыноўнікі. Каб не яна, палялецелі б іх галовы за невыкананьне пляну па мэдалях («жніво» склала толькі 60 адсоткаў ад пляну).

Дарэчы, пра пляны. У Інтэрнэце гуляе анэкдот, што міністар спорту і турызму Беларусі сасьніў кашмар: перад ім пастаўленая задача заваяваць на зімовай Алімпіядзе ў Турыне таксама 25 мэдалёў. Для тых, хто не зразумеў: усяго падчас Белай Алімпіяды будзе разыграна 84 камплекты мэдалёў, а ў Солт-Лэйк-Сыты беларусы наагул задаволіліся толькі адной «бронзай».

Перад ад'ездам на моладзевы чэмпіянат сьвету па хакеі трэнэр Міхаіл Захараў таксама спакусіўся на плянаваньне: задача-максымум — прабіцца ў плэй-оф, задача-мінімум — застацца ў эліце.

Аднак хакейная моладзевая зборная Беларусі (да 20 гадоў) ня здолела замацавацца ў элітным дывізіёне, куды прабілася роўна год таму.

На чэмпіянаце сьвету, што праходзіў у Гранд-Форксе і Тыф-Рывэр-Фолзе (ЗША), беларусы занялі апошнае месца, прайграўшы нават у заключным двубоі за 9-е месца вельмі слабай зборнай Нямеччыны (3:4). Залатыя ж мэдалі заваявалі канадзкія хакеісты.

Яшчэ перад пачаткам першынства галоўны трэнэр зборнай Міхаіл Захараў наракаў на слабую фізычную падрыхтоўку нашых хакеістаў.

2005 год будзе цяжкім для Захарава. І першае выпрабаваньне ў наступным месяцы: з 10 да 13 лютага ў Рызе пройдзе кваліфікацыя на зімовую Алімпіяду ў Турыне. Разам зь беларусамі за адзіную пуцёўку на зімовыя гульні пазмагаюцца латышы, палякі і славенцы. Шанцаў заўжды болей у гаспадароў…

Да посьпехаў году можна было б аднесьці паўфінал Кубку Дэвіса, каб ня дзьве рэчы. На 10-мільённую Беларусь мы маем толькі двух тэнісістаў у першай тысячы сусьветных майстроў ракеткі — Мірнага і Ваўчкова. На пасяджэньні Беларускай тэніснай асацыяцыі Ўладзімер Ваўчкоў раскрытыкаваў сучасны стан спраў у беларускім тэнісе: «Што такое беларускі тэніс апошняга дзесяцігодзьдзя бяз згадкі пра паўфінал Кубку Дэвіса? За дзьве пяцігодкі нашы трэнэры не падрыхтавалі ніводнага гульца, апроч Швяца, Мірнага, Ваўчкова — гульцоў яшчэ старой савецкай фармацыі, які ўзяў бы хоць адзін рэйтынгавы бал у рамках турніраў АТР. Плакаць хочацца, а не фанфары слухаць» (цытуецца паводле «Прессбола»). Але ў індывідуальнай гульні ў Мірнага і Ваўчкова — рэгрэс. Мірны за год скаціўся з 23-й на 42-ю пазыцыю, Уладзімер — з 98-й на 142-ю.

Пра беларускіх дзяўчат і казаць ня хочацца. Пакуль яны выступаюць на турнірах з малым прызавым фондам, а на буйных турнірах могуць выкарасакацца з кваліфікацыі.

Увосень дадалі аптымізму футбалісты нацыянальнай зборнай. Іх самаадданая і мужная гульня ў Парме 13 кастрычніка супраць зборнай Італіі (3:4) яшчэ доўга будзе згадвацца як адзін з прыемных сюрпрызаў году.

Праўда, крыху дзёгцю ў беларускую футбольную бочку падліў згаданы вышэй «Прессбол», заняўшыся расьследаваньнем дагаворных матчаў, у тым ліку і на ўзроўні нацыянальнай зборнай. Іх арганізуе мафія, якая нажываецца на футбольных таталізатарах. Пасьля гэтага думаецца: а ці ня быў матч у Парме добра зрэжысаваным спэктаклем?

У астатнім — пуста. Правал як мужчынскага, так і жаночага гандболу, страта пазыцый у біятлёне, плаваньні, няўдалы выступ беларускай футбольнай зборнай на моладзевым чэмпіянаце Эўропы. А лічылася, што пуцёўка ў Атэны амаль у кішэні.

2005 год распачынаецца кваліфікацыйнымі матчамі (першы — 6 студзеня) беларускіх гандбалістаў за права трапіць на чэмпіянат кантынэнту ды Адкрытым чэмпіянатам Аўстраліі па тэнісе (16 студзеня). Як год пачнём, так і правядзём?

**Алег Раявец**

# Беражкоў у шоку

Усяго паўтары гадзіны доўжыўся ў судзе Цэнтральнага раёну Менску разгляд пазову міністра фінансаў, старшыні Беларускай асацыяцыі гімнастыкі Мікалая Корбута да заснавальніка спартыўнай газэты «Прессбол» і яе рэдактара Ўладзімера Беражкова. Вынікам пасяджэньня, якое прайшло ўвечары 4 студзеня, стала пастанова судзьдзі Валерыя Есьмана спагнаць на карысьць істца 30 млн рублёў з выдаўца газэты УП «Прессбол-плюс» і 10 млн рублёў з У.Беражкова пры першапачатковых патрабаваньнях 50 млн рублёў з выдаўца і па 10 млн рублёў з рэдактара і журналіста газэты Сяргея Вярсоцкага.

Нагодай да пазову стаў загаловак на першай паласе газэты «Ў намесьніках у міністра фінансаў Беларусі ходзіць чалавек, які вышукваецца Інтэрполам за ўдзел у арганізаванай злачыннай групоўцы» ў нумары за 22 кастрычніка. Гэтым загалоўкам анансаваўся артыкул С.Вярсоцкага пра сытуацыю вакол віцэ-старшыні БАГ Андрэя Іманалі. Пазоўнік успрыняў загаловак як зьнявагу гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі.

У.Беражкоў і яго адвакат Канстанцін Бялоў абураны пастановай суду. «Я ў шоку ад такога правасудзьдзя, — заявіў У.Беражкоў. — Газэту «забілі» на роўным месцы. Санкцыі несувымерныя зь фінансавым становішчам газэты».

**Паводле БелаПАН**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**4 студзеня ў Менску прайшоў апошні тур кваліфікацыі да Чэмпіянату Эўропы па настольным тэнісе. Беларускія спартоўцы сустрэліся з вугорцамі, і, нягледзячы на паразу 2:3, усё ж трапілі ў фінал чэмпіянату за кошт перавагі ў балах падчас асабістых сустрэчаў. На здымку: Павал Платонаў (зьлева) — чэмпіён краіны 2004 г.**

НАВІНЫ

## Шчурко — найлепшы журналіст

Беларуская асацыяцыя спартовай прэсы назвала тройку найлепшых спартовых журналістаў краіны за 2004 год. Першае месца ў аглядальніка «Прессбола» Сяргея Шчурка (53 балы), на другім ягоны калега па газэце — Сяргей Новікаў (40 балаў), на трэцім месцы аглядальнік «Спортивной панорамы» Руслан Васільеў (38 балаў). У ходзе апытаньня было названа прозьвішча 51 журналіста.

## Глеб сярод найлепшых

Паводле апытаньня 25 аўтарытэтных нямецкіх адмыслоўцаў, праведзенага выданьнем «Більд», паўабаронца «Штутгарту» і зборнай Беларусі Аляксандар Глеб трапіў у сымбалічную зборную бундэслігі па выніках 2004 году (усяго было названа 11 футбалістаў). Ён аказаўся ў адным шэрагу з такімі зоркамі, як Кан, Макаай, Балак, Міку, Аілтан.

## «Рэал» — найлепшы клюб

У Бразыліі апублікаваны штогадовы рэйтынг 100 футбольных клюбаў сьвету. Рэйтынг укладае найбуйнейшае бразыльскае выданьне «Фольял ды Сан-Паўлу» на аснове зьвестак ФІФА. Найлепшым клюбам 2004 году прызнаны мадрыдзкі «Рэал», у яго 1000 балаў. На другім месцы — «Мілян», трэцяе і чацьвёртае дзеляць «Бока Хуніёрс» (Буэнас-Айрэс) і «Пэньяроль» (Мантэвідэо). У рэйтынгу няма ні толькі беларускіх, але і расейскіх клюбаў.

## Клічко і Шаўчэнка — героі

Леанід Кучма падпісаў указ аб прысваеньні званьняў Героя Ўкраіны чэмпіёну сьвету ў супэрцяжкай вазе паводле вэрсіі WBC Віталю Клічку і ўладальніку «Залатога мяча» Андрэю Шаўчэнку.

## Рэхагаль — чалавек году

У Грэцыі «Чалавекам» году названы трэнэр нацыянальнай футбольнай зборнай Ота Рэхагаль, які прывёў грэкаў да залатых узнагарод на «Euro-2004». Нямецкі спэцыяліст зь вялікім апярэдзіў прэм'ер-міністра Костаса Караманліса і мастака Дзімітраса Папаіяну.

**AP**

# Народ супраць гросмайстра



Першы беларускі гросмайстар ICCF мянчук Зьміцер Лыбін, які ўваходзіць у сотню наймацнейшых у сьвеце паводле рэйтынгу (2606), кідае пальчатку чытачам «Нашай Нівы».

Як зазвычай, сэансэру належаць белыя фігуры. Першы ход сп.Лыбін ужо зрабіў — 1. b2—b4. Бадай, кожны соты жыхар Беларусі ўмее гуляць у шахматы, таму спадзяёмся, што на баку чытачоў удзел возьмуць нямала гульцоў. Свае варыянты хадоў за чорных можна дасылаць як індывідуальна, так і ад імя каманды. Час на разважаньне над ходам будзе абмежаваны. Калі газэта з пазыцыяй выходзіць у пятніцу, то дзеля таго, каб ваш чарговы ход узяў удзел у конкурсе, ён мусіць трапіць у Рэдакцыю да 19:00 найбліжэйшага панядзелка. Таму пажадана дасылаць хады праз электронную пошту на nn@promedia.by — з пазнакай «Каіса» — або на факс 284-73-29 ці поштай (220050, Менск, а.с. 537). З разнастайных варыянтаў вядучы рубрыкі выбера найбольш папулярны; калі ж такі ход выявіцца памылкай, што вядзе да відавочнай паразы, то наступны па частаце.

Дэбют Сакольскага за белых, згуляны нашым партнэрам у гонар славутага беларускага трэнэра (гл. «Нашу Ніву» ад 18.06.2004), многімі тэарэтыкамі ня лічыцца стоадсоткава карэктным пачаткам. Але й недаацэньваць шанцаў белых, якія плянуюць заваяваць прастору на фэрзевым флянгу і аказаць ціск на цэнтар (слон пойдзе на b2), няможна. У чорных цяперака ёсьць цэлая палітра магчымых адказаў: 1…e5, 1…d5, 1…Kf6, 1…c6, 1…b5, 1…a5 і нават 1…Ka6! Ці ўдасца чытачам абвергнуць задуму старэйшага паводле званьня?

Для найбольш актыўных удзельнікаў спаборніцтва прадугледжаны прызы — не грашовыя, але «вартыя вырабу». Напрыклад, магчымасьць сустрэчы з гросмайстрам за шахматнай дошкай. Хада спаборніцтва будзе асьвятляцца ня толькі ў «Нашай Ніве», а і на сайце «Беларускія шахматы» (bychess.narod.ru). Трэба меркаваць, што паядынак выйдзе напружаны. Летась чытачы газэты «Ўвесь спорт» пратрымаліся супраць чэмпіёнкі Украіны, гросмайстаркі Натальлі Жукавай ажно да 37-га ходу. Дык то сыцыліянская абарона — для чорных яна больш рызыкоўная, чым «Сакольскі»…

*P.S.* Чэмпіён сьвету па завочных шахматах Тун Хамарат таксама гатовы згуляць з усімі ахвотнымі праз Інтэрнэт. У дзьвюх партыях ён зрабіў хады 1. d4 і 1. e4, кожны зь меркаваных супернікаў павінен заплаціць пяць эўра ўнёску. У «Нашай Ніве» сустрэча з гросмайстрам бясплатная — кошт паштоўкі ці электроннага ліста не ў рахунак.

**В.Р**

### Як бы вы згулялі?

**З.Лыбін — чытачы «НН». Ход чорных.**



ЯПОНСКАЯ КРЫЖАВАНКА




**Японская крыжаванка — гэта малюнак, які трэба аднавіць, карыстаючыся толькі лікавымі значэньнямі. У гэтых галаваломках лікі для кожнага слупка ці лінейкі паказваюць, колькі ў іх ёсьць зафарбаваных клетак, разьмешчаных разам. Напрыклад: лічбы 3, 3, 6 у чацьвертым зьлева слупку азначаюць, што ў ім ёсьць тры групы зафарбаваных клетак: 1-я група зь трох клетак, 2-я — з трох, 3-я — з шасьці. Групы клетак у радках і слупках разьмяшчаюцца ў такой самай пасьлядоўнасьці адна адносна адной, як і лічбы, што іх абазначаюць.**


# Найтаньнейшая падпіска на «НН»

**Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 3530 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для Вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».**

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»**:
вул. Валадарскага, 16, пак.200 227-88-41
**Пункты прыёму падпіскі**:
вул.Жукоўскага, 5, корп.1 224-32-03
вул.Раманаўская Слабада, 9 200-83-04
вул.Кашавога, 8 230-29-20
**Крамы:**
№1 вул.Жукоўскага, 5 224-03-76
№2 пр.Скарыны, 44 284-83-59
№3 пр.Скарыны, 76 232-46-23
№4 вул.Леніна, 15 227-11-92
№5 вул.Енісейская, 6 243-16-30
№6 вул.Філімонава, 1 235-63-11
№7 вул.Коласа, 69 288-30-20
№8 вул.Сурганава, 40 232-45-10
№9 пр.Ракасоўскага, 140 247-30-15
№10 бульвар Шаўчэнкі, 7 233-74-88
№11 пр.Пушкіна, 77 255-80-71
№12 вул.Кіжаватава, 80 278-77-61
№13 вул.Каліноўскага, 82, корп.2 264-06-42
№14 вул.Валадарскага, 22 227-75-55
№15 вул.Танка, 16 203-82-39
№16 вул.Харужай, 24 234-27-25
№17 вул.Някрасава, 35 231-03-28
№18 мэтро «Плошча Перамогі» 284-31-06
№19 пр.Машэрава, 51, корп.1 223-81-66
№20 вул.Ясеніна, 16 271-87-21
№21 мэтро «Пушкінская» 255-57-20
№22 вул.Ілімская, 10, корп.2 243-16-83
№23 вул.Славінскага, 39 264-36-33
№24 вул.Жылуновіча, 31 295-05-74
№25 вул.Маркса, 21 227-08-52
№ 26 пр.Скарыны. 113 264-22-91
**Шапікі**
№18 Тэхналягічны ўнівэрсытэт, вул.Сьвярдлова, 13/4
№18 Пэдагагічны ўнівэрсытэт, вул.Савецкая, 18
№78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19
№95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул.Мясьнікова, 39
№136 ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня
№187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15
№189 Аўтавакзал «Маскоўскі»
№198 Эканамічны ўнівэрсытэт, пр.Партызанскі, 26
№209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2
№228 Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17
№232 Менскі завод халадзільнікаў, пр.Машэрава, 61
№245 Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56
№259 Менскі дзяржаўны гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183
№260 пр.Скарыны, 169
№262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31
№298 пр.Машэрава, 75/1
№302 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8
№313 Слабадзкі праезд, 24


КАІСА

# Кіра Зварыкіна дагэтуль за дошкай

Кіра Зварыкіна нарадзілася на Ўкраіне, а неўзабаве пасьля Другой сусьветнай «па разьмеркаваньні» пераехала ў Беларусь. Узорная савецкая шахматыстка, гатовая працаваць за дваіх, у Менску абжылася хутка і ў канцы 1950-х дабралася да шахматнага Алімпу. Праўда, матч з чэмпіёнкай сьвету Лізаветай Быкавай скончыўся паразай прэтэндэнткі, але ў наступныя дзесяцігодзьдзі ніхто з нашых шахматыстак і блізка не канкураваў з грузінкамі, расіянкамі ды кітаянкамі. Не сумняюся ў тым, што Зварыкіна, якая нядаўна вярнулася да сваякоў у Расею, была і застаецца «нашай»…

Спн.Кіра пачала першай у Беларусі на роўных змагацца ў мужчынскіх спаборніцтвах. Аўтабіяграфічная кніга «Ў радох шахматнай гвардыі» (Менск, 1984) — рэдкае для Беларусі шахматнае выданьне, напісанае нармальнай мовай, з гумарам, крытыкай ды самакрытыкай. Такі ж і стыль зварыкінскай гульні — атака й камбінацыі перадусім! Пра характар беларускай чэмпіёнкі сьведчыць і показка. Аднойчы ў гатэлі да шахматыстак праз акно палез кватарант, які памыліўся пакоем. Суседка залямантавала: «Да нас лезе мужчына!» «Мужчына? Дык адчыняй акно!» — параіла ёй Зварыкіна.

Зь дзяцінства помняцца задушэўныя дыялёгі Зварыкінай з гледачамі ў шахматнай тэлеперадачы на колішнім БТ. На пачатку 1990-х, перастрэўшы Зварыкіну ў калідоры менскага Палацу шахмат і шашак, папрасіў у яе аўтограф. «Я ж, малады чалавек, ужо «выйшла ў тыраж», — адмовіла гросмайстарка. Яна схітравала. На міжнародным фэсьце «Эстафэта пакаленьняў» у гонар 85-годзьдзя К.Зварыкінай, што прайшоў у Чалябінску месяц таму, за дошку села сама віноўніца ўрачыстасьцяў і заняла даволі высокае месца ў турніры. Шкада, што ў Беларусі да падобнага фэсту ніхто не дадумаўся.

**Вольф Р-к**



### Як бы вы згулялі?

**В.Барысенка — К.Зварыкіна, Рыга, 1962. Ход чорных. У іх не хапае пешкі. Мо папрасту здаць партыю?**

**Адказ:** ні ў якім разе! Пасьля 1...а4! ад пешачнага прарыву на фланзе няма паратунку. Далей было: 2. Кре4 b4! 3. Крd4 ba 4. Крс3 Крb5 5. d4 Крd4 — і здаліся белыя.

## ТЭАТАР

**Опэра**
**8** (сб) — «Пікавая дама» П.Чайкоўскага.
**9** (ндз) — «Багема» Дж.Пучыні.
**13** (чц) — вечар старадаўняга рамансу.

**Купалаўскі тэатар**
**8** (сб) — «Івона, прынцэса Бургундзкая» В.Гамбровіча. Трагічны парадокс.
**9** (ндз), 11.30 — «Ажаніцца — не журыцца» Далецкіх, М.Чарота. Беларускі вадэвіль.
**9** (ндз) — «Памінальная малітва» Р.Горына. Камэдыя.
**10** (пн) — «Каханьне ў стылі барока» Я.Стэльмаха. Камэдыя.
**12** (ср), **13** (чц) — «Чорная панна Нясьвіжу» А.Дударава. Містычная легенда пра каханьне.

**Тэатар імя Горкага**
**8** (сб) — «Паведамленьне Марыі» П.Кладэля. Драматычная містэрыя.
**9** (ндз) — «Дэтэктар хлусьні» В.Сігарава. Камэдыя.
**13** (чц) — «Адзіны спадчыньнік» Ж.Ф.Рэньяра. Камэдыя.

**Тэатар беларускай драматургіі**
**8** (сб) — «П'емонцкі зьвер» А.Курэйчыка. Гістарычная драма.
**9** (ндз) — «Містэр Розыгрыш» С.Кандрашова. Гульні дарослых у 2-х дзеях.
**11** (аўт) — «Понцкі Пілат» А.Курэйчыка. Гістарычная драма.
**12** (ср) — «Чорны квадрат» М.Адамчыка і М.Клімковіча. Кабарэ-дэтэктыў у 2-х частках без антракту.
**13** (чц) — юбілейны вечар заслужанага дзеяча мастацтваў, ляўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусі і спэцыяльнай прэміі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, прафэсара Валер'я Анісенкі «Па старонках маёй памяці». Рэтра-канцэрт.

**Тэатар-студыя кінаактора**
**8** (сб), **9** (ндз) — «Выкраданьне Алены» Л.Вэрнэйля. Француская адзюльтэр.
**11** (аўт), **12** (ср) — «Востраў нашага каханьня і надзеі» Г.Салоўскага. Казка для дарослых.
**13** (чц) — «Міленькі ты мой» М.Варфаламеева. Камэдыя.

**Дом літаратара**
**8** (сб) — «Пастой, паравоз!» С.Камісарава.

## ВЫСТАВЫ

**Нацыянальная бібліятэка**
**Да 8 студзеня** ў аддзеле беларускай літаратуры — выстава, прысьвечаная 80-годзьдзю з дня нараджэньня беларускага навукоўца, гісторыка культуры Станіслава Марцалева.

**Да 17 студзеня** — кніжная выстава, прысьвечаная 80-годзьдзю кінастудыі «Беларусьфільм».

**Да 28 студзеня** ў музычным сэктары аддзелу мастацтва праходзіць выстава, прысьвечаная 295-годзьдзю з дня нараджэньня італьянскага кампазытара XVIII стагодзьдзя Джавані Батыста Пэргалезі.

**Да 28 студзеня** тамсама працуе выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю кампазытара Дзьмітрыя Кабалеўскага.

**Luxa**
**Да 15 студзеня** ў фае бібліятэкі імя Янкі Купалы (вул.Веры Харужай, 16) працуе выстава студыі творчай фатаграфіі «Luxa». Уваход вольны.

**Нясьвіскія зборы Радзівілаў.**
**8 студзеня** — апошні дзень выставы ў Нацыянальным мастацкім музэі, якая складаецца з 47 партрэтаў XVII—XVIII ст., дзесяць зь якіх экспануюцца ўпершыню. Гэта толькі невялікая частка калекцыі, пра якую да сёньня ходзяць легенды, што належала магутнаму роду некаранаваных каралёў ВКЛ. Пачатак збору быў пакладзены Мікалаем Крыштофам Радзівілам (Сіроткам). Выстава знаёміць гледачоў з вобразамі выдатных палітычных, грамадзкіх, рэлігійных, ваенных дзеячаў Беларусі.

**Сьвет казак, легендаў і паданьняў**
У мастацкай галерэі Ўнівэрсытэту культуры (Палац Рэспублікі) **да 9 студзеня** працуе выстава «Сьвет казак, легендаў і паданьняў». Жывапіс, акварэль, графіка, батык і інш.

**Прыгажосьць Радзімы**
Выстаўка работ акадэмікаў, стыпэндыятаў і дыпляmантаў Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва прадоўжыцца **да 14 студзеня** ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры Беларусі.

**Вялікае стварэньне формаў**
Цыкл пад такой назвай (уключае ў сябе графіку, жывапіс, скульптуру і фотаканляж) экспануецца **да 16 студзеня** ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва. Аўтарка — Алена Юрыкава (Нямеччына). Ідэя стварэньня цыклу зьявілася падчас прагулак аўтаркі па ўзьбярэжжы Паўночнага мора. У аснове задумы — натуралістычная канцэпцыя. У 1978 годзе Алена Юрыкава скончыла Менскую мастацкую вучэльню імя Глебава. Апошнія сем год жыве і працуе ў Нямеччыне.

**Аршыца**
**Да 17 студзеня** ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва можна паглядзець выставу жывапісу творчага аб'яднаньня «Аршыца». Аб'яднаньне мастакоў з Аршаншчыны ўзьнікла ў 1989 годзе. У яго ўвайшлі некалькі розных паводле стылю аўтараў: А.Жураўлёў, Б.Іваноў, А.Марышаў, А.Фалей, Г.Фалей, В.Шылко. Апошняя сумесная выстава адбылася ў 2000 годзе ў Маскве ў залі Цэнтральнага дому мастака.

## ТЭАТРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар юнага гледача**
**8** (сб), 11.00 — «Дарога на Бэтлеем» С.Кавалёва. Музычная казка-прытча.
**9** (ндз), 11.00 — «Паліяна», паводле аповесьці Э.Портэр. Гісторыя пра дзяўчынку, якая мела талент заставацца шчасьлівай у самых складаных абставінах.

**Балет**
**9** (ндз), 11.30 — «Беласьнежка і сем гномаў» Б.Паўлоўскага.

**Тэатар беларускай драматургіі**
**8** (сб), **9** (ндз), 12.00 — «Воўк-мараплавец» С.Казлова.

## КІНААФІША

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Аляксандар»*** (прэм'ера): **7—9** (пт—ндз) 13.00, 16.30, 20.00.
«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці»: **7—9** (пт—ндз) 13.30, 17.20.
«Трое ў каноэ» (прэм'ера): **7—9** (пт—ндз) 15.30, 19.20, 21.10.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Аляксандар»*** (прэм'ера): **7** (пт) 13.30 (іл), 17.00 (іл), 20.20; **8, 9** (сб, ндз) 13.30, 17.00, 20.20.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Давайце патанцуем»: **7** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 17.00 (іл), 19.00, 21.00.
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Аляксандар»*** (прэм'ера): **7** (пт) 14.00, 17.10, 20.30; **8, 9** (сб, ндз) 14.00 (іл), 17.10, 20.30.
**«Масква»** (223-27-10)
«Аляксандар»*** (прэм'ера): **7** (пт) 14.00, 17.20, 20.30; **8, 9** (сб, ндз) 14.00 (іл), 17.20, 20.30.
**«Мір»** (284-37-71)
«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці»: **7—9** (пт—ндз) 12.00 (іл), 14.00, 16.00.
«Трое ў каноэ» (прэм'ера): **7—9** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.
«Чужы супраць Драпежніка»: **7—9** (пт—ндз) 18.20, 20.20.
**«Перамога»** (223-77-66)
«Трое ў каноэ» (прэм'ера): **7** (пт) 15.00, 17.00, 21.00; **8, 9** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 21.00.
«Давайце патанцуем»: **7—9** (пт—ндз) 19.00.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Белыя цыпачкі»: **7** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **7, 8** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Начны дазор»***: **7—9** (пт—ндз) 18.30, 21.00.
«Тэрмінал»: **7** (пт) 13.30, 15.50; **8, 9** (сб, ндз) 13.30 (іл), 15.50.
«Два браты»: **7—9** (пт—ндз) 11.00.

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## ЮНАМУ ГЛЕДАЧУ

**«Аўрора»**
«Прадвесьнікі буры»: **7—9** (пт—ндз) 11.00.
«Нязнайка і Барабас»: **7** (пт) 11.30.
«Аленяня Рудольф»: **8, 9** (сб, ндз) 11.30.
**«Берасьце»**
«Гарфілд»: **7—9** (пт—ндз) 11.30.
**«Дружба»**
«Гуляй, як Бэкхем»: **7** (пт) 10.30; **8** (сб) 11.00.
«Чатыры таксісты і сабака»: **7, 8** (пт, сб) 13.00; **9** (ндз) 11.00.
«У пошуках Нэма»: **9** (ндз) 13.00.
**«Мір»**
«Горад чарадзеяў»: **7—9** (пт—ндз) 13.00 (забаўляльная праграма).
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **7—9** (пт—ндз) 15.00.
**«Перамога»**
«Чароўны востраў»: **7—9** (пт—ндз) 11.00, 13.00.
**«Піянер»**
«Блізард»: **7** (пт) 12.30.
«Ледавіковы пэрыяд»: **7** (пт) 14.40; **8, 9** (сб, ндз) 13.00.
«Шрэк-2»: **7** (пт) 10.20; **8, 9** (сб, ндз) 11.00.





АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Зімовыя гульні

**Да 20 студзеня ў Нацыянальным мастацкім музэі праходзіць выстава тэматычных фотапартрэтаў, лялек і канцэптуальных прадметаў мастацтва «Зімовыя гульні». У экспазыцыі бяруць удзел: Алена і Мікалай Байрачныя, Ганна Балаш, Натальля Вараб'ёва, Юры Круш і Ларыса Шпілько.**

## КІНО Ў МЕНСКУ

# Вар'яты, п'яўкі і злыя акторы: толькі для дзетак

«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці» («Lemony Snicket's a Series of Unfortunate Events»)
ЗША, 2004, каляровы, 120 хв.
**Жанр:** Готыка-сэнтымэнтальная казка, прыгоды
**Адзнака:** 6,5 (з 10).


WWW.MOVIEWEB.COM

Калі меркаваць па інтанацыі (у арыгінале голас Джуда Лоў), то Лемані Сьнікет — гэта былы крымінальны рэпарцёр, які вырашыў перакваліфікавацца ў Чарльза Дыкенса й расказаць гледачам павучальна-кашмарную казку пра няшчасных сіротак Бадлераў.

Пачынаецца фільм пяшчотнымі кадрамі пра лясного эльфа. Потым лялечнаму эльфу адкруціць галаву ды ўставяць спружыну — і гледачы яшчэ будуць удзячныя за падобныя выкрунтасы. І на такой пяшчоце з мэханікай будуецца ўвесь фільм: дзетка забаўляецца з самай сьмяротнай зьмяюкай, немаўля на сваёй мове абзывае дарослых вар'ятамі (заслужана) і мае схільнасьць разгрызаць усе прадметы.

Пасьля пажару, які зьнішчыў іх дом, сіроты Ваялет і Кляўс ды кусьлівае Сонейка трапляюць да дзядзькі Олафа, які марыць атрымаць іхнюю спадчыну. Інфэрнальны Олаф у выкананьні Джыма Керы — гэта самазакаханы актор-бездар і надзвычай таленавіты ліхадзей з гратэскнымі жэстамі, які пойдзе на любыя паскудзтвы, у тым ліку і паспрабуе ажаніцца з Ваялет.

Атмасфэрка «Сямейкі Адамсаў» створана мастаком Рыкам Хейнрычам і апэратарам Эмануэлем Любецкі, якія працавалі раней зь Цімам Бёртанам, а найлепшая музыка — Томаса Ньюмана, аўтара мэлёдый да жыцьцесьцьвярджальнага сэрыялу «Кліент заўжды мёртвы». Нягледзячы на шматлікія папярэджаньні з экрану, аніводнае дзіця не пакінула глядзельнай залі, і, калі меркаваць па разяўленых ратах і аплядысмэнтах, дзеці фільм ацанілі.

**Андрэй Расінскі**

# Палітыка пад ялінкаю

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Дзяжурны сьпіч прэзыдэнта на адкрыцьці дзіцячых навагодніх сьвятаў чамусьці выклікаў шумнае рэха ў СМІ.

Некалькі разоў тэкст віншаваньня камэнтавалі як у афіцыйных, так і ў апазыцыйных мэдыях. Афіцыйныя ўбачылі тут глыбокую, нібы катлаван на пляцы Незалежнасьці, думку пра повязь пакаленьняў. Апазыцыйныя сьцябаліся, як віртуозна бацька прыцягнуў Новы год да тэмы незалежнасьці.

Чамусьці журналістам не прыйшло ў галаву правесьці інвэнтарызацыю пакету з прэзыдэнцкімі падарункамі на наяўнасьць апэльсінаў. Хіба гэта не барометр стаўленьня беларускай эліты да Юшчанкі?

Калі сур'ёзна, то ажыятаж вакол выхаду ППРБ пад ялінку правакуе на цікавыя роздумы.

Па-першае, прэзыдэнт становіцца фэнамэналягічнай асобай. Кожная яго сэнтэнцыя або жэст інтэрпрэтуюцца як элемэнт нейкага мэгапалітычнага праекту — павышэньня дабрабыту народу або кансалідацыі дэспатыі. Нават калі ён выпадкова прадэманструе фігу — аналітыкі будуць сьцьвярджаць, што гэта была ня проста канфігурацыя пальцаў, а геапалітычнае пасланьне — Маскве (калі вялікі палец паказваў на Ўсход) або Вашынгтону (калі вэктар быў заходні).

Але больш цікавы іншы тэзіс — ці не пертварыліся ялінка, Дзед Мароз і песенька «Ў лесе нарадзілася елачка» ў інструмэнты паліттэхналягаў? Без крыўляньня перад малалеткамі наўрад электарат цяпер будзе прымаць цябе за саліднага палітычнага перца.

Што сёньня павінен рабіць палітык, якога занесла на навагодні сабантуй? Зрабіць гіпэртрафаваную міну добрага чэла і пракампасьціраваць дзіцячыя вушы байкамі пра гномаў? Вы мне прабачце, але на сучаснай фазе сэксуальнай рэвалюцыі ўсё гэта больш цягне на артыкул КК «сэксуал харасмэнт».

Відавочна, што згаданая мадэль пазыцыянаваньня перад дзіцячай аўдыторыяй засталася ў мінулым. Недзе ў часах Дыкенса. Псыхалёгія кіндэраў у эпоху постмадэрнізму — своеасаблівы цынізм у дачыненьні да пэрсанажаў Шарля Пэро. Гэта прадэманстраваў трыюмф «Шрэка», нашпігаванага на радасьць дзятве такімі пэрламі, як «Лепш сьпераду, чым ззаду», «Яна вельмі проста жыве зь сямю мужыкамі», «Мёртвую дзеўку са стала». Сучаснаму дзіцяці гномы цікавыя, калі яны гомы або калі разам зь Беласьнежкай драпаюць на чорным «бумэры» ад братвы.

Сымбалічна, што напярэдадні новага году Галівуд разрадзіўся экранізацыяй раману Лемані Сьнікета «33 няшчасьці». Людзі ў карціне паміраюць, як мухі ад дыхляфосу, зло ў асобе графа-садыста Олафа (выкананьне Джыма Керы) не дае хэпі-энду ніводнага шанцу. І што цікава — дзецям уся гэтая чарнуха па кайфе.

Успомніце мае словы, гадоў праз дваццаць прэзыдэнт закончыць ялінкавы сьпіч гістарычнай цытатай зь Бівіса і Батхеда: «Эээ, тыпу, бакланы, з Новым годам, ну і ўсё такое».

**Лёлік Ушкін,**
**шалёны санкюлёт**




АРЦЁМ ЛЯВА

**Сьцяна кіеўскага галоўпаштамту. Лісты ў будучыню.**

Наталцы і Дзіму Бабіным. Віншуем з нараджэньнем сына. Шчасьлівага яму характару. Боскай і людзкой ласкі. Мэлянхохлік

**Запрашаем у падарожжа**

**16 студзеня** (нядзеля) па маршруце: Менск—Станькава—Рубяжэвічы —Дзераўная—Новы Сьвержань—Наднёман—Кухцічы—Узда—Менск. Квіток 18000 руб.

**22—23 студзеня** (субота—нядзеля): Вільня—Трокі—Меднікі. Квіток 30 эўра.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер) 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

**14 студзеня**
**калядная танцавальная вечарына**

## Стары Новы год З Алесем Ласём

Жывое гучаньне народных інструмэнтаў, гульні, сьпевы, скокі ва ўтульнай кавярні

Пачатак а 18-й

Кошт квітка: 4000 рублёў

Квіткі і даведкі праз тэл.: 262-02-90 (арганізатар)

Палац дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41)

Праезд трамваямі № 3, 4, 5, 10 да прыпынку «Палац моладзі»

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Зь вялізнай радасьцю** віншую Натальлю і Зьмітра, Палінку і Тамару Бабіных з нараджэньнем сыночка і брацікі!

**Maładych navukoŭcaŭ** vinšujem sa śviatami! Žadajem, kab navuka prynosiła chleb i da chleba! Paŭluk i Siamion

**Са сьвятамі ўсіх сваіх!** Няхай год наступны будзе салодкі, як цукровы пеўнік, багаты і бліскучы, як пеўнік залаты. Браты

**Віншую** ўсіх блізкіх, сяброў і знаёмых з Калядамі! Будзьма разам. Беларус з-пад Воршы

**Найлепшага ў сьвеце татку** Алеся Ложачніка віншую з Новым годам і Калядамі! Смоўж

**Анатоль Чачотка**, віншую Вас з Днём народзінаў. Зычу шчасьця, энэргіі, аптымізму, посьпехаў, даўгалецьця. Аляксей Шалахоўскі.

**Вольга Платонава**, віншую Вас з Днём народзінаў. Зычу цікавых вечарын, любові і шмат грошай. Аляксей Шалахоўскі

Рэдакцыя газэты «Наша Ніва» дзякуе Міхасю Баяроўскаму, Галіне Байкоўскай, Міколе Сеньку і С.Будкевічу за падтрымку.

### КАНТАКТЫ

**Abanenty Velcom**, naviedajcie novy biełaruskamouny WAP-sajt http://vkl.wab.ru

**Пазнаёмлюся** зь беларускім хлопцам. Т.: 274-73-75. Валянціна

### КНІГІ

**Куплю укр.-бел. слоўнік** В.Лемцюговай. Т.: 613-70-85. Алесь

**Аляксандар Ельскі**. Выбранае. 30-ты том «Беларускага кнігазбору». 496 с. Ужо ў продажы

**«Беларусы ў бітве за Монтэ-Касіна»**. Новая кніга сэрыі «Бібліятэка Бацькаўшчыны». Ужо ў продажы

**Набуду** 1, 4, 5 тамы збору твораў Уладзімера Караткевіча. Набуду відэакасэту «Акупацыя», аўдыёкасэты Эдуарда Акуліна «Мая Крывія», Зьмітра Вайцюшкевіча, Уладзімера Клімовіча «Адзінокая здань», гурту «Бяседа», гурту «Грамада» (2 альбомы), «Я нарадзіўся тут», «Крамбамбуля» (2 альбомы). Т. (Барань): 5-25-40

**Беларуская музыка** ў Слуцку. Вялікі выбар кампакт-дыскаў, касэт беларускай музыкі розных напрамкаў ды кірункаў на розныя густы ў павільёне №153 на Базарнай плошчы

**«Нацыяналізм у XX ст.»** Э.Сьміта, «Асновы дзяржаўнасьці Беларусі» М.Доўнар-Запольскага, «Курапаты» З.Пазьняка, іншыя кнігі можна атрымаць дарма (пры адной умове!) на сядзібе ТБМ. Тамсама вы знойдзеце «Arche», калядныя паштоўкі, аўдыё, відэа, CD, футболкі з нацыянальнай сымболікай, значкі. Румянцава, 13 (з панядзелка па пятніцу), 12.30—19.00. Т.: 8-029-707-40-01

**У Гомелі** можна набыць часопіс «Arche» №5/2001, №1—3/2002, №1—6/2003, №1—5/2004. Т.: 45-11-51

**Прадам кнігі**: Говард, «Сучасная культурная антрапалёгія»; Л.Геніюш, «Белы сон»; «Беларуская кераміка»; энцыклапэдыю «Беларусь у ВАВ» 1990 г.в.; творы У.Галубка, Я.Пушчы, В.Маракова ды інш. Т.: 8-029-753-70-05

### ПРАДАЮ

**Прадаю** кампутар Cyrix 200 MHz/128/4Gb/2Mb V/52x/FDD/USB/k/m — 70 у.а.; 14-цалевы манітор «IBM» — 30 у.а.. Т.: 8-029-553-97-34, 255-50-38

**Прадаю кватэру** 2-х пакаёвую па Арлоўскай — цэгла, 4-ты паверх, усё асобна (53, 34, 6, 3). 40 тыс. у.а. Т.: 233-49-13

### ПРАЦА

**Часопіс «Arche»** шукае адміністратара (распаўсюд і інш. Тэхнічныя пытаньні) на палову стаўкі. Патрабаваньні: мужчына (прыйдзецца насіць пакункі з часопісам), мянчук, здольны да арганізатарскае працы. Праца штодзённая ці амаль штодзённая. Зьвесткі пра сябе накіроўваць на электронны адрас arche@arche.org.by

**Высокакваліфікаваная настаўніца** нямецкай мовы шукае працу (рэпэтытарства ці іншае). Т.: 202-97-20. Раіса

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

### СПАЧУВАНЬНЕ

**ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»** выказвае глыбокае спачуваньне свайму калегу і сябру, галоўнаму рэдактару часопісу «Абажур» Уладзімеру Дзюбу ў сувязі зь цяжкай стратай — заўчаснай сьмерцю жонкі. Мы смуткуем разам з блізкімі Валянціны. Трымайцеся, сябры!

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Настасься Мацяш
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3500. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 21.00 5.01.2005.

Замова № 74.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а